№ 23 (573) 19 чэрвеня 2008 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі

## Дні Быкава

Успомнім яго разам.

Старонка 24



## Такая барацьба дэмаралізуе

З БНФ выключылі Алеся Міхалевіча на фоне чутак аб будучым альянсе партыі з «Хартыяй'97».

Старонка 4

## Шэдэўр масхалтуры

з удзелам унучкі Лукашэнкі. «На сьпіне ў чорнага ката».

Старонка 2

# Вілы ў бок

Над апошнімі свабоднымі газэтамі і інтэрнэтам навісла пагроза.

Толькі адзін дэпутат прагаласаваў супраць. За — 93. Экспэртаў Беларускай асацыяцыі журналістаў не дапусьцілі да ўдзелу ў дыскусіі. Палата прадстаўнікоў за паўгадзіны прыняла ў першым чытаньні Закон аб СМІ.

Пра Закон — старонка 3.

**Просім усіх да аднаго** чытачоў «НН» даслаць у Палату прадстаўнікоў лісты пратэсту супраць прыняцьця Закону пра СМІ. Вопыт мінулых гадоў і аналягічных рэжымаў кажа, што такія кампаніі маюць вялікі сэнс.

Пісаць можна ад рукі або выдрукоўваць з кампутара. Зьмест лістоў можа быць адвольны. Абы толькі яны былі паважныя. Важна, каб прагучаў ясны пратэст супраць прынцыповых момантаў закону. Таму ў кожным лісьце просім напісаць прыкладна наступнае:

«Пратэстуем супраць прыняцьця новага Закону пра СМІ ў выглядзе, у якім ён прайшоў першае чытаньне. Пратэстуем супраць цынічнага патрабаваньня перарэгістрацыі СМІ пасьля прыняцьця Закону і пры кожнай зьмене адрасу. Пратэстуем супраць увядзеньня рэгістрацыі інтэрнэт-парталаў. Пратэстуем супраць перадачы функцый кантролю за СМІ раённым пракурорам і Савету міністраў. Ня можа быць устойлівага разьвіцьця краіны без свабоды СМІ, свабоды крытыкі. Просім адклікаць Закон».

**Лісты кіруйце на адрас:**
220010, Менск, вул.Савецкая, 11, Палата прадстаўнікоў.




Фотарэпартаж Андрэя Лянкевіча. Старонка 12.

## У НУМАРЫ

### Разлажэньне

Юр'я Азаронка звольнілі зь Белтэлерадыёкампаніі зь вялікім скандалам. **Старонка 3.**

### Зноў на хвалі

Спрыяльныя ўмовы паставак расейскай сыравіны дазваляюць Беларусі перапрацоўваць рэкордныя аб'ёмы нафты. **Старонка 5.**

### Міліцыя — з народам

Міліцыя стала адной з самых апазыцыйна настроеных структур унутры рэжыму. Ліст у Рэдакцыю. **Старонка 7.**

### Брусэль у прастрацыі

Ірляндыя прагаласавалі супраць. Эўрасаюз застанецца без прэзыдэнта. **Старонка 6.**

### Ота, герой Грэцыі

Цікавосткі Эўра-2008. **Старонка 10.**

### Біл Гейтс пасяліўся ў Менску

Рэкордны даход атрымаў у 2007 г. жыхар Кастрычніцкага раёну сталіцы. **Старонка 5.**

### У ніякім разе, дарагія беларусцы!

З нагоды фэстывалю этнічных культураў у Горадні — фэльетон Сяргея Астраўца. **Старонка 7.**

## лІтаратурНы сшытак «НН»

*чэрвень 2008*

**Андрэй Лянкевіч.** Куст. Рэпартаж з палескай глушы ..... 12
**Тацяна Барысік.** Хроніка маладосьці. Апавяданьне ..... 14
**Якуб Лапатка.** Я пераклаў «Калевалу». Гутарка ..... 15
**Аляксандар Фядута.** Камэдыя Выраджэньня. Пінская шляхта ..... 16
**Марыйка Мартысевіч.** Сьвятыя патроны і вечныя дзевяностыя. Рэцэнзія на кнігу Сяргея Прылуцкага ..... 17
**Віталь Тарас.** Не «Аббай» адзінай. Прамэнад ..... 18
Паміж верай і фактам. Рэйтынг польскіх кніжных бэстсэлераў ..... 20
Паміж крыміналам і фантастыкай. Рэйтынг расейскіх кніжных бэстсэлераў ..... 21



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**У Менск з Мадрыду вярнулася наша баскетбольная зборная, якая перамагла зборную Бразыліі і заваявала пуцёўку ў Пэкін на Алімпіяду.**

# Шэдэўр масхалтуры

«На сьпіне ў чорнага ката» — самы глямурны ідэалягічны праект «Беларусьфільму». Піша **Андрэй Расінскі**.

Жывуць у вёсцы Карамелькі два хуліганістыя дзяды — Лёха і Саня. Аднойчы дзед Лёха пашкадаваў гандлярку, якая мокла пад дажджом, і набыў у яе лятарэйны білет. Білет быў выйгрышны. І цяпер дзед Лёха ў кампаніі зь дзедам Санем адпраўляецца ў Менск пад апекаю двух анёлаў, якія гэтую заварушку й зладзілі.

Камэдыя Івана Паўлава — самы ўдалы ідэалягічны праект «Беларусьфільму». Калі ў апошніх партызанскіх карцінах ідэалёгія вытыркалася, то ў «Чорным каце» нэасталінізм замаскаваны жартачкамі й глямурам.

Героі стужкі — зухаватыя вэтэраны, якія сьпяваюць пра трох танкістаў і клянуцца Сталіным (ваенныя прыпеўкі з радасьцю падхоплівае кіношная моладзь); чырвона-зялёныя сьцяжкі парасьпіханы сюд-туд; сапраўдная ідылія «моцнай і квітнеючай» Беларусі.

Нацбібліятэка, вакзал, гатэль «Эўропа» — усё аб'екты, пабудаваныя за Лукашэнкам, — зьнятыя шырокавугольнай оптыкай, каб здаваліся аб'ёмнейшымі і шыкоўнейшымі. Спажывецкі рай з казіно, дыскатэкамі; шчасьлівае «Ваша лята» (яшчэ адзін пачэсны ідэалягічна-камэрцыйны праект); белы лімузін, ікра.

«Зоркі» расейскай тэлепрасторы на раскрутцы: Філіп Кіркораў зьяўляецца ў ганаровым эпізодзе. Расейская сьпевака, папулярная ў колах 50-гадовых фанатак, запрасіла Адміністрацыя прэзыдэнта. Міхаіл Жыгалаў (бацька «Каці Пушкаровай») выступае ў ролі дзеда Лёхі.

І, нарэшце, галоўны сюрпрыз — Віка Лукашэнка, унучка кіраўніка дзяржавы, дачка Віктара Лукашэнкі. Яна ў ролі маленькай дзяўчынкі, ад імя якой і вядзецца апавяданьне. Дзяўчынка выцягвае ў кіношнага дзеда Лёхі кніжку Мапасана і дазваляе сабе жартачкі з рэфэрэндуму. (У вёсцы Карамелькі праходзіў рэфэрэндум пра мнагажэнства і скончыўся «баявой нічыёй».)

Масажысткі ў салёне, напаўголеная цётка на дыскатэцы — фільм пазначаны таўром пошласьці, хаця стужку й не параўнаць з грудастым трэшам «Паўлінка-New». Жарты далікатнейшыя: баявая каза Ізаўра, якая выкарыстоўваецца замест злой аўчаркі, вясковая пляткарка, гурт цымбалістаў на дачасных хаўтурах, «удава» дзеда Сані з пудовымі кулакамі. Рэжысёр удала выкарыстоўвае паскораныя здымкі і нечаканыя мантажныя стыкі. Гэта вяршыня творчасьці Івана Паўлава, гэта лепш, чым «Сьвежына з салютам».

> Дабро ад зла не адрозьніваецца — і тое, і другое ёсьць формай спажывецкага шчасьця.

Але жарты маскуюць пустату й масхалтуру.

Анёл пякельны і анёл нябесны вартыя адзін аднаго. Вера Палякова — «спакушальніца» — навязьліва-ўрачыста пазіруе. Ейны кампаньён мае такія ж самыя звычкі. Анёлы не дапамагаюць і не выпрабоўваюць, але зьдзяйсьняюць пэнсіянэрскія мары.

Дабро ад зла не адрозьніваецца — і тое, і другое ёсьць формай спажывецкага шчасьця.

Дзяды-героі паводзяць сябе як маладая шпана. На халяву выйгралі ў лятарэю, на халяву ўзялі ва-банк у казіно, на халяву бузілі ў гатэлі і пасьпешліва аддалі лішнія грошы хворай дзяўчыне. І навошта пакуты, канфлікты й выбар? Усё задарма.

Ёсьць зьдзяйсьненыне мараў, трызьненьне, цудоўная вёска Карамелькі, Беларусь пад апекаю і ахоўвай. У гэтай Беларусі сэрца й памяць належаць ганаровым 1930-м, старыя маюць усё, маладыя зайздросьцяць старасьці і бяруць яе за бадзёры прыклад, шчасьлівая вёска ахутаная туманамі й навальніцамі, а горад блішчыць багацьцем.

У гэтай Беларусі няма ніводнага беларускага слова, затое ёсьць гітаркі пад Шукшына, расейская «зорка» і амэрыканскі Том Соер. І ёсьць найгалоўнейшае — той, хто ўсё гэта стварыў. У канцы стужкі дзед Лёха цытуе клясыка, які схіляецца толькі перад адным Царом. Клясык меў на ўвазе Цара Нябеснага. Але, хто б сумняваўся, што дзед Лёха мае на ўвазе зусім іншага цара.

Карціна — першы лукашэнкаўскі фільм, прымальны для масавага спажытку. А нават калі б хто думаў іначай, усё адно ён яго прагледзіць. Пабачаць і салдаты, і школьнікі — адпаведныя структуры гэта забясьпечаць.

## СЬЦІСЛА

### Улады змагаюцца за каталіцкі электарат

На запрашэньне ўраду ў Беларусь прыбывае Дзяржсакратар Ватыкану кардынал Тарчызіё Бэртонэ. Чакаецца, што яго прыме А.Лукашэнка, плянуюцца сустрэчы зь міністрам замежных справаў Сяргеем Мартынавым, праваслаўным Мітрапалітам Філарэтам.

Візыт мае быць падкрэсьлена насычаны. Кардынал выступіць перад студэнтамі БДУ зь лекцыяй, пабывае ў Пінску й Горадні, дзе месьціцца сэмінарыі, у Глыбокім на Фэсьце хрысьціянскіх фільмаў.

22 чэрвеня ён адслужыць імшу ў сталічнай катэдры і ўскладзе вянок да манумэнта Перамогі.

Мяркуецца, што імша будзе трансьлявацца нацыянальным тэлебачаньнем — рэдкая зьява.

### Барадулін у «Кнігазборы» на сродкі чытачоў

43-й кнігай сэрыі «Беларускі кнігазбор» сталі выбраныя творы Рыгора Барадуліна. Адметнасьць выданьня ў тым, што паўтарытысячны наклад выдадзены на сродкі, ахвяраваныя чытачамі.

### «Польскае радыё» на хвалях «Аўтарадыё»

Шточацьвер а 17.00 на хвалі 105.1 FM можна будзе пачуць перадачу «Варшаўскі мост», падрыхтаваную «Польскім радыё». Разам з Валерам Саўкам з Польскага радыё ў студыі працуе Фаль Пуцёвы, журналіст менскай радыёстанцыі.

«Аўтарадыё» было заснаванае на пачатку 1990-х. Гэта, бадай, адзіная камэрцыйная радыёстанцыя ў Беларусі, якая аддае перавагу беларускай музыцы. Акрамя таго, частка перадачаў на «Аўтарадыё» гучыць па-беларуску.

### 2 100 рублёў за даляр да канца году

Паводле кіраўніка Нацбанку Пятра Пракаповіча, з пачатку году курс рубля да даляра ЗША умацаваўся амаль на 1% і на сёньня складае Br2128 за 1 даляр ЗША. Курс нацыянальнай валюты да расейскага рубля за гэты пэрыяд зьнізіўся на 2,6%, да эўра — на 3,4%. Такое зьніжэньне курсу стымулюе экспарт беларускай прадукцыі, бо Расея і краіны ЭС зьяўляюцца галоўнымі гандлёвымі партнёрамі нашай краіны. Нацбанк прагназуе, што да канца году курс рубля да даляра ЗША будзе ў межах Br2100 за 1 даляр ЗША.

**МБ**

## Навукоўцы вывелі мікробаў, якія ядуць сьмецьце і выдзяляюць паліва

У Крэмневай даліне (не ў беларускай, а ў Каліфорніі) у выніку генэтычных экспэрымэнтаў атрымалі бактэрыі, якія вырабляюць «экалягічную нафту».

Тое, што раней здалося навуковай фантастыкай, стала вынікам генэтычных экспэрымэнтаў прыватнай навуковай кампаніі LS9 з Крэмневай даліны ў ЗША. Генэтычна мадыфікаваныя мікробы харчуюцца адкідамі кшталту пілавіньня, а выдзяляюць сырую нафту.

Як цьвердзяць навукоўцы, іх «Нафта 2.0» будзе экалягічна чыстай і карыснай у вырашэньні праблемы вуглякіслага газу — бактэрыі паглынаюць з атмасфэры больш вугляроду, чым аддаецца падчас гарэньня паліва.

Гэтыя карысныя мікробы — аднаклеткавыя арганізмы, штам кішачнае палачкі, ДНК якой навукоўцы з LS9 адмысловым чынам мадыфікавалі. «Пяць—сем гадоў таму гэты працэс заняў бы месяцы і каштаваў бы сотні тысячаў даляраў, — кажуць навукоўцы, — а цяпер робіцца за некалькі тыдняў і каштуе $20 тыс.».

Паводле іх, карыстацца генэтычна мадыфікаванымі бактэрыямі для вытворчасьці нафты — тое самае, што гнаць эталавы сьпірт з дапамогай натуральных бактэрыяў. Пры гэтым этап ачысткі «нафты» спрошчаны, і атрыманае рэчыва амаль гатовае для заліўкі ў бак.

**Яраслаў Сьцешык; паводле The Times**

## АПЫТАНЬНЕ НА NN.BY

**Ці паедзеце Вы на прыроду на Купальле?**

| | |
|---|---|
| так | 57 (43.8%) |
| не | 39 (30.0%) |
| толькі ў парк | 34 (26.1%) |

Усяго прагаласавала: 130

**Шаноўныя людзі!**

«Наша Ніва» шукае распаўсюднікаў для продажу газэты на вуліцах і ў электрычках. Справа выгадная і надта патрэбная. Продаж ажыцьцяўляецца на аснове дамоваў.

Зьвяртацца праз т.:
(017) 284–73–29, (029) 260–78–32, (029) 618–54–84

# Вілы ў бок

Палата прадстаўнікоў 17 чэрвеня ў першым чытаньні прыняла Закон аб СМІ. На разгляд і прыняцьцё хапіла ўсяго паўгадзіны.

Толькі адзін дэпутат прагаласаваў супраць. За — 93. Прадстаўнікоў Беларускай асацыяцыі журналістаў не дапусьцілі для ўдзелу ў дыскусіі.

Законапраект прымаўся ў экспрэс-рэжыме. Яшчэ ў пачатку чэрвеня ніхто ня ведаў, што яго могуць уключыць у працу летняй сэсіі палаты. 28 траўня Беларуская асацыяцыя журналістаў (БАЖ) атрымала ліст ад намесьніка міністра інфармацыі Аляксандра Слабадчука, дзе гаварылася, што ніякіх праектаў адносна рэгулявання дзейнасьці інтэрнэту не распрацоўваецца. Ці то самі нічога ня ведалі, ці то наўмысьля ўводзілі ў зман. 12 чэрвеня кіраўніцтва БАЖ разаслала ўсім 110 дэпутатам лісты з просьбай не сьпяшацца з прыняцьцём закону, але, як бачым, было ўжо позна.

Паводле словаў намесьніка старшыні БАЖу Андрэя Бастунца, закон мае як станоўчыя, так і адмоўныя моманты. Першых, кажа ён, непараўнальна менш за другіх.

Да станоўчага можна аднесьці хіба толькі адмову ад узгадненьня на рэгістрацыю СМІ мясцовымі ўладамі. Часта ўжо на гэтай пачатковай стадыі выданьні сутыкаліся з адмовамі, якія пасьля нельга было абскардзіць у вышэйшых інстанцыях. Ну і яшчэ адзін напаўстаноўчы момант: друкаваныя СМІ могуць не рэгістраваць свае інтэрнэт-аналягі. Хаця з апошнім яшчэ шмат пытаньняў. Напрыклад, што рабіць, калі зьмест сеткавай старонкі не адпавядае папяроваму варыянту? Загадка, адказу на якую законапраект не дае.

Цяпер, як у тым анэкдоце, пяройдзем да кепскага. **Рэгістрацыя інтэрнэт-парталаў будзе абавязковай.** Што праўда, дэпутаты так і не змаглі прыйсьці да адзінага меркаваньня, як кантраляваць інтэрнэт, таму перакінулі гэтыя абавязкі на ўрад. Менавіта Савет міністраў павінен распрацаваць дакумэнт, які будзе рэгуляваць дзейнасьць беларускіх сайтаў.

**Цягам году пасьля прыняцьця Закону ўсе СМІ будуць вымушаныя прайсьці перарэгістрацыю.** Увогуле, перарэгістрацыю давядзецца праходзіць пры любых статутных зьменах, нават пры пераезьдзе рэдакцыі на іншы адрас. Дарэчы, цяпер, каб газэту ці часопіс не пазбавілі рэгістрацыі, трэба выходзіць мінімум раз на шэсьць месяцаў. Раней дазвалялася не выходзіць цягам году.

**Індывідуальныя прадпрымальнікі ня змогуць быць уладальнікамі рэдакцыяў**, толькі юрыдычныя асобы. Гэта ставіць пад пагрозу, напрыклад, існаваньне газэты «Борисовские новости».

Будзе спроба ўрэгуляваць замежную дапамогу выданьням. У беларускіх СМІ **ў статутным фондзе можа быць толькі 30% замежнага капіталу.** Дапамога ад замежнікаў, што не прапісаныя ў статуце, забараняецца.

Са словаў юрыста Юр'я Тапарашчава, калі раней быў вядомы пералік парушэньняў, то цяпер ён расьцягнуты амаль да бясконцасьці. Пісьмовае папярэджаньне можа быць вынесенае нават за няправільна ўказаны наклад. Яшчэ адна цікавостка — **папярэджаньні СМІ цяпер зможа выносіць любы раённы пракурор**, а ня толькі Міністэрства інфармацыі.

У законе ясна прапісана, што **журналісту замежнага СМІ забараняецца працаваць на тэрыторыі Беларусі без акрэдытацыі МЗС**. Але пакараньне ў выпадку парушэньня пакуль не прапісанае. Цікава, будуць штрафаваць ці ўсё ж садзіць, пакуль жартуюць журналісты замежных радыёстанцый. Распрацоўваецца таксама адзіны ўзор журналісцкага пасьведчаньня.

Пакуль няма пэўнасьці, як будуць змагацца з інтэрнэт-рэсурсамі, якія ня пройдуць рэгістрацыю. Тут можна толькі згадаць словы намесьніка міністра інфармацыі Ліліі Ананіч пра кітайскі досьвед, а таксама былога галоўнага ідэоляга Алега Праляскоўскага пра фільтраваньне сайтаў, якія не адпавядаюць «нормам грамадзкай маралі».

Старшыня БАЖу Жанна Літвіна кажа, што журналісцкую супольнасьць фактычна паставілі перад фактам. Што ў нядаўнім мінулым толькі адзін закон прымаўся настолькі імкліва — аб рэлігіі і свабодзе сумленьня. Ды яшчэ папраўкі Сухарэнкі. Цяпер і незалежнай мэдыйнай супольнасьці давядзецца прыстасоўвацца да новых рэалій.

**Зьміцер Панкавец**

Камэнтар Аляксандра Класкоўскага пра новы Закон аб СМІ — **старонка 7**.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Губэрнатар! Старшыня Гарадзенскага аблвыканкаму Уладзімер Саўчанка на літоўскім падворку ў часе фэстывалю этнічных культураў у горадзе над Нёманам.**

# Разлажэньне



Як высьвятляецца, Юр'я Азаронка **(на фота)** звольнілі з пасады намесьніка старшыні Белтэлерадыёкампаніі зь вялікім скандалам.

Паводле ўказу прэзыдэнта, падпісанага 13 чэрвеня, Азаронак звольнены «за ўчынак, несумяшчальны са знаходжаньнем на дзяржаўнай службе» (падпункт 1.9 п.1 арт.40 Закону «Аб дзяржаўнай службе ў РБ»).

Паводле радыё «Рацыя», гаворка ідзе аб непрыстойных паводзінах Азаронка ў часе выправы на «Эўрабачаньне» ў Бялград.

«Я ўспрыняў гэтую навіну дастаткова спакойна. Вызначуся найбліжэйшым часам з тым, дзе буду працаваць. Маю прафэсію рэжысёра ў мяне не забяруць. Я як быў чалавекам прэзыдэнта, так ім і застануся. І буду працаваць на карысьць дзяржаве», — заявіў учора сам Азаронак, адзін зь пiянэраў лукашэнкаўскае прапаганды.

**МБ**

## СЬЦІСЛА

### Літва прыраўняла савецкую сымболіку да нацысцкай

Забарона тычыцца свастыкі, савецкай пяціканцовай зоркі, а таксама гімнаў нацысцкай Нямеччыны, СССР і Літоўскай ССР. У законе адзначаецца, што сымболіка такога кшталту можа ўспрымацца як «прапаганда нацысцкага ці камуністычнага акупацыйнага рэжымаў». Раней аналягічны закон быў прыняты ў Эстоніі.

### Забараняюць рэкляму экстрасэнсаў і псыхолягаў

Палата прадстаўнікоў прыняла законапраект аб зьменах у некаторыя законы па пытаньнях рэкламы. Плянуецца ўвесьці абмежаваньні на рэкляму піва, прадугледжана поўная забарона рэкламы цыгарэт, а таксама паслуг гіпнатызёраў, экстрасэнсаў, варажбітак, астролягаў, і іншых асобаў, якія абвяшчаюць сябе здольнымі прадказваць, узьдзейнічаць на людзей шляхам выкарыстаньня звышпрыродных здольнасьцяў. Забараняецца і рэклама псыхалягічнай дапамогі, апрача выпадкаў, калі яна аказваецца дзяржаўнымі органамі. Забараняецца і рэклама сэксуальных паслуг, у тым ліку пад выглядам псыхалягічнай дапамогі, масажу, прыемнага баўленьня часу.

**МБ**

# Барацьба партыйных груповак як дэмаралізуючы фактар

З партыі БНФ выключылі Міхалевіча на фоне чутак аб будучым альянсе партыі з «Хартыяй'97».




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Алесю Міхалевічу закідалі і шчыльнае супрацоўніцтва з Рухам «За свабоду».**

14 чэрвеня Сойм БНФ прыняў рашэньне аб выключэньні са сваіх шэрагаў намесьніка старшыні партыі Алеся Міхалевіча. Пытаньне пра выключэньне паставілі старшыня камісіі ўнутрыпартыйнага кантролю Юры Хадыка і былы дыплямат Пётра Садоўскі. Афіцыйнай прычынай сталася крытычнае інтэрвію сайту gazetaby.com, у якім Алесь Міхалевіч рэзка прайшоўся па дзейнасьці кіраўніцтва партыі. У прыватнасьці, Міхалевіч заявіў: «Унутры БНФ ужываюцца праверавыя камуністычныя мэтады. Робіцца ўсё, каб праца чалавека ўнутры арганізацыі стала немагчымай».

Нагадаем, яшчэ ў лютым Сойм БНФ прыняў дакумэнт «За партыйную этыку і дысцыпліну». Сярод іншага, дакумэнт утрымлівае наступнае палажэньне: «Недапушчальнай лічыцца публічная крытыка якіх-кольвечы рашэньняў Зьезду, Сойму партыі, а таксама дзеяньняў і выказваньняў старшыні, намесьнікаў старшыні, сяброў Сойму партыі ў прысутнасьці сяброў іншых партый ці беспартыйных асоб або ў непартыйнай прэсе». Фактычна, тое інтэрвію і стала фармальнай прычынай выключэньня Міхалевіча з шэрагаў БНФ.

Старшыня партыі Лявон Баршчэўскі адразу пасьля публікацыі згаданага матэрыялу сказаў наступнае: «Я са свайго боку пастаўлю на наступным зьезьдзе пытаньне: альбо Міхалевіч, альбо я. Іншага выйсьця я ня бачу».

У часе галасаваньня за выключэньне А.Міхалевіча з партыі БНФ прагаласавалі 24 чалавекі, супраць — 19. Чатыры бюлетэні прызнаныя несапраўднымі. Адзін зь сяброў Сойму на знак пратэсту дэманстратыўна сапсаваў бюлетэнь і адмовіўся галасаваць.

Дадзенае рашэньне Сойму можа быць абскарджанае на наступным зьезьдзе БНФ, які пройдзе ў жніўні і будзе вылучаць кандыдатаў ад партыі на парлямэнцкія выбары. Дарэчы, і сам Баршчэўскі не выключае магчымасьці вяртаньня Міхалевіча ў партыю. «Калі Міхалевіч навучыцца працаваць у камандзе, рабіць унёсак у агульную справу, для яго дарога не закрытая», — сказаў старшыня БНФ у гутарцы з карэспандэнтам gazetaby.com.

Выключэньне з БНФ Алеся Міхалевіча стала чарговым этапам барацьбы ўнутрыпартыйных груповак і асобаў за ўплыў унутры апазыцыі. Тая барацьба выяўлялася напярэдадні леташняга зьезду. Тады на старшынскае крэсла прэтэндавалі тагачасны старшыня Вінцук Вячорка і ягоны намесьнік Алесь Міхалевіч.

Вячорка ў першую чаргу спадзяваўся на менскі актыў, партыйцаў старой загартоўкі, кшталту Алеся Бяляцкага, Вацлава Арэшкі ці Валянціны Сьвяцкай, а таксама «Моладзь БНФ», якая атрымала значную квоту. Стаўка Міхалевіча была зробленая на рэгіянальных актывістаў незадаволеных цэнтрам, а таксама на тых партыйцаў, якія былі блізкія да «Руху «За Свабоду».

Урэшце, ні Вячорка, ні Міхалевіч не змаглі набраць патрэбнай колькасьці галасоў. Фактычна, у тыя хвіліны Фронт быў на мяжы расколу. Нехта прапанаваў шукаць альтэрнатыўную кандыдатуру. Пасьля чаго і самавылучыўся Лявон Баршчэўскі. На хвалі агульнай эўфарыі, што БНФ атрымалася захаваць, абсалютная большасьць дэлегатаў згадзіліся на варыянт з Баршчэўскім.

Зрэшты, агульная задаволенасьць новым старшынём доўжылася літаральна дзесяць хвілін. Акурат да таго самага моманту, пакуль Баршчэўскі не прапанаваў у свае намесьнікі цалкам каманду Вінцука Вячоркі, дзе, натуральна, не было месца ні Міхалевічу, ні камусьці яшчэ зь ягонай каманды. Сам Міхалевіч ужо ведаў пра такое рашэньне, але пагадзіўся.

У выніку галасаваньня намесьніцкія партфэлі ўсё ж змаглі заваяваць Алесь Міхалевіч і Юрась Губарэвіч. Што выклікала бурную незадаволенасьць таго ж Баршчэўскага. Губарэвіч, дарэчы, апроч свайго намесьніцтва ў БНФ займае такую самую пасаду ў «Руху «За Свабоду» Мілінкевіча. З гэтай прычыны пытаньне аб выключэньні з БНФ Губарэвіча абмяркоўвалася яшчэ два месяцы назад, але да лягічнага канца гэтую працэдуру тады не давялі.

Новы ціток паддыванавай валтузьні супаў са зьяўленьнем чутак пра новую кандыдатуру на старшыню БНФ, а перадусім у імаверныя кандыдаты ад партыі на наступныя прэзыдэнцкія выбары. Гаворка пра каардынатара «Хартыі-97» і былога намесьніка міністра замежных справаў Андрэя Саньнікава. Часткова гэта чуткі пацьвярджаюць самі партыйцы.

Лявон Баршчэўскі толькі кажа, што «гаварыць пра новага кіраўніка арганізацыі пакуль нясвоечасова». «Адзінае, я ведаю тое, што Саньнікаў сапраўды ўзяў блянк для ўступленьня ў партыю. Але гэта ўсё моцна перабольшанае», — кажа Баршчэўскі.

Затое намесьнік старшыні Партыі БНФ Аляксей Янукевіч канкрэтызуе больш: «Адкуль зьявіліся чуткі, што Саньнікаў хоча стаць старшынём партыі, я ня ведаю. Гэта ўсё ж больш домыслы, чым рэальная пэрспэктыва. Што да вылучэньня Саньнікава кандыдатам у прэзыдэнты ад БНФ, то гэта досыць рэальна. Наколькі я ведаю, найбліжэйшым часам ён зьбіраецца ўступіць у БНФ і ўнесьці сваю кандыдатуру ў сьпіс вылучэнцаў на прэзыдэнцкія выбары. Як я лічу, чым больш кандыдатаў, тым лепш. Паглядзім, ці падтрымаюць Саньнікава нашы партыйцы».

Нагадаем, што раней пра жаданьне балятавацца ў прэзыдэнты ад партыі БНФ заявілі ўжо былы намесьнік старшыні Алесь Міхалевіч і прафэсар Юры Хадыка.

«Я беспартыйны чалавек, нікуды ўступаць не зьбіраюся. А плёткі камэнтаваць не хачу», — сказаў «НН» сп.Саньнікаў.

Наколькі нам стала вядома, сустрэчы між Баршчэўскім і Саньнікавым усё ж адбываліся. У любым выпадку ўсё гэта можа праясьніцца яшчэ летам, калі адбудзецца пазачарговы зьезд БНФ.

Што да самога Алеся Міхалевіча, то яшчэ раніцай у суботу палітык разглядаў імавернасьць выключэньня з БНФ як мінімальную і не драматызаваў сытуацыю.

Лявон Баршчэўскі адразу пракамэнтаваў сытуацыю на партыйным сайце: «На жаль, частка людзей не зразумела, што партыйная праца — гэта не гульня, што партыя — не кантора кліентаў, а арганізацыя, якая рэалізуе супольна вызначаныя палітычныя мэты. Сойму партыі БНФ давялося прыняць няпростае, але абсалютна неабходнае рашэньне».

А.Міхалевіч пакуль абмяжоўваецца крытыкай рашэньня Сойму: «Я асабіста ніякімі расколамі займацца не зьбіраюся, але не выключаю, што такія мэтады ў выніку да расколу могуць прывесьці. Я на сёньня пляную і думаю, чым зьбіраюся займацца і як сябе паводзіць далей. Ня маю ніякіх канкрэтных гатовых адказаў, але рашэньне будзе прынятае ў найбліжэйшы час».

Ці можа рашэньне Сойму азначаць чарговы раскол у БНФ? Наўрад ці. Хаця некалькі чалавек у прыватных размовах са мной заявілі пра гатоўнасьць сысьці з партыі ў знак салідарнасьці зь Міхалевічам. Ствараць новую партыю для Міхалевіча няма рэзону, бо апошнія гады Мін'юст упарта адмаўляецца рэгістраваць палітычныя партыі. Ды і ня факт, што людзей хопіць. Найхутчэй, што канфлікт зацягнецца да наступнага зьезду, які можа ануляваць рашэньне Сойму.

Якім бы ні быў вынік, барацьба за ўплывы ўнутры апазыцыі нікому яшчэ не дадала ані маральных, ані палітычных балаў.

**Зьміцер Панкавец**

## СЬЦІСЛА

### 1 ліпеня дактарам павялічваюць зарплату

Пра гэта паведаміў журналістам міністар аховы здароўя Васіль Жарко 13 чэрвеня на Дні мэдыцынскага работніка. Зарплата ў паліклініках вырасьце на 25%, у стацыянарах — на 10%. На сёньня беларускія дактары маюць найніжэйшыя ў Эўропе заробкі.

### Эрыксан прызначаны паслом Швэцыі ў Беларусі

12 чэрвеня швэдзкі ўрад прызначыў паслом у Беларусі Стэфана Эрыксана, які ад верасьня 2005 году ўзначальваў Аддзяленьне пасольства Швэцыі ў Менску. Адкрыцьцё пасольства заплянаванае на канец году, а абавязкі пасла Стэфан Эрыксан пачне выконваць ужо зь лета.

Стэфан Эрыксан нарадзіўся ў 1962 г. у Вэстэросе, недалёка ад Стакгольму. Скончыў Інстытут гандлю і эканомікі (1989). Працаваў зь місіямі ў Расеі, Бэльгіі. Цудоўна ведае беларускую мову. Сам перакладае на швэдзкую творы Васіля Быкава і Ўладзімера Арлова. Зьяўляецца пастаянным наведвальнікам культурных імпрэзаў і канцэртаў беларускіх рок-гуртоў.

Цяпер, калі зь Беларусі зьяжджаюць таксама беларускамоўныя дыпляматы славак Любамір Рэгак і пасол Ізраілю Зеев Бэн-Ар'е, страціць яшчэ і Эрыксана было б вельмі шкада. Але швэдзкі пасланьнік пайшоў на новы тэрмін сваёй дыпляматычнай працы ў Менску. З чым рэдакцыя яго і віншуе!

**Зьміцер Панкавец**

### «Беларусь ідэальна пасуе для інтэграцыі ў Эўрасаюз»

Як адзначае на старонках расейскай газэты «КоммерсантЪ» Фёдар Лук'янаў, галоўны рэдактар часопісу «Россия в глобальной политике», Беларусь застаецца апошняй з краінаў СНД, што ня вызначылася са сваімі геапалітычнымі прыхільнасьцямі.

На думку Лук'янава, абаронцам беларускага сувэрэнітэту застаецца Аляксандар Лукашэнка, якому незалежнасьць краіны дае неабходны ўзровень улады. Аднак доўга такое балянсаваньне паміж Усходам і Захадам цягнуцца ня можа. Бо Лукашэнка — гэта не Кадафі, а таму Эўропа аўтаматычна прымяняе да Беларусі, як да эўрапейскай краіны, базавы набор крытэраў, не прымяняльных да Лівіі.

Лук'янаў высока ацэньвае пэрспэктывы Беларусі: «Парадокс заключаецца ў тым, што калі і ёсьць на тэрыторыі былога СССР дзяржава, што ідэальна пасуе для інтэграцыі ў заходнія структуры, найперш у ЭС, то гэта Беларусь. Кампактная монаэтнічная краіны эўрапейскага памеру і культуры з адукаваным насельніцтвам».

**Сямён Печанко**

# Беларуская нафтаперапрацоўка зноў на хвалі

Спрыяльныя ўмовы паставак расейскай сыравіны дазваляюць Беларусі перапрацоўваць рэкордныя аб'ёмы нафты і стрымліваць цэны на паліва на ўнутраным рынку.

10 чэрвеня ў Беларусі ўпершыню ў гэтым годзе былі павышаныя раздробавыя цэны на бэнзін і дызэльнае паліва — у сярэднім на 5 і 15% адпаведна. Спэцыялісты канцэрну тлумачаць гэта ростам цаны на нафту і намерам «забясьпечыць прыцягальнасьць працы прадпрыемстваў на ўнутраным рынку Беларусі».

Нагадаем, што летась цэны на нафтапрадукты павышаліся чатыры разы, апошні раз — 10 сьнежня 2007 г. Тым часам спрыяльная каньюнктура на сусьветным рынку і ўмовы паставак расейскай нафты дазваляюць ураду Беларусі стрымліваць цэны на паліва на ўнутраным рынку.

Цягам мінулага году ўрад здолеў зацікавіць пастаўшчыкоў нафты і загрузіць магутнасьці беларускіх НПЗ. Дзякуючы гэтаму рэнтабэльнасьць айчыннай нафтаперапрацоўкі вырасла з 2,5% у 2007 г. да 10% сёлета. Паводле інфармацыі Міністэрства статыстыкі і аналізу, цягам студзеня—красавіка 2008 г. у Беларусь было завезена 7508,7 тыс. т нафты, што на 30,8% больш, чым за адпаведны пэрыяд мінулага году, імпарт нафтапрадуктаў склаў 550,0 тыс. т, што ў 2,5 разы больш у параўнаньні з аналягічным пэрыядам 2007 г.

Пры гэтым наша краіна экспартавала нафтапрадуктаў на 17,4% больш у параўнаньні з адпаведным пэрыядам 2007 г. — 5624,4 тыс. т. У краіны Захаду экспарт павялічыўся на 10,4% (5015,7 тыс. т), у краіны СНД — у 2,4 разы (608,7 тыс. т).

Апошняе падаражаньне паліва тлумачыцца шэрагам прычынаў. Перадусім цэны на ўнутраным рынку істотна адрозьніваюцца ад цэнаў у суседніх краінах, што непазьбежна вядзе да вывазу паліва за мяжу.

Варта адзначыць, што 80% цаны на паліва, што рэалізуецца на ўнутраным рынку, складае падатак, зь якога 50% — акцызны. Дзяржава мае прыбытак таксама ў выглядзе мыта на экспартны продаж нафтапрадуктаў.

Рост сусьветных цэнаў на нафту на руку ўраду Беларусі, мяркуе экспэрт Інстытуту прадпрымальніцтва і мэнэджмэнту Дзьмітры Крук. Чым яны вышэйшыя, тым больш ускосных датацыяў атрымлівае Беларусь, купляючы нафту ў Расеі. Паводле дадзеных агляду Амэрыканскай дзяржаўнай управы энэргетычнай інфармацыі, дадатковы прыбытак Беларусі ад продажу нафты і нафтапрадуктаў у выніку росту цэнаў складзе $315 млн сёлета і $260 млн у наступным годзе. Зважаючы на тое, што цана на нафту ўвесь час расьце, гэтыя лічбы могуць таксама павялічыцца.

**Сямён Печанко**

# Санаторны бум

Беларусам усё складаней застацца на адпачынак у Беларусі — попыт на пуцёўкі ў айчынныя санаторыі значна перавышае прапанову, паведаміў намесьнік дырэктара Рэспубліканскага цэнтру па аздараўленьні і санаторна-курортным лекаваньні насельніцтва Генадзь Балбатоўскі. Сярэдняя цана пуцёўкі складае на сёньня каля Br 800 тыс. Пуцёўка ў дзіцячы санаторый каштуе каля Br 720 тыс. Беларусы плацяць за адпачынак у залежнасьці ад памеру свайго заробку: так, пры даходах звыш Br 300 тыс. аплачваецца 15—20% ад кошту пуцёўкі, а грамадзяне, што маюць даход звыш Br 3 млн., выплачваюць 100% кошту. Такіх у мінулым годзе ў Беларусі адпачывала каля 120 тыс.чалавек.

У мінулым годзе доля замежнікаў, што адпачывалі ў беларускіх санаторыях склала 13,7% ад агульнай колькасьці — 51 тыс. чалавек. Сёлета гэтая лічба можа дасягнуць 15%.

У Беларусі дзейнічаюць 102 санаторыі і 81 аздараўленчая арганізацыя, што прайшлі дзяржаўную атэстацыю.

**СП, паводле«Экономической газеты»**

# Будзе збудаваная Бешанковіцкая ГЭС

Урад Беларусі вырашыў распачаць у наступным годзе пабудову вялікае гідраэлектрастанцыі на Дзьвіне. Магутнасьць будучай ГЭС павінная дасягнуць 124 МВт. Замоўцам праекту, які мусяць рэалізаваць у 2012 годзе, выступае РУП «Віцебскэнэрга». Усяго павінныя пабудаваць тры дамбы, два масты, шэраг іншых збудаваньняў, у тым ліку і шлюз, які дазволіць зрабіць кавалак Дзьвіны ад Віцебску да Полацку суднаходным нават для даволі вялікіх рачных караблёў, бо яго глыбіня павялічыцца ў сярэднім да 6—7 мэтраў.

Пляны наконт будаўніцтва на Дзьвіне — вышэй Віцебску, каля Бешанковічаў, Полацку і Верхнядзьвінску — каскаду ГЭС былі агучаныя некалькі гадоў таму. Адкрыцьцё Полацкай ГЭС магутнасьцю, па розных крыніцаў, ад 28 да 30,5 МВт чакалася ў гэтым годзе, але праца, якую ўжо вялі будаўнікі, зь нейкіх прычынаў была прыпыненая.

Каскад ГЭС зьменіць характар Дзьвіны: вада падымецца да ўзроўню берагоў, якія багата дзе нагадваюць каньёны, зьнікнуць шматлікія парогі, камяністыя выспы ды зробленыя на працягу стагоддзяў плятні.

**Паводле радыё «Рацыя»**


PHOTO.BYMEDIA.NET

**Выстава «Белагра-2008» у Менску.**

## СЬЦІСЛА

### Цэны бываюць розныя

За год прадукты ў Беларусі падаражэлі на 18,2% (па стане на красавік 2008 г. у параўнаньні з аналягічным пэрыядам 2007 г.). Калі мяса і птушка падаражэлі на 16%, то малако і малочныя прадукты — на 29%, макарона — на 25%, масла — на 29%, садавінагароднiна — на 50%, алей амаль у 2 разы. Варта адзначыць, што за той жа пэрыяд у Польшчы, паводле дадзеных Eurostat, цэны на прадукты вырасьлі на 6,7%, у Нямеччыне — на 6,3%. У той жа час у Літве цэны ўзрасьлі на 17,3%, у Латвіі — на 20,7%.

### За малдаўскімі вінамі — літоўскі сыр

Не ў пашахонскім, не ў кастрамскім вырабе падмаскоўных шарашак — у літоўскім сыры перавышаны ўзровень бактэрый! Россельгаснагляд увёў часовую забарону на ўвоз у Расею сыроў найбуйнейшага літоўскага вытворцы «Рокішка Сурыс».

Россельгаснагляд матывуе сваё рашэньне парушэньнямі літоўскім вытворцам расейскіх вэтэрынарна-санітарных нормаў.

Аналягічныя забароны на малдаўскія і грузінскія віны дагэтуль да канца ня зьнятыя. Улады гэтых краінаў назвалі тыя рашэньні палітычна матываванымі. Рашэньне па Літве здарылася празь некалькі тыдняў пасьля таго як гэтая краіна зьняла сваё вэта на перамовы ЭС-Расея, якое моцна раздражніла Расею.

Варта адзначыць, што літоўскія вытворцы сыру пацясьнілі на расейскім рынку беларусаў, якія там цяпер трэція. Першыя — украінскія сыравары.

### Тройка самых дарагіх гарадоў Беларусі

Узяўшы за аснову максымальныя і мінімальныя цэны ў траўні 2008 г. на мяса (ялавічыну і сьвініну), а таксама гародніну (сьвежую капусту, цыбулю, буракі і бульбу) інтэрнэт-газэта «Заўтра тваёй краіны» вызначыла тройку самых дарагіх і самых танных для пражываньня беларускіх гарадоў. У тройцы самых дарагіх апынуліся Менск, Бабруйск і Пінск. Да самых танных адносяцца Верхнядзьвінск, Клімавічы, Шчучын.

### Біл Гейтс пасяліўся ў Менску

Рэкордны даход — 2,7 млрд рублёў (1,27 млн даляраў) — атрымаў у 2007 г. жыхар Кастрычніцкага раёну Менску.

Такім чынам, сталічны мільянэр зарабіў на 1,7 млрд рублёў болей, чым лідэр мінулага году. Тады найбольшая сума складала 1 млрд рублёў. Такія зьвесткі прыводзіць Міністэрства падаткаў і збораў.

Сярод індывідуальных прадпрымальнікаў самы вялікі даход у 2007 г. зафіксаваны ў Першамайскім раёне — 15,3 млрд рублёў.

Найбольшую суму падаходнага падатку заплаціў за 2007 год сярод фізычных асобаў жыхар Партызанскага раёну — 203,2 млн рублёў (у 2006 год самы буйны падаходны склаў 126,6 млн), сярод індывідуальных прадпрымальнікаў — ІП Першамайскага раёну — Br54,7 млн (за 2006 год — адпаведна 13,7 млн рублёў)

**СП; паводле БелаПАН, «Экономическая газета», «Заўтра тваёй краіны», БЕЛТА**

# Брусэль у прастрацыі

## Прыхільнікі захаваньня нацыянальных сувэрэнітэтаў трыюмфуюць

53,4% ірляндцаў прагаласавалі супраць Лісабонскага трактату. Гэта азначае, што Эўрасаюз ня пойдзе да глыбейшай інтэграцыі, застанецца без адзінага прэзыдэнта і адзінай дыпляматычнай службы.




Ірляндцы адназначна прагаласавалі супраць ратыфікацыі Лісабонскага трактату.

«Гэта цяжкі ўдар», — заявіў міністар замежных справаў Нямеччыны Франц-Вальтэр Штайнмаер.

«Гэта перамога свабоды», — цешыцца прэзыдэнт Чэхіі Вацлаў Клаўс.

Густы ірляндзкі туман ахутаў пэрспэктывы глыбейшае эўраінтэграцыі пасьля таго, як сталі вядомыя вынікі рэфэрэндуму па Лісабонскім трактаце. Нягледзячы на тое, што тры найбуйнейшыя палітычныя партыі краіны кельтаў згуртаваліся ў падтрымку трактату, абсалютная большасьць ірляндцаў прагаласавала супраць. Кампанію супраць арганізаваў шэраг грамадзкіх арганізацый, бізнэсоўцаў і нацыяналістычная партыя «Шын Фэйн» («Мы самі»).

Буйны эўрапейскі бізнэс, а ўсьлед за ім палітычныя эліты лічаць, што Эўропе трэба дасягнуць яшчэ вышэйшай ступені інтэграцыі, каб стаць канкурэнтаздольнай у глябальным сьвеце. На іх думку, цяперашняя дэ-факта свабодна канфэдэрацыйная структура не дае магчымасьці праводзіць актыўную замежную і абаронную палітыку. Эўрасаюз — гэта эканамічны і маральны гігант, які ў пытаньнях бясьпекі застаецца карлікам, слабейшым за ЗША і нават Расею ці Кітай.

Большай ступені эўраінтэграцыі палітычныя эліты хацелі дасягнуць праз прыняцьцё Канстытуцыі Эўрасаюзу. Яна перадавала б большыя паўнамоцтвы цэнтру і рабіла б вялікі крок ад канфэдэрацыі да фэдэрацыі. Вялізны дакумэнт, на сотні старонак, распрацавала адмысловая камісія на чале з былым прэзыдэнтам Францыі Валеры Жыскар д'Эстэнам, яго з помпай прынялі... Але ўрэшце французы і галяндцы — дзьве нацыі эўраэнтузіястаў — яго адкінулі. У такіх эўраскептычных краінах, як Брытанія, справа нават не пасьпела дайсьці да галасаваньня.

Правілы ЭС такія, што для ўступленьня дакумэнту ў сілу яго мусяць прыняць усе дзяржавы-ўдзельніцы.

Выйсьце з тупіку прапанавала канцлерка Нямеччыны Ангела Мэркель. Канстытуцыю было вырашана замяніць Трактатам — кароткім, а галоўнае, які б можна было прыняць без рэфэрэндумаў.

Трактат прадугледжваў увядзеньне пасады прэзыдэнта ЭС. Яго мелі выбіраць кіраўнікі дзяржаваў. Ён таксама мяняў падзел месцаў у Эўрапарлямэнце, канкрэтызаваў структуру новага дыпляматычнага ведамства саюзу, уводзіў адзіную дыпляматычную службу.

Лісабонская дамова прадугледжвала таксама зьмяншэньне колькасьці камісараў у Эўракамісіі (урадзе ЭС). Цяпер у ёй па адным камісары ад кожнай краіны, і выканаўчы орган ЭС разросься ўжо да 27 чалавек, кожнаму зь якіх неабходна выдзяляць нейкую сфэру адказнасьці.

Трактат таксама адмяняў права вэта асобных краінаў у шэрагу галінаў палітыкі ЭС і ўзмацняў паўнамоцтвы прадстаўніка па агульнай замежнай палітыцы.

Новая канстытуцыйная дамова павінна была ўвайсьці ў сілу з 1 студзеня 2009 г.

Фактычна, гэта была спроба ня кіем, дык палкаю прапхнуць тыя самыя ідэі.

Дзіва што з усіх бакоў на творцаў трактату пасыпаліся абвінавачваньні ў недэмакратызьме. Аднак паколькі палітычныя эліты задуму падтрымлівалі, а мэйнстрымавыя СМІ з паглыбленьнем інтэграцыі салідарызуюцца, то трактат без большых спрэчак ратыфікавалі адна за адной краіны, у тым ліку такія ўважлівыя да пытаньня захаваньня сувэрэнітэту, як Польшча.

Толькі адна краіна, згодна з сваімі законамі, абавязаная была выставіць трактат на рэфэрэндум — Ірляндыя. Краіна, якая перажыла эканамічны цуд дзякуючы далучэньню да адзінага эўрапейскага рынку і мільярдным датацыям з агульнага кошыка. З найбяднейшай краіны Эўропы зялёны востраў ператварыўся ў найбагацейшую.

Ірляндцы галасуюць... Супраць! 862 415 галасоў супраць (53,4%) і толькі 752 451 за (46,6%). Прыхільнікі Лісабонскай дамовы аказаліся ў большасьці толькі ў некаторых выбарных акругах, збольшага ў сталіцы краіны Дубліне і яго ваколіцах.

Ірляндыя — адзіная з 27 краінаў — чальцоў ЭС, дзе для прыняцьця дамовы праводзіцца ўсенароднае галасаваньне. У краіне зарэгістравана крыху болей за 3 млн выбарцаў, тады як агульнае насельніцтва дваццаці сямі краінаў ЭС складае 490 млн чалавек.

Найбольшае непрыманьне людзей выклікае адчужэньне брусэльскае бюракратыі ад выбарцаў. Народы не выбіраюць органы ўлады ЭС. Іх прызначаюць нацыянальныя ўрады. Гэта стварае ўражаньне непадкантрольнасьці і ўзьнікненьня брусэльскае «рэчы ў сабе».

Фактычна, Эўропа ў сваёй інтэграцыі дайшла да пэўнага бар'еру, які няясна як адолець.

З аднаго боку, Эўрасаюз ня можа сабе дазволіць выбіраць супольнае кіраўніцтва так, як выбіраюць прэзыдэнта ЗША. Бо тады непазьбежна пачнуць дамінаваць групоўкі вялікіх краінаў, малыя пачнуць пачувацца ўкрыўджанымі, і Эўропа сутыкнецца з цэнтрабежнымі тэндэнцыямі і спакусай інтэграцыі сілай. Сытуацыі кшталту Грамадзянскай вайны ў ЗША, праз якую Штаты прайшлі, абы захаваць адзінства, цяжка сабе ўявіць на нашым кантынэнце.

З другога боку, выбарцы выразна адкідаюць такія формы інтэграцыі, пры якіх брусэльскае кіраўніцтва абіраецца праз складаныя бюракратычныя працэдуры, кулюарныя кампрамісы. Цяпер эўрачыноўнікі залежаць толькі ад вярхоўкі палітычных элітаў і падсправаздачныя толькі ім. Пакуль іхнай справай былі рэчы другарадныя, іх цярпелі як прыкрую неабходнасьць. Цяпер, калі ўстае пытаньне аб перадачы ім функцыяў дыпляматыі і бясьпекі, эўрапейцы яўна не гатовыя.

Што прапануюць палітычныя эліты цяпер? Паўзу на некалькі гадоў? Рознахуткасную інтэграцыю, як гэта ўжо было з адзінай валютай, на якую не перайшлі брытанцы, швэды, датчане? Чаргове рашэньне ў абыход волі народаў?

Калі не лічыць пэрсанажаў кшталту Лё Пэна, мала хто ў эўрапейскіх краінах аспрэчвае карысьці ад эўраінтэграцыі. Кантынэнт дасягнуў вялікіх эканамічных і сацыяльных посьпехаў, згладзіліся гаспадарчыя няроўнасьці між краінамі і рэгіёнамі. Людзі і капіталы могуць свабодна перамяшчацца.

Старшыня Эўракамісіі сп.Барозу ў пятніцу ж заявіў, што працэс ратыфікацыі трактату мусіць ісьці сваёй чарадой: «Працэс ратыфікацыі складаецца з 27-мі нацыянальных працэсаў. 18 краінаў ужо ўхвалілі трактат, і Эўрапейская Камісія лічыць, што працэс ратыфікацыі іншымі краінамі павінен працягвацца, не зважаючы на вынік галасаваньня ў Ірляндыі».

У супольнай заяве Ангела Мэркель і Нікаля Саркозі выказалі «павагу да дэмакратычнага рашэньня ірляндзкага народу, хоць мы і шкадуем пра яго», і таксама заклікалі іншыя краіны працягваць працэс ратыфікацыі. Гэта азначае, што Брусэль, Бэрлін і Парыж хацелі б, каб ірляндцы праз пэўны час паўтарылі спробу. Пагатоў, яны ў свой ужо мелі досьвед галасаваньня за Ніцкі трактат з другога разу.

Тым ня менш, вынікі галасаваньня ў Ірляндыі даюць натхненьне тым сілам у Эўропе, якія лічаць, што цяперашняе ступені інтэграцыі цалкам дастаткова.

Калі зьявіліся навіны пра вынікі рэфэрэндуму ў Ірляндыі, курс эўра адносна даляра ўпаў на біржавых таргах да найніжэйшага ўзроўню за апошні месяц — 1,53 даляра за эўра.

Большасьць назіральнікаў лічаць, што правал Лісабонскага трактату ўскладніць далучэньне да ЭС новых краінаў, сярод якіх Турцыя, Украіна і, патэнцыйна, Беларусь. ЭС па-ранейшаму цяжка будзе выбудоўваць сваю палітыку да Расеі і Азіі. Існуе і процілеглае бачаньне: у больш інтэграваным саюзе інтарэсы бізнэсу дамінавалі б над дэмакратычнымі прынцыпамі.

Польскі палітоляг Аляксандар Смоляр лічыць: «Перадусім трэба памятаць, што чым слабейшы Эўрасаюз, тым слабейшыя і пазыцыі Польшчы ў многіх пытаньнях, у тых самых стасунках з Расеяй». Тое самае, у прынцыпе, тычыцца і Беларусі.

**Мікола Бугай**

## СЬЦІСЛА

### Хто наганяе цэны нафты?

Міністры фінансаў краін Вялікай васьмёркі (G8) хочуць разабрацца ў прычынах рэзкага росту цэнаў на нафту. Палітыкі, якія сустрэліся ў японскім горадзе Асака, напісалі ў сваёй заяве, што да сьледзтва павінен далучыцца Міжнародны валютны фонд. Таксама міністры заклікалі да павелічэньня здабычы сыравіны.

### Айтматава пахавалі ў кіргіскіх Курапатах

14 чэрвеня ў Бішкеку разьвіталіся з Чынгізам Айтматавым. На плошчы, перад будынкам Філармоніі, сабралася шматтысячная чарга кіргізаў. Каля труны дзяжурылі сябры камісіі па арганізацыі пахаваньня на чале зь дзяржаўным сакратаром краіны Нур уулу Дасболам, віцэ-прэм'еры ўраду, міністры. Пасьля разьвітаньня перад будынкам адбылася грамадзянская паніхіда. На ёй выступіў прэзыдэнт краіны Курманбек Бакіеў. Пасьля гэтага жалобная працэсія пешкі прайшла праз цэнтар сталіцы да плошчы Ала-Тао перад Домам ураду. Там была абвешчаная хвіліна маўчаньня.

Пісьменьніка пахавалі ў музэйна-мэмарыяльным комплексе «Ата-Бейт», за 20 км на поўдзень ад Бішкеку. 15 гадоў таму тут знайшлі парэшткі 137 грамадзкіх дзеячаў Кіргізіі, расстраляных НКВД у 1930-я. Сярод іх быў і бацька Айтматава Тарэкул.

### У Малдове скасуюць штрафы для СМІ

Прэзыдэнт Малдовы Воронін прапануе зусім скасаваць штрафы за абразу гонару і годнасьці, пакінуўшы толькі — у выпадку судовага рашэньня — прынясеньне прабачэньняў. Нагадаем, е Беларусі журналісты незалежных СМІ неаднаразова падвяргаліся вялікім штрафам; некалькі чалавек былі асуджаныя на пазбаўленьне волі за абразу прэзыдэнта.

**МБ; паводле радыё «Свабода»**

# …А блогі ды камэнты адстрыгуць

Пра новы Закон аб СМІ піша **Аляксандар Класкоўскі.**

16 чэрвеня Натальля Пяткевіч спрабавала супакоіць публіку, пастаўленую на вушы маланкавым прыняцьцём новага Закону аб СМІ. На пасяджэньні профільнай камісіі палаты прадстаўнікоў намесьніца кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта заявіла: маўляў, рэгляментацыя (пакуль што!) закране толькі інтэрнэт-вэрсіі існых друкаваных ды электронных мэдыяў.

«Чаму інтэрнэт-вэрсія ня мусіць адпавядаць свайму аналягу, напрыклад, у друкаваным выглядзе?» — задала спн.Пяткевіч рытарычнае, як ёй, мусіць, падаецца, пытаньне.

Але ж дастаткова параўнаць папяровы тыднёвік «Наша Ніва» з сайтам nn.by, каб зразумець, што гэта неба і зямля. Час сайтаўлюстэркаў даўно прайшоў.

Зрэшты, шэраг дзяржаўных СМІ, стварыўшы свае інтэрнэт-вэрсіі пад прымусам ідэалягічнага начальства (каб не адставалі ад «нячэсных»!), сапраўды напаўняюць іх самым прымітыўным чынам: пасьля выхаду чарговага нумару закідаюць артыкулы ў сеціва. Сайты ж незалежных СМІ зазвычай болей дынамічныя, яны не дублююць друкаваны аналяг, а нашмат апярэджваюць яго. Зь іншага боку, ня ўсё з сайту трапляе на паперу: штосьці пасьпявае састарэць, немагчыма, дый ня варта, перадрукоўваць усе блогі, камэнты і г.д.

І гэта сусьветная тэндэнцыя, калі сайты пэрыёдыкаў ператвараюцца ў аўтаномныя праекты, непараўнальна болей апэратыўныя за папяровы варыянт таго ж брэнду і вельмі ад яго адрозныя. Яны напоўніцу выкарыстоўваюць фішкі сецiўнай журналістыкі: гіпэртэкст, мультымэдыйнасьць, блогерства і г.д.

І вось уявеце: новы Закон аб СМІ набывае



У такім пажарным парадку звычайна прымаюцца самыя рэакцыйныя навэлі.

сілу ды абрастае пастановамі Саўміну.

Па-першае, Рэдакцыі «НН» і шэрагу іншых незалежных выданьняў, хутчэй за ўсё, трэба будзе патраціць нямала часу ды нэрваў, каб зарэгістраваць сайт. Па-другое, рэгістрацыя можа стаць пасткай, калі пачнуць пабукваедзку патрабаваць каб інтэрнэт-вэрсія адпавядала «аналягу ў друкаваным выглядзе». Уявеце сабе сумны сайт, запоўнены выключна публікацыямі зь мінулых нумароў тыднёвіка. Усе фішкі онлайну — ад блогаў да гіпэрспасылак — фармальна можна кваліфікаваць як парушэньне ідэнтычнасьці: што за «адсябяціна», у тыднёвіку ж гэтага няма! На гэтай падставе лёгка забараніць тыя ж камэнты. Карацей, капец!

Я не кажу ўжо пра іншыя падводныя камяні праекту. Запэўніваньні, што ён цалкам адпавядае міжнародным нормам, выклікаюць у прафэсіяналаў толькі горкую ўсьмешку. Адзін драконаўскі парадак акрэдытацыі чаго варты! Юрысты БАЖ напісалі некалькі старонак прынцыповых крытычных заўваг. Але хто іх стане слухаць?

Калі чыноўнікі даюць руку на адсяканьне, што праект цывілізаваны, дык чаму б не аддаць на экспэртызу Эўропе? Але ад абмеркаваньня адсунулі ўбок нават айчынную мэдыйную супольнасьць. У такім пажарным парадку звычайна прымаюцца самыя рэакцыйныя навэлі. Дастаткова згадаць «папраўкі Сухарэнкі» перад выбарамі-2006.

# У ніякім разе, дарагія беларусцы!

З нагоды фэстывалю этнічных культураў у Горадні — фэльетон **Сяргея Астраўца.**

Адсьнявала сьвята у фальклёрных спадніцах у горадзе над Нёманам, што стаіць пад блакітным сьцягам з аленем сьвятога Губэрта. Чую праз фортку народную ацэнку, будаўнікі гавораць: «Папілі, б…, грошы прая… Вось і ўсё сьвята!» Ня выключана, што так і ёсьць насамрэч. Хаця афіцыйна гарэлку на сьвяце не прадавалі.

Але ня трэба чорна-белых фільмаў! Інтэрфэст у Горадні — дальбог улюбёнае сьвята. Я не выключэньне, люблю яго й усё, проста як жыхар, як гарадзенец. Усе афіцыйныя сьвяты звычайна пра вайну, пра нашу савецкую армію альбо пра савецкіх пагранцоў, пра дэсантнікаў і г.д. А тут карнавальная атмасфэра, якую любіў выдумляць калісьці ў сваіх кніжках пісьменнік Грын. А якія дзяўчоначкі крочылі сярод іншых нацменаў у калёне, дзяўчоначкі ў майках «БРСМ»! Хоць адразу на кастынг міс... міс чаго?.. Ды ўсё роўна: файныя дзяўчаты, няма словаў… Прыгажосьць узьнімае настрой. Няважна: хоць у мундзіры НКВД іх адзень, яны прыгожымі застануцца.

Разьбегліся гарадзенцы па працоўных месцах, а транспаранты над вуліцамі дагэтуль яшчэ паведамляюць зьвесткі з галіны нацыянальнага пытаньня. «Сям'я народаў Беларусі». Вой. «Все народы равны для родной нашей страны». Вой-вой. «Усіх сясьцёр і ўсіх братоў фэстываль прыняць гатоў». Каго-каго? Манашак і манахаў? Што там яшчэ ў нас? «Любимый Гродно для дружбы народной». Штосьці нагадвае Нязнайчыны рыфмы: «палку-сялёдку», напрыклад. А тут паэты напусьцілі ўвогуле туману: «Дом Беларусі, дом лагодны, усёй сям'ёю нам любіць»…

Што там у энцыкляпэдыях-канстытуцыях пішуць? Падазраю, што прыблізна: апроч саміх беларусаў, у Беларусі жывуць прадстаўнікі іншых… Прадстаўнікі, а не народы! Палестынцы, яны ў Палестыне жывуць, гэта — народ Палестыны! А паводле нашага начальства, палестынцы — адзін з народаў Беларусі. Адзін джыгіт ідзе ў



Асноўныя народы атрымаюць па вобласьці: беларусам — Менскую аддадуць, Гарадзенскую — літоўцам і гэтак далей: палякам, украінцам, расейцам.

кучомцы ў калёне сьвяточнай — гэта таксама народ, як і протчыя беларусцы. І пагоня за лічбамі давяла да таго, што з кожным сьвятам Беларусь пачынае насяляць усё больш народаў. Спачатку было менш за паўтара дзясяткі, на апошнім сьвяце, здаецца, 27 стала. Арабы — гэта народ РБ — нароўні зь беларусамі. Напісаў я і задумаўся, а гэта — таксама хіба марксізм? Бо ў беларускіх даведніках усё з пункту гледжаньня гэнага марксізму дагэтуль разглядаецца. Аўтары артыкулаў безь яго як без рук. Напішуць уступныя словы, а потым адразу — а вось з пункту гледжаньня марксізму!..

Такая народная гігантаманія на фоне нараканьняў, што Беларусь — куточак на карце, кавалачак зямлі, дзялка, на якой не разгарнуцца, дзіўна выглядае, спраўджае чуткі неймаверныя. Пагалоска пачала распаўсюджвацца, што ўлады хочуць сапраўды накшталт СССР: арабаў, напрыклад, у Пінскі раён, дзе цяплей, дзе вінаград. Габрэі дзе ў нас жылі — у Бірабіджане? У Брагінскі іх, і гэтак далей. Дапусьцім, гэта я прыблізна, будзе Кармянскі карэйскі раён, Добрускі — індускі. Асноўныя народы атрымаюць па вобласьці: беларусам — Менскую аддадуць, Гарадзенскую — літоўцам і гэтак далей: палякам, украінцам, расейцам. Сьвята ж павінна разьвівацца, не таптацца на месцы, не спыняцца на дасягнутых лічбах! У ніякім разе, дарагія беларусцы!

Але заўважаецца і пэўная палітычная блізарукасьць, таварышы, на гарадзенскім інтэрфэсьце. Дзе іранскі, дзе вэнэсуэльскі народы? Кітайцы, нарэшце, чаму адсутнічаюць дагэтуль? У нас у школах мову вывучаюць ужо іхнюю, кажуць, замест нейкай іншай нават. Хто там яшчэ нашыя любімыя браты і сёстры? Га?! Недаравальная палітычная хіба. Тым больш, з пункту гледжаньня марксізму-ленінізму…

## З ПОШТЫ РЭДАКЦЫІ

# Міліцыя — з народам

**Міліцыя стала адной з самых апазыцыйна настроеных структур унутры рэжыму.**

Пачну з таго, што сёньня, напрыклад, у сталіцы вялізны дэфіцыт міліцыянэраў. Настолькі велізарны, што, напрыклад, на чыгуначным вакзале службу ў якасьці старэйшых нарадаў ППС пачалі несьці начальнікі ЛПМаў (раней гэтую ролю выконвалі сяржанты і прапаршчыкі самога падразьдзяленьня). Недахоп людзей для кантролю за парадкам у менскім транспарце прыводзіць да таго, што ўжо ўвогуле не існуе дзённага суправаджэньня ў цягніках. У выходныя і ў перадсьвяточныя дні маршруты перакрываюцца спэцназам.

У гарадзкіх аддзелах становішча таксама не найлепшае. У цэлым можна сказаць так — кожнаму райаддзелу не хапае па роце патрульна-паставых. Людзі працуюць паводле сьціснутага графіку. Каб хоць неяк аддаваць выходныя, некаторыя маршруты проста здымаюцца або перакрываюцца Унутранымі войскамі.

І калі ў сталіцы карціну зь недахопам сьледчых, супрацоўнікаў ДАІ і АБЭЗу можна ў цяперашняй сытуацыі назваць цярпімай, то ў некаторых рэгіёнах усё выглядае зусім фатальна. Праз вялікую нагрузку і малыя заробкі туды ісьці працаваць ніхто ня хоча. Неўзабаве ня будзе каму наводзіць парадак на вёсцы.

Каб схаваць вялікі недахоп людзей (звальненьні і нежаданьне моладзі ісьці на службу), кіраўніцтва МУС проста абразае штат і афіцыйна называе гэта ўсё «плянавым скарачэньнем». Для шараговых супрацоўнікаў тлумачэньне такіх дзеяньняў адно — у нас застануцца тыя, хто сапраўды жадае працаваць.

Заробак супрацоўнікаў міліцыі — гэта міф. Так, у спэцпадразьдзяленьнях, як у Паўлічэнкі, заробкі сапраўды высокія. Але, напрыклад, звычайныя сяржанты і прапаршчыкі патрульнай службы маюць ад 650 да 850 тыс. (у залежнасьці ад выслугі і званьня), плюс прэміі ад 35 да 150 тыс. Афіцэры маюць ад 950 да 1050 тыс.

З году ў год расьце колькасьць скаргаў, пададзеных у суды былымі і дзейнымі супрацоўнікамі, на роднае ведамства. Але скаргі пішуць ужо даведзеныя да адчаю: зразумела, іх абвяшчаюць адшчапенцамі і выскачкамі. Галоўнае, на што робіць упор Навумаў, дык гэта на тое, што трэба цярпець, даўшы прысягу. Паралельна з гэтым адбываецца псыхалягічная апрацоўка міліцыянтаў, кшталту «калі вам не падабаецца, дык сыходзьце», і тут жа «куды вы больш пойдзеце — вы нікому не патрэбныя».

Там ня менш, міліцыя выконвае свае абавязкі: чысьціць нашы вуліцы ад злачынцаў, прыходзіць на дапамогу. У той жа час не адзін з актывістаў апазыцыі можа ўспомніць, калі быў затрыманы з улёткамі і раптам вызвалены, бяз слова. І трэба бачыць вочы тых праваахоўнікаў, якія прагавіта чытаюць талковыя сканфіскаваныя ўлёткі.

**Стэфан Янковіч, Менск**

**Іншыя лісты і водгукі — старонка 11.**

## ХРОНІКА АПАЗЫЦЫІ

**11 чэрвеня**

**Мазыр**

Мазырскага актывіста незарэгістраванага «Маладога фронту» **Паўла Наздру** выклікалі на 17-дзённыя вайсковыя зборы. Позву яму ўручыў пабач зь іхным домам чалавек у цывільным, які назваўся супрацоўнікам ваенкамату. Павал зьбіраўся ўдзельнічаць у парлямэнцкіх выбарах у якасьці назіральніка. На зборы накіроўць і яшчэ аднаго мазырскага моладзевага актывіста — **Міколу Жукоўскага.**

**12 чэрвеня**

**Менск**

Актывіст кампаніі «Эўрапейская Беларусь» **Аляксандар Атрошчанкаў** быў арыштаваны ва Ўпраўленьні КДБ па Менску і Менскай вобласьці. Яго выклікалі ў КДБ у рамках разьбіральніцтва па факце канфіскацыі мінулай восеньню аргтэхнікі і асабістых архіваў. У той жа дзень суд Цэнтральнага раёну Менску прысудзіў Атрошчанкаву 15 сутак адміністрацыйнага арышту за тое, што ён 22 красавіка падчас вынясеньня прысуду па «Справе чатырнаццацi» нібыта зьняважліва выказаўся на адрас судзьдзі **Алены Ільіной.**

**Полацак**

Судзьдзя Полацкага гарсуду **Натальля Дзеравянка** аштрафавала ўдзельнікаў несанкцыянаванага пікету. Нагадаем, 11 чэрвеня **Кацярына Салаўёва, Алесь Круткін, Сяржук Каралёнак, Мікола Дземідзенка** і **Дзяніс Хабераў** разгарнулі расьцяжку «Stop дыктатура» насупраць Полацкага выканкаму, за што былі затрыманыя і абвінавачаныя ў несанкцыянаваным пікетаваньні.

**Баранавічы**

У ноч з аўторка на сераду за расклейваньне партрэтаў палітзьняволенага **Андрэя Кіма** быў затрыманы лідэр баранавіцкай філіі незарэгістраванага «Маладога фронту» **Яраслаў Грышчэня.** На яго склалі пратакол паводле арт. 23.5 КаАП («Абраза супрацоўніка міліцыі»). Ноч Грышчэня правёў у ІЧУ. Пасьля суд пакараў яго штрафам 23 б.в.

**Нясьвіж**

Адміністрацыйная камісія Нясьвіскага райвыканкаму разгледзела два адміністрацыйныя пратаколы, складзеныя міліцыянтамі на мясцовую актывістку «Маладога фронту» **Насту Азарку** за расклейваньне налепак. Насту прызналі вінаватай паводле арт.21.14 КаАП ( «Парушэньне правілаў утрыманьня населеных пунктаў») і пакараСлі штрафам у памеры 25 б.в. па кожнай справе (агульная сума штрафу складае 1 млн 750 тыс. руб.).

**13 чэрвеня**

**Менск**

Старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі **Анатоль Лябедзька** атрымаў з суду Цэнтральнага раёну Менску паведамленьне пра пачатак працэдуры спагнаньня 2 242 770 руб. на карысьць УП «Горрэмаўтадор» Менгарвыканкаму. Такія страты нібыта панесла гэтая арганізацыя ў выніку «Эўрапейскага маршу», што быў у Менску ў красавіку 2007. У выпадку нявыплаты цягам тыдня судовыя выканаўцы абяцаюць сканфіскаваць маёмасьць палітыка. А.Лябедзька быў адным з заяўнікаў гэтай акцыі.

**СП**

# Ёшка Фішэр і немінучая катастрофа



Экс–міністар замежных справаў Нямеччыны Ёшка ў інтэрвію газэце Die Zeit прадказаў ЗША рэцэсію ды абвал усёй сыстэмы эканамічнага росту. Адзіным чалавекам, здольным вывесьці Амэрыку з крызісу, ён назваў Барака Абаму. Піша **Віталь Тарас**.

### Анарха-сындыкалізм і навуковы камунізм

Ёшка Фішэр — вядомы ня толькі ў Нямеччыне, але і ў сьвеце палітык зь незвычайнай біяграфіяй. У юнацтве ён узначальваў адну зь лявацкіх груповак у Франкфурце-на-Майне, жыў у студэнцкай камуне, некалькі разоў арыштоўваўся за сутычкі з паліцыяй. Сябраваў з славутым Даніэлем Кон-Бэндытам, адным зь лідэраў студэнцкай рэвалюцыі 1968 году ў Парыжы. Пазьней Фішэр уступіў у Партыю зялёных і стаў яе лідэрам. Шырокая вядомасьць прыйшла да яго, калі малады палітык упершыню заняў міністэрскі пост ва ўрадзе зямлі Гесэн. Ёшка прыйшоў тады на ўрадавае пасяджэньне ў джынсах і красоўках.

Ва ўрадзе канцлера Шродэра, калі Партыя зялёных увайшла ў кааліцыю з Сацыял-дэмакратычнай партыяй Нямеччыны, Фішэр быў, адпаведна, віцэ-канцлерам.

Ня скончыўшы афіцыйна ніводнай навучальнай установы, Фішэр займаўся самаадукацыяй. Ягоная бліскучая эрудыцыя прынесла палітыку папулярнасьць і павагу. Да нядаўняга часу ён чытаў лекцыі ў Прынстанскім унівэрсытэце. Да яго меркаваньня прыслухоўваюцца іншыя палітыкі і палітолягі.

Трэба адзначыць, што Ёшка Фішэр далёка ня першы з эўрапейскіх палітыкаў, хто прадказвае заняпад амэрыканскай эканамічнай сыстэмы. Нягледзячы на анарха-сындыкалісцкія погляды, якіх ён трымаўся ў маладыя гады, лідэр зялёных, відаць, ніколі не вывучаў усур’ёз марксізм. Інакш бы ведаў, што першым крах манапалізму ЗША прадказаў яшчэ Ленін у сваёй рабоце «Імпэрыялізм як найвышэйшая стадыя капіталізму». У савецкіх падручніках навуковага камунізму крах капіталізму быў зусім не гіпотэзай, а неабходнай умовай атрыманьня добрай адзнакі на экзамэне. Ну, а ЗША, вядома, заўсёды разглядалася як самая галоўная капіталістычная дзяржава.

Галоўным доказам загніваньня капіталізму, якое немінуча павінна было скончыцца ўсясьветнай сацыялістычнай рэвалюцыяй, служыў факт глябальнага крызісу перавытворчасьці 1929 г. і Вялікай эканамічнай дэпрэсіі, якая за ім надышла. З таго часу прайшло амаль 80 гадоў, але глябальны крызіс капіталізму так і не адбыўся. Праўда, крызісаў было безьліч — і фінанансавыя, і валютныя, і паліўна-энэргетычныя, і палітычныя. Ці ўзяць хоць бы цяперашні іпатэчны крызіс. І ніводны зь іх не завершыўся крахам эканамічнай сыстэмы ў цэлым.

Нельга не прыйсьці да высновы, што эканаімічныя крызісы, як і крызісы ў жыцьці любога жывога арганізму, ёсьць ня проста непазьбежнай, але неабходнай зьявай. Яны ёсьць спосабам існаваньня любой незамкнёнай сыстэмы. Стабільнасьць жа, як мы добра памятаем з гісторыі Савецкага Саюзу, можа скончыцца імгненным і незваротным каляпсам.

Дарэчы, гаворачы пра сапраўды цяжкі крызіс 1929 г., чамусьці рэдка згадваюць, што ўсяго праз дзесяць гадоў пры Рузвэльце, які абвясьціў Новы курс, ЗША зноў сталі самай эканамічна разьвітай дзяржавай у сьвеце. Дзякуючы амэрыканскай эканамічнай моцы сілам кааліцыі (у іх ліку СССР) і ўдалося выйграць вайну з гітлераўскай Нямеччынай.

### «Бутафорская» цывілізацыя

Крытыка амэрыканскага капіталізму на Захадзе — досыць звычайная рэч. Вось і Фішэр у сваім інтэрвію малюе змрочную карціну: «Аўтаканцэрны «Джэнэрал мотарз» і «Форд» балянсуюць на краі прорвы, курс даляра падае ўсё ніжэй, узровень беспрацоўя расьце. 40 мільёнаў амэрыканцаў ня маюць мэдычнай страхоўкі, сярэдняй клясе пагражае сацыяльная дэградацыя, інфраструктура развальваецца, сыстэма адукацыі патрабуе тэрміновых рэформаў…»

Фішэр, безумоўна, ведае, што эканоміка разьвіваецца цыклічна. Таму ён удакладняе, што, на ягоную думку, «цяперашні крызіс амэрыканскіх фінансавых рынкаў ня ёсьць праявай цыклічнасьці разьвіцьця». Уся мадэль эканамічнага росту ЗША, паводле Ёшкі Фішэра, «пагражае абрынуцца, азнаменаваўшы заканчэньне цэлай эпохі».

Між тым савецкія прапагандысты (а ўсьлед за імі і расейскія) ужо столькі разоў прадказвалі крах ЗША, а разам зь ім — усяе заходняй цывілізацыі, што ўспрымаць гэтыя прагнозы без усьмешкі немагчыма.

У словах Фішэра яўна адчуваецца ўплыў сацыялістычных ідэяў. На шчасьце, нямецкая філязофія дала сьвету ня толькі Маркса, а Аўстрыя была радзімай ня толькі Гітлера. Нараджэнец Аўстрыі Людвіг фон Мізэс даў бліскучую крытыку тэорыі сацыялізму. Ягоныя кнігі ніколі раней не вывучаліся ня толькі за саветамі, але і ў постсавецкіх краінах. Некалькі дзесяцігодзьдзяў таму Мізэс пісаў у кнізе «Тэорыя і



Эканаімічныя крызісы ёсьць спосабам існаваньня любой незамкнёнай сыстэмы. Стабільнасьць жа можа скончыцца імгненным і незваротным каляпсам.

гісторыя. Інтэрпрэтацыя сацыяльна-эканамічнай эвалюцыі», што сацыялістычная тэорыя роўнасьці, альбо эгалітарысцкая сыстэма «відавочна пярэчыць фактам, усталяваным гісторыяй і біялёгіяй. Толькі фанатычныя прыхільнікі гэтай тэорыі могуць сьцьвярджаць, што ўсё, што адрозьнівае генія ад дурня, цалкам зьяўляецца вынікам постнатальных уплываў. Меркаваньне, што цывілізацыя, прагрэс і ўдасканаленьне адбываюцца ў выніку дзеяньня нейкага містычнага фактару, — у марксісцкай філязофіі матэрыяльных вытворчых сілаў — які фармуе мысьленьне людзей такім чынам, што пэўныя ідэі нараджаліся ў іхных розумах адначасова, ёсьць недарэчнай выдумкай».

На думку Мізэса, дактрына, якая прыніжае сучасную заходнюю цывілізацыю як выключна матэрыялістычную, служыць сацыялістам «галоўным аргумэнтам, калі тыя спрабуюць паказаць амэрыканскі капіталізм у якасьці праклёну чалавецтва. Вымушаныя міжволі прызнаваць, што капіталізм высыпаў на людзей даброты, як з рогу, і што прадказаньні Маркса аб прагрэсуючым зьбядненьні масаў былі абвергнутыя з тэатральнай эфэктнасьцю, яны спрабуюць уратаваць свой паклёп на капіталізм, паказваючы сучасную цывілізацыю як выключна матэрыялістычную і бутафорскую.

Справа ў тым, што тыя, хто змагаецца з капіталізмам як сыстэмай, якая пярэчыць прынцыпам маралі і рэлігіі, некрытычна і легкадумна прызналі ўсе эканамічныя вучэньні сацыялістаў і камуністаў. Падобна марксістам, яны прыпісалі ўсё зло — эканамічныя крызісы, беспрацоўе, беднасьць, злачынствы — дзеяньню капіталізму, а ўсё станоўчае — высокі ўзровень жыцьця ў капіталістычных краінах, разьвіцьцё тэхналёгіяў, зьніжэньне сьмяротнасьці і г. д. — дзеяньням урадаў і прафсаюзаў».

### Загадка дэмакратаў

Ёшка Фішэр ускладае надзеі на будучы амэрыканскі ўрад. Дакладней, на адміністрацыю Барака Абамы, калі той пераможа на прэзыдэнцкіх выбарах увосень. Праўда, нямецкі палітык параўноўвае задачы будучай адміністрацыі з працай Сызыфа. Але ж, на думку Фішэра, дэмакрат Абама мае больш перавагаў, чым рэспубліканец Маккейн, які будзе працягваць цяперашні курс як ва ўнутранай гэтак і замежнай палітыцы. У кожным выпадку, лічыць Фішэр, будучы прэзыдэнт ЗША альбо пацерпіць поўны крах, альбо стане вялікім прэзыдэнтам. Магчыма, маецца на ўвазе — такім, як Франклін Рузвэльт?

Ёсьць, між тым, нейкая загадка ў гісторыі ЗША зь іх узаемадачыненьнямі з СССР, а таксама зь ягонай праваправаемніцай Расеяй. Кандыдаты ад Рэспубліканскай партыі, якіх савецкая прапаганда заўсёды паказвала як найбольш зацятых імпэрыялістаў, пасьля прыходу да ўлады лягчэй дамаўляліся з Масквой, чымся больш «ляяльныя» ёй дэмакраты.

І сапраўды. Хрушчоў наладзіў неблагія стасункі з рэспубліканцам Эйзэнхаўэрам і насьмерць пасварыўся з дэмакратам Кенэдзі. Рэспубліканец Ніксан падпісаў Дамову пра абмежаваньне стратэгічных узбраеньняў. Ягоны пераемнік Форд падараваў Брэжневу футра з ваўка. А вось пры дэмакраце Картэры зноў пачалася халодная вайна. Рэйган дамовіўся з Гарбачовым, а Буш-старэйшы стаў найлепшым сябрам Горбі, а потым і Ельцына. А Буш-малодшы пабачыў у вачах Пуціна «родную душу».

Некаторыя палітолягі тлумачаць гэта тым, што дэмакратам даводзіцца, нібыта, дэманстраваць сваю «крутасьць» і мужчынскі характар у палітыцы, асабліва замежнай, што адрозьнівае іх ад кансэрватыўных рэспубліканцаў, якія зьяўляюцца «крутымі» як бы паводле вызначэньня.

Цікава, што амаль такую самую лёгіку прадэманстраваў нядаўна лідэр лівійскай рэвалюцыі Муамар Кадафі. Ён заявіў, што нядаўняе выказваньне Абамы пра тое, што Ерусалім павінен заставацца сталіцай Ізраілю, прадыктаванае «падлеткавым комплексам» цёмнаскурага прэтэндэнта, які, нібыта, хоча спадабацца белым. І таму ён, маўляў, будзе яшчэ большым расістам, чым самі расісты. Гэтыя разважаньні пакінем на сумленьні лівійскага палкоўніка. Абаму, які бы ён ні быў прэзыдэнтам, напэўна давядзецца мець справу і з такімі суб’ектамі. Якую, насамрэч, ён будзе праводзіць міжнародную і ўнутраную палітыку, мы ня ведаем. У чым, аднак, не даводзіцца сумнявацца, нават ня будучы праракам, дык гэта ў тым, што заняпад Злучаных Штатаў Амэрыкі адбудзецца яшчэ ня хутка. Незалежна ад таго, хто будзе наступным прэзыдэнтам ЗША.

# AL Narrator Orchestra

The Tunes of Yestertimes, Каўчэг, 2008




Магло б стацца, што перасьпяваў бы ня ён, а яго.

Дыск душэўна выкананай клясыкі блюзу ад галоўнага блюзмэна Гомелю і ваколіцаў — Аляксандра Цыганка і кампаніі. Гэта той варыянт, калі можна, але ня хочацца сказаць — што лепей паслухаць у арыгінале. Музыкаў з «Нарэйтара» слухаць прыемна, у адрозьненьне ад дзясятку іншых пераймальнікаў Джонсана ды Хукера. Цыганок так палюбіў гэтую музыку, што яму скарылася тайна Дэльты. Магчыма, што і варта яму шкадаваць, што нарадзіўся ня ў той час і ня ў тым месцы — магло б стацца, што перасьпяваў бы ня ён, а яго. Яркае сьведчаньне — адзіная ўласная кампазыцыя на дыску — «Dice of Destiny», якая зусім не губляецца на тле «Буржуазнага блюзу» ці «61-й шашы». Іншая справа, што ўдалыя стылізацыі ды пранікнёнае выкананьне клясыкі мала якога слухача зьдзівяць. Але крануць сваёй шчырасьцю могуць кожнага.

# Аляксандар Патліс

Второе дыхание, West Records, 2008




Гэты «высакародны поп» не абуджае фантазіі.

«С чистого листа начнём сначала» — гэтак пяе былы вакаліст «Новага Ерусаліму» ў загалоўнай песьні сольнага дэбютніка. Немаведама чаму Аляксандар пакінуў гурт, але на яго творчасьці гэта зусім не адбілася. Тэматыка сьпеваў засталася ранейшай. Імідж выканаўцы ды падача матэрыялу — не зьмянілася ані. Уласна музыка хіба яшчэ болей пайшла ў кірунку ад поп-року да эстрады. Прынамсі, ранейшай аўдыторыі ён ня згубіць. Але слаба верыцца, што здабудзе новых прыхільнікаў. Мяркуючы з усяго, музыка ведае схему стварэньня ідэальнага хіта — дзе сэмплы скарыстаць, калі клявішы вывесьці на першы плян, а калі і драйву не зашкодзіць дадаць. Але зусім не выходзіць у яго песьні, якая б запомнілася хоць бы празь некалькі праслухоўваньняў дыску. Гэты «высакародны поп» папросту не абуджае фантазіі. «Второе дыхание» — прадукт прафэсійны і ў той жа час другасны, зроблены нібы па нейкім шаблёне. Музыка настолькі нэўтральная і рафінаваная, што яе цяжка нават фонам уявіць. Ня выйшла пачаць з чыстага аркуша ў Аляксандра.

# beZ bileta

Настоящая любовь, West Records, 2008




У саўндтрэк фільму пра наркаманаў!

Складанка пераробак і жывых варыянтаў ужо вядомых песень «безьбілетнікаў», выдадзеная наўздагон моцным і пасьпяховым CD і DVD-рэлізам. Відаць, з мэтаю посьпех падмацаваць і лішнюю капейчыну атрымаць:). У музычным сэнсе гэты дыск падаўся болей разнастайным і прывабным з музычнага гледзішча, чым уласна нумарныя альбомы каманды. Аранжыроўкі некаторых гітоў сталі болей лагоднымі і мякчэйшымі («Две лодки», «Никогда не умирай»), а недзе, наадварот, крыху гітарнага драйву дадалі («Место для тебя») ці яшчэ большага трагізму (тэлефонная вэрсія «Нарисована» — у саўндтрэк фільму пра наркаманаў!). Пэўна, што задумвалася гэтая ўся мяшанка дзеля галоўнай рэчы — каб выдаць кавэр на Wonderful life. І па праўдзе, «Странную жизнь» ня сорамна паказаць. Віталік не папсаваў арыгіналу ды яшчэ выканаў так, што хочацца паверыць нібы гэтая рэч — ягоная. Прыемнасьць пры канцы — некалькі вядомых твораў з жывога выступу. Рэдкі выпадак, калі live-version ад беларускага гурту можа парадаваць якасьцю выкананьня і запісу.

# Cherryvata

Город, West Records, 2008




Музыкі для танцпляцовак на гэтым дыску не сустрэнеш.

Набор уласна зробленых рэміксаў і пераробак на свае творы ад калегаў па сцэне — аснова дыску аднаго з самых заўважных беларускіх электронных праектаў. Музыкі для танцпляцовак на дыску не сустрэнеш, вядзецца пра ўдумлівую электроніку, якую не заўжды лёгка пературавіць. У кожным трэку ўглядаецца свой мэтад узьдзеяньня на слухача. У «Down Love» (ад Subvay) цісьне наўмысна навязьлівая манатоннасьць, у «Bird» наадварот — даецца воля для эмоцыяў, а кампазыцыя «Vesna» (якая ад Heinz Troy) — дык наогул занурае ў глыбіні падсьвядомасьці. Апошнія тры творы падаюцца самымі ўдалымі, асабліва «Bit Mountain», не пазбаўленая ўплыву Portishead. А вось рэміксы на кампазыцыі беларускіх поп-рокераў слухаюцца напружна: ці тое песьні ня тыя абраныя, ці тое падыход да іх няслушны. У выпадку з beZ bileta і J:Морс ня выйшла ані пераасэнсаваньня, ані сымбіёзу, кампазыцыя Атмараві наогул страціла прывабнасьць. Выснова: Cherryvata у той яе «ўласнай» частцы выглядае калі не сымпатычна, то вельмі абаяльна.

**Сяргей Будкін**



# Дыскарня «Наша Ніва»







## Андрэй Хадановіч «Абменьнік»

з музычным суправаджэньнем

**Дзьмітры Дзьмітрыеў** — рэжысура

## Джэці «Phantom Of The Literature»

**Вера «Джэці» Бурлак** — дэклямацыя

**Дзьмітры Дзьмітрыеў** — ідэя, рэжысура, падбор музычнага суправаджэньня, мантаж

**Ягор Маёрчык** — запіс

**Натальля Паваляева** — дызайн

ш у к а й ц е ў н е з а л е ж н ы х р а с п а ў с ю д н і к а ў

# Турэцкі гамбіт

Эўра–2008 пацíху дакацілася да чвэрцьфіналаў. Пакуль самы драматычны і напружаны матч першынства разыгралі між сабой туркі з чэхамі.

Яшчэ за 28 хвілін да фінальнага сьвістка чэхі ўпэўнена выйгравалі 2:0, але дзякуючы натхнёнай гульні Ніхата Кахведжы туркі ня толькі змаглі выраўняць лік, але і выйсьці наперад — 3:2.

Пра тое, што эмоцыі матчу зашкальвалі, сьведчыць хаця б выдаленьне брамніка турэцкай каманды на другой дадатковай хвіліне гульні. У Валкана Дэмірэля проста ня вытрымалі нэрвы, і ён ударыў чэскага двухмэтровага волата Яна Колера. Месца ў варотах давялося займаць паўабаронцу Тунджаю, бо ўсе замены былі ўжо праведзеныя, але, на шчасьце, да сканчэньня матчу заставалася няшмат часу. Турцыя паптарыла на Эўра сваё дасягненьне васьмігадовай даўніны, калі таксама трапіла ў чвэрцьфінал.

На прыкладзе зборнай Турцыі можна прасачыць, як каманда сярэдняй рукі становіцца адной з наймацнейшых у сьвеце.

Турэцкая фэдэрацыя футболу паўстала аж у 1923 г., пры Ататурку. А гуляць у футбол на тамтэйшых палёх пачалі яшчэ раней. Першы футбольны клюб быў заснаваны пры канцы XIX ст. у Ізьміры групай ангельцаў, пасьля чаго гульня дабралася і да Стамбулу. Што праўда, самім туркам у футбол гуляць пэўны час забаранялася, а спаборніцтвы ў асноўным праводзіліся між тамтэйшымі ангельцамі і грэкамі. Футбольная ліга ў краіне ўзьнікла ў 1903 г. Прыкладна ў той самы час футбольная ліхаманка пракацілася па Эўропе. Скажам, у 1910 г. у Гомелі быў заснаваны першы беларускі футбольны клюб.

На працягу наступнага паўстагодзьдзя пра турэцкі футбол нічога асаблівага чуваць не было. Адзінай успышкай актыўнасьці туркаў быў пачатак 1950-х. Каманда досыць анэкдатычным чынам трапіла на першынство 1954 г.: за выхад на чэмпіянат янычары змагаліся з гішпанцамі. Спачатку каманды абмяняліся перамогамі, а ў вырашальнай трэцяй гульні разышліся нічыёй. Лёс пары вырашала манэтка, кінутая судзьдзём матчу. Туркам пашанцавала. А чатырма гадамі раней туркі не змаглі паехаць на першынство ў Бразылію праз фінансавыя праблемы, хаця гульнёй і дамагліся гэтага.

Акурат у сярэдзіне 1950-х каманда Турцыі папрасілася з Азіяцкай футбольнай фэдэрацыі ва УЭФА. Зрабіўшы стаўку на эўрапейскі вэктар ва ўсім. Сапраўды, ад процістаяньня з Англіяй ці Гішпаніяй можна атрымаць куды болей карысьці, чым ганяючы мяч недзе ў Пэрсыдзкай затоцы.

Аж да 1990-х зборная лічылася эўрапейскім футбольным сярэднякам, а то і зусім аўтсайдэрам. Так ні разу і не патрапіўшы на топ-спаборніцтвы.

Цягам усяго часу сталеньня нацыянальнага чэмпіянату з камандамі працавалі замежныя спэцыялісты — ангельцы, немцы, італьянцы. Канечне, ня зоркі першай велічыні, але адпаведныя ўзроўнем хаця б нашаму Бэрнду Штанге. Трэніравалі да той пары, пакуль не ўзышла плеяда айчынных футбольных спэцыялістаў, якія змаглі годна заняць гэтыя месцы. Гульцы зборнай, каб далей прагрэсаваць, былі вымушаныя зьяжджаць у замежныя эўрапейскія клюбы. Доўгая і карпатлівая праца ўрэшце дала плён, пайшлі перамогі.

У 2000 г. турэцкі «Галатасарай» стаў уладальнікам Кубку УЭФА, а мясцовы чэмпіянат увайшоў у дзясятку наймацнейшых у Эўропе. Доўгі час за тамтэйшыя клюбы гуляў беларус Максім Рамашчанка, сёлета ён вярнуўся ў склад «Бурсаспору».

У 1995 г. туркі такі змаглі зламаць рэнамэ зборнай, якая ні на што не прэтэндуе. Каманда пад кіраўніцтвам сёньняшняга трэнэра Фаціха Тэрыма змагла трапіць на Чэмпіянат Эўропы ў Англію. Што праўда, там яны зорак зь неба не хапалі — тры пройгрышы і ніводнага забітага голу.

Але найбольшых вышыняў яны дасягнулі на сусьветным першынстве 2002 г. Тады надзвычай таленавітае пакаленьне турэцкіх футбалістаў пад кіраўніцтвам Шэнола Гюнэша заваявала бронзавыя мэдалі, перайграўшы ў чвэрцьфінале ўпарты Сэнэгал, а ў матчы за «бронзу» — гаспадыню спаборніцтваў Паўднёвую Карэю. У той пэрыяд каманду вёў за сабой харызматычны лідэр Хакан Шукюр, які забіў за нацыянальную каманду ажно 50 галоў. Для многіх узроставых гульцоў той чэмпіянат стаў лебядзінай песьняй. Затое якой!

Пасьля быў абсалютна неабавязковы пройгрыш латышам і пралёт міма мінулага Эўра. А цяпер — новы ўзьлёт.

Цяпер туркі, як ніколі блізкія да таго, каб паўтарыць посьпех шасьцігадовай даўніны. І гэта ўжо нікога не зьдзіўляе.

Дарэчы, зборную Турцыю ўзору 2008 г. мы маглі бачыць у Менску, на другі дзень пасьля Дня Волі. Марозным вечарам 26 сакавіка каманды Турцыі і Беларусі разыгралі баявую нічыю — 2:2. Прычым адыгрываліся менавіта нашчадкі янычараў.

А што да сёньняшняй першай зоркі турэцкай каманды Ніхата, то яго беларускія заўзятары маглі назіраць у Менску яшчэ ў кастрычніку, калі ў госьці да БАТЭ прыяжджаў яго «Вільярэал».

Здаецца, што туркі яшчэ не сказалі свайго апошняга слова на гэтым Эўра. Дачакаемся іхнага чвэрцьфіналу з харватамі.

**Зьміцер Панкавец**



# Ота, герой Грэцыі

«Чатыры гады таму ў Партугаліі адбыўся сапраўдны цуд. Такое здараецца прыблізна раз у 30 гадоў. Калі б гэта адбывалася штораз, мы б не называлі гэта цудам», — сказаў пасьля пройгрышу расейцам галоўны трэнэр грэкаў немец Ота Рэхагель.

4 ліпеня 2004 г. хлопцы Караля Ота, як называюць нямецкага спэцыяліста ў Грэцыі, зрабілі, здавалася б, немагчымае — выйгралі кантынэнтальнае першынство.

Усім падаваліся выпадковымі перамогі ў групавым турніры над партугальцамі і гішпанцамі. Толькі шчасьлівым зьбегам абставінаў была растлумачаная перамога ў чвэрцьфінале над французамі, а шанцаваньнем — у паўфінале над чэхамі. І толькі фінальны паядынак супраць гаспадароў турніру партугальцаў паказаў, што ўсё па справе.

Па вялікім рахунку, грэкі ў той вечар мелі толькі адзін стопрацэнтны момант, каб забіць. Яго на 57-й хвіліне гульні і рэалізаваў Ангелас Харыстэас. Партугальцы біліся да апошняга, але фантастычныя высілкі брамніка Нікапалідзіса зьвялі на не ўсе іхныя намаганьні. Для маленькай Грэцыі гэта было сапраўднае шчасьце.

Жалезабэтонная абарона грэкаў не давала супернікам ніводнага шанцу ўздыхнуць з палёгкай. Пры гэтым выдатна рэалізоўваючы свае рэдкія магчымасьці ў атацы. Рэхагелю ўдалося немагчымае, ён навучыў гарачых, але разьдзяўбаных грэцкіх хлопцаў абсалютнай самаахвярнасьці і самааддачы на полі. Ён зрабіў з грэкаў большых немцаў, чым была самая нямецкая зборная на тым чэмпіянаце.

Тагачасны трэнэр зборнай Беларусі Анатоль Байдачны назваў гульню грэкаў «антыфутболам». Байдачны казаў, што наша каманда ніколі так гуляць ня будзе. Зрэшты, дзе цяпер той Байдачны?

Гульня забываецца, а вынік застаецца. З таго часу стаўленьне да зборнай Грэцыі сталі зусім іншым. На сустрэчы зь ёй каманды настройваліся як на апошні бой. Каму ж не хацелася ўшчыкнуць чэмпіёнаў Эўропы? Зімой 2006-га беларусы на Кіпры прайгралі грэкам зь мінімальным лікам — 1:0.

Эліны ня трапілі на мінулы Чэмпіянат сьвету, але зноў прабіліся на кантынэнтальнае першынство. Тут ад іх зноў чакалі цудаў...

Спачатку грэкі ў Аўстрыі прайгралі 2:0 швэдам, а пасьля мінімальна расейцам. Такім чынам, яны пазбавіліся ўсіх шанцаў выйсьці нават з групы.

Для ўсіх загадка, што цяпер зробіць Кароль Ота? Застанецца зьдзяйсьняць з элінамі новыя подзьвігі ці знойдзе сабе іншую працу? Як бы ні было, Рэхагель ужо заслужыў сабе месца ў пантэоне найноўшых грэцкіх герояў.

**ЗП**



**Максім Рамашчанка, цяпер гулец турэцкага «Бурсаспору» (справа) і Вячаслаў Глеб радуюцца забітаму голу падчас таварыскай сустрэчы са зборнай Турцыі 26 сакавіка 2008.**

# Як зь фіналістамі Эўра гулялі беларусы?

Найгоршы баланс асабістых сустрэч маем з аўстрыйцамі і чэхамі, найлепшы — з палякамі.

У Аўстрыю і Швайцарыю з групы, дзе гулялі беларусы, выйшлі галяндцы і румыны. Цягам адборачнага турніру мы правялі з гэтымі зборнымі па два матчы.

Румынам двойчы саступілі. Прычым з аднолькавым лікам і ў Менску, і ў Бухарэсьце — 1:3. Менскі матч з нашчадкамі Ўлада Цепеша стаў першым афіцыйным для Бэрнда Штангe, таму той паразе асабліва не засмучаліся.

З галяндцамі, якія сёньня разглядаюцца найбольш рэальнымі кандыдатамі на перамогу, сыгралі больш удала. У Ротэрдаме быў разгром 0:3. Затое ў Менску разьжыліся заслужанай перамогай 2:1. Дзеля справядлівасьці адзначым, што тая гульня для галяндцаў абсалютна нічога ня значыла.

Сёлета беларусы пасьпелі правесьці дзьве таварыскія сустрэчы зь фіналістамі Эўра — туркамі і немцамі. Абедзьве скончыліся з прыстойным для нас лікам — 2:2.

Увогуле, сярод усіх фіналістаў Эўра найгоршы баланс асабістых сустрэч мы маем з аўстрыйцамі і чэхамі — прайгралі ім па чатыры матчы. Найлепшы з палякамі — дзьве перамогі і дзьве нічыі ў пяці сустрэчах.

Ніколі не сустракаліся нашы хлопцы толькі з Партугаліяй, Францыяй, Гішпаніяй і Харватыяй. Зрэшты, з апошняй давядзецца сустрэцца ўжо налета — трапілі ў адну адборачную групу да Чэмпіянату сьвету.

**ЗП**

## Чаму ў Люўры можна, а ў нашым Мастацкім — не?

**На мінулым тыдні я наведала наш Мастацкі музэй.**

Па-першае, замест аднаго, мне прыйшлося набыць два ўваходныя квіткі амаль па 5000 руб. Чаму? Касірка адказала, што ў музэі некалькі экспазыцый: Пікаса–Лежэ, Слуцкія паясы і г.д. Амаль столькі каштуе ўваходны квіток у Люўр . Але гэта проста непараўнальна.

Па-другое, у нашым Мастацкім музэі нельга фатаграфаваць. Чаму? А ў Люўры — можна.

У той маленькай залі, дзе разьмясьцілася экспазыцыя Пікаса–Лежэ, з наведнікаў была толькі я адна. Склалася ўражаньне, што ўся гэтая жанравая эстэтыка тутэйшым не патрэбная.

Дзеля сваёй прафэсійнай дзейнасьці апошнім часам бываю ў такой установе, як Канстытуцыйны суд, памяшканьні якога аздобленыя безгустоўнымі пано ўзроўню шапікаў у Ждановічах. Гэтыя два будынкі, музэй і Канстытуцыйны суд, знаходзяцца зусім побач, але такое адчуваньне, што чыноўнікі, ад якіх залежыць выгляд дзяржаўнай установы, вельмі далёкі і ад музэю, і ад эстэтыкі ўвогуле. На жаль, па такіх момантах судзяць і пра наш, беларускі, культурны ўзровень.

А гэтая экспазыцыя (Пікаса–Лежэ) зноў зьнікне ў запасьніках: гэта ж не спаборніцтвы начной хакейнай лігі.

**Iris, Менск**

## Ліст на тэлебачаньне

**Паважаная рэдакцыя Першага нацыянальнага каналу. Хачу вам шчыра падзякаваць за ваш праўдзівы фільм «Сеть».** Такія фільмы вельмі неабходныя беларускаму народу, асабліва моладзі і падлеткам. Я, малады настаўнік гісторыі, два гады назад скончыў унівэрсытэт і цяпер, па разьмеркаваньні, працую на вёсцы. Зарплата невялікая, жытло горш, чым у «абшчазе», пэрспэктывы цьмяныя. Таму я сур'ёзна пачаў задумвацца аб сваёй будучыні. Даўно ўжо хацеў прадаць Радзіму, але ня ведаў, колькі яна каштуе і каму можна прадаць. Аўтары фільму ўсё падрабязна расказалі: колькі можна атрымаць за продаж Радзімы, да каго трэба зьвяртацца. Былі дадзеныя канкрэтныя адрасы офісаў пакупнікоў ды і шмат іншых мэтадычных парад па продажы Радзімы. Вельмі каштоўная і значная інфармацыя. Адно дрэнна, чаму паважаныя спадары Карнілаў, Марчанка, спадарыня Нарачніцкая не паведамілі, за якія грошы яны самі прадалі Радзіму? Ці выгадней яе прадаваць у расейскіх рублях, і дзе ў Маскве знаходзіцца офіс пакупнікоў? Я згадзіўся б і на рублі, магу ўзяць нерухомасьцю, у найгоршым выпадку згодны і на ордэн. Як славяніну Расея мне бліжэй, і я згодзен прадаць Радзіму менавіта ёй, але зноў жа ня ведаю, за колькі і дзе.

Паважаная рэдакцыя, ад імя многіх жыхароў нашай стабільнай краіны прашу вас зьняць працяг фільму, дзе падрабязна раскрываюцца ўсе пастаўленыя мной пытаньні. Зь нецярпеньнем буду чакаць адказу.

**Здань**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

# ВОДГУКІ

## Апазыцыя павінна перагледзець мэты («НН» №22)

**Артыкул Яна Максімюка выклікаў гарачую дыскусію на сайце nn.by. Передрукоўваем яе кавалкі.**

***

Спадар Максімюк ня ведае сытуацыі ў краіне, таму што ён піша, што рэжым падарыў маладым бясплатную адукацыю, свабоду перамяшчэньня (у тым ліку магчымасьць замежных паездак) і прывабныя пэрспэктывы працягу прафэсійнай кар'еры. Так можа разважаць толькі чалавек, які жыве ў Празе, а не дзе-небудзь у Магілёве ці ў Мазыры.

**Алік**

***

Што рабіць? Ды працаваць. Няхай яны такія ўсе разумныя — і БНФ, і АГП, і Рух «За свабоду!» ды іншыя — не пачкуюцца ў новыя партыі, а выпрацоўваюць агульную стратэгію і тактыку працы зь людзьмі. Я не пра масты, тэлефон, тэлеграф. Напрыклад, пра тое, што цяпер робіць Мілінкевіч. Гаварыць, тлумачыць, распаўсюджваць падпольныя газэты. А хто ў рэгіёнах бачыў іншых з партыйных начальнікаў? Нядаўна Баршчэўскі казаў, што на папярэдніх выбарах БНФ працаваў на «чужога дзядзю». На якога чужога, калі гэты «дзядзя» быў абраны адзіным кандыдатам? Тая ж сытуацыя ў іншых партыях. У Мілінкевічу ўжо ўбачылі канкурэнта. Ды вы спачатку да ўлады дайдзіце, а потым будзеце гэтага канкурэнта крытыкаваць. Спадар Саньнікаў з Хартыі — проста дзіва. Тыдзень таму заклікаў да байкоту, а цяпер уступае ў БНФ. Прычым гэтая патаемная партыйная барацьба вядзецца на вачах ва ўсіх, а палітыкі думаюць, што мы нічога не разумеем.

**Сяргей**

***

Са слоў аўтара выглядае так, што большасьць маладых людзей падтрымлівае Лукашэнку, хоць гэта, безумоўна, ня так. Акурат цяпер праціўнікаў Лукашэнкі больш, чым калі-небудзь.

**Актывіст**

***

Якія выбары магчымыя пры сёньняшняй уладзе? Які парлямэнт?

**Мікалай Раманаў, Антвэрпэн**

***

Чаго вартыя ягоныя словы: «У астатніх адносінах культурнае і інтэлектуальнае жыцьцё Беларусі характарызуецца адноснай свабодай». Можа, спадару «адтуль» ня бачна, што творыцца з «апалітычнай» школай, з «апалітычнай» мовай, з «апалітычным» працаўладкаваньнем па кантрактах (у тым ліку і ў недзяржаўнай сфэры), з «апалітычным» дробным прадпрымальніцтвам? Ну проста разгул свабоды!

«Галоўнымі «падарункамі» рэжыму для маладых людзей зьяўляюцца бясплатная адукацыя, свабода перамяшчэньня...» — а тут, відаць, спадар зусім паленаваўся даведацца, што, каб студэнту выехаць за мяжу, патрэбны дазвол зь міністэрства. Проста так цяпер іх не выпускаюць. А таксама сьціпла прамаўчаў, што кошт шэнгенскай візы для беларусаў цяпер удвая вышэйшы, чым для ўкраінцаў і расейцаў.

«Мне здаецца, галоўнай перадумовай такога перагляду павінна стаць прызнаньне з боку апазыцыі, што Лукашэнка, пры ўсёй эксцэнтрычнасьці і дзікасьці яго палітычных манер і мовы, магчыма, усё ж закладае свайго роду падмурак, які перажыве яго праўленьне. Па сутнасьці, гэтым падмуркам зьяўляюцца палітычныя і эканамічныя інстытуты незалежнай дзяржавы», — а гэта дык зусім пэрлы! Па-першае, усе інстытуты Незалежнай Дзяржавы былі закладзены да яго. А ён зьнішчыў нацыянальныя сымбалі і беларускую мову, потым парлямэнт, незалежныя суды, незалежную прэсу. Потым стварыў г.зв. саюз з Расеяй і ізаляваў краіну ад Захаду. Сучасны рэжым і Беларуская незалежнасьць — гэта супрацьлеглыя паняцьці.

***

Азнаёмленасьць аўтара з рэаліямі РБ у пэўных момантах кульгае. Напрыклад, у тым, што асоба можа быць абрана ў мясцовыя саветы ці нацыянальны сход, калі паўстрымаецца ад крытыкі рэжыму, ня будзе «супрацьстаяць». Нічога падобнага.

Тое самае з моладзьдзю, якая атрымлівае адукацыю ў Польшчы. Такую моладзь ні на якія пасады не прызначаць, прычым «намэнклятурныя» бацькі пра гэта найлепш ведаюць. А таму ўладкоўвацца на працу гэтая моладзь будзе ў Маскве ці (хто спрытнейшы) на Захадзе.

Раю сп.Максімюку як аналітыку падрабязна вывучыць жорсткую «кадравую палітыку» ў падборы кадраў выканаўчай улады РБ з 1996 г. да нашых часоў, асабліва маладых, і тады ён сам усьвядоміць недарэчнасьць многіх сваіх тэзісаў і прапаноў у рэаліях РБ.

**Адлеглы**

***

Сп. Максімюк не прапануе ісьці на службу рэжыму або эміграваць. Ён проста зьвярнуў увагу на тое, што няможна жыць у палоне нейкіх абстрактных і адарваных ад жыцьця схемаў, а рэалістычна паглядзець на наяўную сытуацыю ў краіне. І з улікам гэтага будаваць сваю далейшую стратэгію і тактыку.

**Ales Jurkaviec**

***

Альтэрнатыва лукашызму, якая можа спрацаваць, — фармуляваньне, выяўленьне і абарона правоў заможных і актыўных грамадзян, уласнікаў. Правая альтэрнатыва, так бы мовіць. Левы папулізм ня пройдзе. Праблема з апазыцыяй, што яна як заведзеная спрабуе гуляць на лукашэнкаўскім папуліцкім полі.

**Руды Тамаш**

***

Спадар Ян, вы пералічылі толькі элемэнты мадэрнізацыі, прытым з удзелам замежнага капіталу. У Беларусі няма самага галоўнага: практычна не мяняецца форма ўласнасьці, няма прыватнай уласнасьці на зямлю, няма іншых сучасных рынкавых інстытутаў. Таму я застаюся са сваім ранейшым меркаваньнем: пры былой мадэлі фэадальнага аўтарытарызму (у палітыцы, эканоміцы, сацыяльных адносінах) буржуазная мадэрнізацыя немагчымая ў прынцыпе. Прыклад зь Лі Куан Ю не пасуе. Пачнём з таго, што ён пазыцыянаваў сябе як буржуазны лідэр. Ці Вы чулі што-небудзь падобнае ад Лукашэнкі? Ён практычна ўвесь прасякнуты камуністычнай артадаксіяй.

А вось прыклад барацьбы з карупцыяй пры Лі Куань Ю: «Карупцыя ёсьць адной з рысаў азіяцкага ладу жыцьця. Людзі адкрыта прымалі ўзнагароду, гэта было часткай іх жыцьця». Барацьба з карупцыяй пачалася «шляхам спрашчэньня працэдур прыняцьця рашэньняў і выдаленьня ўсякай двухсэнсоўнасьці ў законах праз укараненьне ясных і простых правіл, аж да скасаваньня дазволаў і ліцэнзаваньня». Былі рэзка паднятыя заробкі судзьдзяў, на іх пасады былі прыцягнутыя «найлепшыя прыватныя адвакаты». Заробак сынгапурскага судзьдзі дасягнуў некалькіх сотняў тысячаў даляраў за год (у 1990-я гг. — звыш $1 млн). Былі жорстка падаўленыя трыяды (мафіёзныя групоўкі). Дзяржслужбоўцам, якія займалі адказныя пасады, былі паднятыя заробкі да ўзроўню, характэрнага для топ-мэнэджэраў прыватных карпарацый. Быў створаны незалежны орган з мэтай барацьбы з карупцыяй у найвышэйшых эшалёнах улады (былі ініцыяваныя расьследаваньні нават супраць блізкіх сваякоў Лі Куан Ю).»

Ці ёсьць хоць што падобнае ў Беларусі?

«Лі Куан Ю ў сваіх успамінах падкрэсьліваў, што пастаянна насаджаў прынцып вяршэнства закону і роўнасьці ўсіх перад законам, улучна з найвышэйшымі чыноўнікамі і сваімі сваякамі. Заканадаўчая сыстэма краіны была ўспадкаваныя ад ангельскага каляніяльнага кіраваньня».

**Дзьмітры**

***

Беластоцкія беларусы, на мой пагляд, вызначаюцца нейкім рэгіянальным мэнталізмам. У іх дамінуе прыстасаванцтва. Каб выжыць любым коштам. Але практыка такая, што «беластоцкія прагматыкі» шчыльнымі натоўпамі палянізуюцца ды ўліваюцца ў польскую нацыю. Усе беластоцкія лічаць сябе прагматыкамі. Адсюль такое эсэ...

**Аналітык — не паралітык**

**Адказвае Ян Максімюк**

1) Разьвіваць ці абараняць свае тэзы ня буду, бо яны і так дастаткова «дыскусійныя», каб паслужыць як зыходны пункт для пераасэнсаваньня ролі апазыцыі ў сучаснай РБ. Я разумею, што калі б хтосьці з нутра беларускай апазыцыі або і з «пазапалітычных» экспэртаў зь Беларусі выступіў з такімі тэзісамі, то яго «задзяўблі» б свае за падыгрываньне А.Р.Л. А таму ўжо я, «гора-аналітык з-за бугра», узяў на сябе сьмеласьць крыху скаламуціць ваду, спадзеючыся, што мяне так лёгка ў ёй ня ўтопяць, балазе я ў Празе, а ня ў Менску.

Каб падліць крыху болей смалы ў агонь дыскусіі, раскажу пра адно адкрыцьцё і некалькі высноваў, якія зрабіў для сябе на беларускай канфэрэнцыі ў Варшаве, дзе я выступіў з гэтым дакладам. Тая канфэрэнцыя праходзіла ў прыватнай Вышэйшай школе права і гандлю. Студэнты плацяць у ёй за навуку (блізка $1500 за сэмэстар навучаньня ў польскай мове; $2500 за сэмэстар вывучэньня таго самага раўнабежна ў ангельскай мове). Мяне літаральна агламазьдзіла інфармацыя, што ў гэтай школе навучаюцца 63 студэнты зь Беларусі і што яны не атрымліваюць аніякіх стыпэндый, а плацяць па поўнай праграме, як і палякі. Гэта не студэнты з праграмы Каліноўскага, а «дзеці беларускай намэнклятуры». Іхнія бацькі маюць добрыя пасады ў Беларусі, у змозе плаціць за вучобу дзяцей у Польшчы, у змозе таксама, як думаю, забясьпечыць сваім нашчадкам добрыя пасады ў Беларусі, калі яны туды вернуцца з дыплёмам эўрапейскай вучэльні. Вось гэта і ёсьць пакаленьне маладых прагматыкаў, пра якое я згадваю ў сваім артыкуле. І яно прыйдзе на зьмену сёньняшнім лукашэнкаўцам. У яго будзе эўрапейская адукацыя і магчымасьць выкарыстаць гэта на практыцы — на карысьць Беларусі. Парадокс, канечне, у тым, што зрабіць гэта яны змогуць толькі тады, калі ня будуць супрацьстаяць сёньняшняму рэжыму.

На жаль, я ня ўпэўнены, што навучэнцы праграмы Каліноўскага масава — як тыя дзеці намэнклятуры — вернуцца ў Беларусь. На іх там не чакаюць добрыя пасады; іхнія веды пры цяперашнім рэжыме хутчэй прападуць марна. Ці я, можа, памыляюся? Кажучы яшчэ больш брутальна — сытуацыя склалася так, што пакаленьне сёньняшніх маладых апазыцыянэраў ня можа беларускаму грамадзтву нічога істотнага прапанаваць, акрамя самаахвяраваньня. А тыя, якія нічым фактычна не ахвяруюць, будуць ствараць будучыню Беларусі. Я гэта кажу з горыччу, каб было ясна, а не з задавальненьнем... Дык вось, для мяне сёньняшняя палітычная дылема маладога пакаленьня ў Беларусі — гэта ня выбар паміж байкотам выбараў і ўдзелам у іх, а выбар паміж магчымасьцю зрабіць нешта ў «апалітычнай» сфэры на карысьць Беларусі (якой бы яна ні была цягам наступнага дзесяцігодзьдзя), а немагчымасьць нічога паправіць актам палітычнага самаахвяраваньня. Я сэрцам і душою з тымі, хто ахвяруе сабою дзеля свабоды і будучыні, але настолькі цьвярозы розумам, каб разумець, што панамі будучыні будуць іншыя.

2) «Маладыя беларускія прагматыкі», на якіх мне расплюшчыліся вочы ў Варшаве, нарадзіліся ўсяго год ці два перад пахаваньнем Савецкага Саюзу. У іх ня можа ня быць іншага падыходу да рэчаіснасьці, чым у пакаленьня бацькоў, наскрозь савецкіх у адукацыі і сьветапоглядзе. Якая б ні была Беларусь у іхняй маладой памяці, гэта ўжо іхняя краіна. Для іх і Расея, і тым больш СССР — гэта не сваё. Прытым я ня бачу супярэчнасьці, каб працаваць на ўласную кішэню і Беларусь адначасова. Большасьць патрыётаў так і робіць, у любой краіне. Гэта саветы нас прызвычаілі да думкі, што чалавек можа сядзець у гулагу і з энтузіязмам працаваць дзеля славы і дабрабыту свае вялікае радзімы (напрыклад, канструяваць касьмічныя апараты).

Калі глядзець на беларускую эканоміку праз прызму такіх заводаў, як МАЗ ці МТЗ, дык фактычна цяжка заўважыць нейкую істотную мадэрнізацыю. Але калі глядзець шырэй, на прыватызацыю банкаўскай сыстэмы ці мабільнай сувязі, дык мадэрнізацыя адбываецца, хоць і марудна. Ніхто ня ўкладвае бабкі ў прадпрыемства, каб тэхалягічна яго здэградаваць, на злосьць беларусам. У гэтым сэнсе, калі Дзерыпаска цікавіцца МАЗам, дык я далёкі ад думкі, што ён хоча яго купіць для Мядзьведзева з Пуціным як *birthday present*, каб заслужыць іхнюю падзяку або ордэн Расейскай імпэрыі. Ён хоча ўкласьці бабкі, каб мець іх яшчэ болей. А болей — значыць, мадэрнізаваць і даваць лепшую прадукцыю.

3) Аўтарытарная мадэрнізацыя магчымая ў практыцы. Дзядзька, які называўся Лі Куан Ю, кіраваў Сынгапурам 30 гадоў як дыктатар і зрабіў з гэтай малой краіначкі эканамічнага тыгра. Я не хачу тут сьцьвярджаць, што Беларусь можа стацца такім эўрапейскім Сынгапурам за Лукашэнкам — на перашкодзе стане перш за ўсё рэкорднае спажываньне самагонкі на душу насельніцтва. Але нейкі варыянт «аўтарытарнай мадэрнізацыі» ўсё ж выключыць нельга.

4) Я прынцыпова не пагаджаюся, што Лукашэнка зьнішчыў інстытуты незалежнай дзяржавы. Цяжка сказаць, што ў 1991—1994 гг. Беларусь збудавала сапраўдныя інстытуты незалежнасьці. Узгадайце, як Пазьняк маліў камуністаў у 1991 г., каб яны ўсё-ткі прагаласавалі за незалежнасьць. Або як Кебіч спаборнічаў з Лукашэнкам у 1994-м, хто выгадней прадасьць сінявокую Расеі. Дык што — гэта былі інстытуты незалежнай дзяржавы (парлямэнт і ўрад)? Не сьмяшыце. Іншая справа, што Лукашэнка збудаваў гэтыя інстытуты ў карыкатурным выглядзе. Некаторыя кажуць, што паводле калгаснай мадэлі. Аднак як іх ні зваць — гэта інстытуты незалежнай дзяржавы, Яны не расейскія і ня польскія, а свае. Калі ад іх нос верне, дык гэта не таму, што яны не сапраўдныя...

5) У 1980-я я не лічыў польскі камуністычны ўрад «сваім». Мяне выклікалі на допыты ў службу бясьпекі за тое, што я арганізаваў Беларускае аб'яднаньне студэнтаў у Польшчы. У другой палове 1980-х я ледзь зьвязваў канец з канцом у Польшчы, каб накарміць сваю сям'ю. Аднак я ніколі і не падумаў, што Польшча ня мае сваіх сапраўдных дзяржаўных інстытутаў. Яны былі і дзейнічалі як сувэрэнныя дзяржаўныя інстытуты, і ўсе гэта разумелі, хоць гэтыя інстытуты былі крайне гідкія для большасьці грамадзянаў. І ў Польшчы таксама забівалі палітычных апанэнтаў (напрыклад, ксяндза Папялушку). Каб зьмяніць гэтыя інстытуты, не хапала адно скардзіцца і наракаць, трэба было іх зрынуць. Народная мудрасьць кажа, што кожны народ мае такую ўладу, якой заслугоўвае. Дык не сярдуйце на мяне, што я сьцьвярджаю, што Беларусь мае свае сапраўдныя, хоць карыкатурныя, дзяржаўныя інстытуты — а пастарайцеся зь сябрамі неяк іх зьмяніць... Гэтая дыскусія не аб тым, хто вінаваты за мінулае, а аб тым, што і як рабіць у будучыні, каб было крыху лепей.

# КАДРЫ



PILECKI.LIVEJOURNAL.COM

**На замкавым пляцы ў Варшаве наставілі мядзьведзяў. Яны аднолькавыя, толькі размаляваныя па?featureрознаму. Кожны сымбалізуе адну краіну. Размалёўвалі іх дзеці гэтых краінаў. На здымку беларускі. Каму ў галаву маглі прыйсьці такія надпісы, я магу толькі здагадвацца. І што там павінна азначаць слова «доўбень», таксама.**

# Куст

У вёсках Сташаны і Парэчча (Піншчына) на Сёмуху спраўлялі ўнікальную традыцыю «Ваджэньне куста». Куст — яшчэ дахрысьціянскае сьвята, зьвязанае з ушанаваньнем роду і продкаў. Абрад захаваўся на Палесьсі, і больш нідзе. Фотарэпартаж **Андрэя Лянкевіча**.




Куст, «водыты Куста», «ходыты у Куста» — архаічны абрад, распаўсюджаны на Пінскім Палесьсі. Сьвяткуецца ён на першы ці другі дзень Сёмухі (Тройцы).

Во як апісваў Куст «Виленский вестник» за 1866: «У Пінскім павеце на другі дзень Тройцы зьбіраюцца дзяўчаты з усёй вёскі, выбіраюць самую прыгожую і маладую і надзяваюць на яе ўбраньне, сплеценае з маладых бярозавых і кляновых галінак зь лісьцем. Прыбраная атрымлівае назву «куст». Дзяўчаты становяцца парамі: старэйшыя уперадзе, пасьля — маладзейшыя, а нарэшце — дзеці, і ў такім парадку, з «кустом» уперадзе, ідуць на панскі двор ці да знаёмых. Сьвята выключна дзявоцкае — рэдка бяруць у ім удзел замужнія жанчыны ці маладзіцы. У такім разе яны займаюць месца ў першым радзе за «кустом». Мужчыны ж зусім не бяруць удзелу…»

І вось гэтае «бабскае войска» хадзіла па дварах і сьпявала гаспадарам песьні, абавязкова просячы ў іх надарыць «куст»: «Вынэсь Кусту хоч по золотому», «Да просымо пана хоч на чэрвыкы».

Гаспадары выносілі «кусту» грошы ці пачастунак. А ўвечары ў карчме ці ў нечай хаце ладзілася застольле з танцамі, дзе моладзь пасьпяхова «ліквідавала» ўсё









сабранае.

Некаторыя дасьледчыкі лічаць, што абрад мае аграрнае і сямейна-любоўнае прызначэньне. «Песьні насілі велічальна-абрадавы характар і былі закліканыя спрыяць ураджаю, хуткаму і памыснаму выхаду замуж дачок гаспадара (гаспадыні), якім адрасаваліся «кустава» песьні», — піша Арсень Ліс (БНТ: Земляробчы каляндар, Менск, 2003).

Ёсьць і іншая думка. Этноляг Вольга Шарая (дарэчы, родам зь Піншчыны) лічыць, што Куст непасрэдна зьвязаны з ушанаваньнем продкаў на траецкія Дзяды (якраз напярэдадні «Куста») і агулам з патрыярхальна-родавай супольнасьцю. «У моўнай сыстэме Заходняга Палесься для абазначэньня расьліны наагул адсутнічае лексэма «куст». Для куста ў значэньні «расьліна» існуе іншая лексэма — корч, корчы.

А лексэма «куст» выкарыстоўвалася і для абазначэньня роду, сям'і. Сапраўды, калі ўяўляць «куст» як шмат адгалінаваньняў з аднаго зерня (кораня), дык такія асацыяцыі няцяжка зразумець».

То рытуальны Куст — сымбаль роду, сувязны між жывымі і памерлымі, сьцьвярджае дасьледчыца: «Кусту характэрна такая форма рытуальных паводзін, як пасіўнасьць, маўклівасьць. Як азначаюць інфарматары, галоўны пэрсанаж «нэ спывав: Кусту не положэно спываты»… Ён поўнасьцю пакрыты зялёнымі галінкамі («Куст закрыты, нэчого нэ выдно»)… Для сэмантыкі абраду характэрным зьяўляецца матыў «гасьцяваньня Куста ў бацькі»… («Куст пойдэ до батэнька ў госты»). Праз абрад у старажытнасьці адбывалася злучэньне дзьвюх частак роду — пакаленьняў, якія жывуць, і тых, што памерлі. Зварот да продкаў, сымбалічныя дары павінны забясьпечыць жыццядзейнасьць роду».

**Тэкст паводле http://community.livejournal.com/by_ethno**

# Ня ўсё ў жыцьці апошні раз

**Вялікі дзякуй!**

**К.В., Сьцяпану Д.** з Гомелю.
**Алене С.** зь Віцебску.
**Юр'ю Ш.** зь Менскага раёну.
**Алесю Б.** з Маладэчанскага раёну.
**Галіне Б., Раману М., Аляксандру Ф., Сяргею В., Тацяне К., Аксане З., Зіне В., Аляксандру Б., Тацяне Д., Арсеню Л., Д.І., Л.К., Ганьне С., Васілю К., Сьвятлане Ш., Крысьціне П., Аркадзю С., С.У., Уладзімеру К., Юр'ю Д., І.П., Т.У., С.Ц.** зь Менску.

Дзякуй за спрыяньне **Сыльвэстру Будкевічу** з Ковэнтры (Вялікая Брытанія).

**Каб штотыдзень атрымліваць газэту,**

дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 8 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Менск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перапказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: **3012 206 280 014** | Асабовы рахунак:

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: **3012 206 280 014** | Асабовы рахунак:

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

КВІТАНЦЫЯ

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір М.П.

# Хроніка маладосьці

Тацяна Барысік. Апавяданьне.

— Дзевяць гáдзін на Беларусі, — як заўжды зьнянацку гаўкнула радыё.

Рука зьнямела, у сьпіну дзьмула, мабыць, коўдра спаўзла. Галава нібы цэбар зрабілася, у роце смажыла. Сьцяпан Маліноўскі — п'яніца са стажам, жыхар спальнага мікраранёну, пэнсіянэр і вэтэран вытворчасьці ў адной асобе, зь цяжкасьцю прачынаўся на роднай канапе. Раніца надыходзіла другі раз запар. Першы раз Сьцяпан пралупіўся яшчэ а шостай. Гэта памятае добра. Памятае, як хадзілі з хлопцамі па віно і ўзялі чатыры бутэлькі. Памятае — дзьве выпілі ў двары, дзьве прыхаваў дома. А вось дзе прыхаваў — ня памятае — хоць забі! Мо ў шафе, а мо і ў кішэні паліто… Крый божа жонка, ідучы на працу, згледзела, тады пішы прапала. Дармаеды! Толькі й глядзяць, каб абабраць, а так нікому на старасьці гадоў не патрэбны. Жонка цэлы дзень у канторы сраку праседжвае, і ў хаце не пераробіцца. Сын зусім дома не стыкаецца, жыве зь нейкай, у яе кватэра і дзіцёнак, толькі па грошы й прыходзіць. Дачка наадварот — дзень тырчыць дома, кабыла такая, усё на бацькавым карку, а клопату й увагі не дачакаесься. Вось і цяпер — вада ў ваньне цурчыць, зноў нешта яна там мые! Не каб падысьці ды папытаць: «Ну, як ты, тата, ці ня трэба чаго?»

Ад горкіх думак у Сьцяпана ажно левы бок засьвярбеў. Павярнуўся, пачухаўся — штосьці брахнула. З-пад канапы выкацілася пляшка віна «Купалінка», з папарэць-кветкай на этыкетцы.

— Надзейная схова! — узрадаваўся дзядзька, адшукаў у кішэнях рэшткі закускі — паўгурка і разлезлы пячэнік, адкаркаваў зубамі «Купалінку».

У гэты момант цурчаньне вады сьціхла, з ваннай высунулася дачка — Марынка — колішняя выдатніца бібліятэчнага тэхнікуму, пасьля перадавічка ў шапіку, а цяперака проста беспрацоўная.

Угледзеўшы чарговую бацькаву пахмелку, аскетычны сьняданак, яна толькі й прамовіла з дакорам: «Ізноў?» Казаць нешта яшчэ было бессэнсоўна — пераканалася неаднойчы. Таму Марынка проста набрала вады ў таз, кінула туды джынсы, парашок разьвяла, націснула кнопку магнітафону, каб весялей было.

І тут здарыўся цуд! Экспрэсіўная ўсходняя мэлёдыя літаральна ўварвалася, выбухнула, скаланула ўсю прастору двухпакаёўкі. Гучны мужчынскі голас засьпяваў ці то па-арабску, ці то па-турэцку. І чулася ў гэтым сьпеве незвычайная радасьць жыцьця, неспатоленая прага каханьня і іншыя экзатычныя рэчы.

— Марынка, чаго гэты чачэн так крычыць? — прастагнаў бацька з канапы.

Дачка, занятая шараваньнем джынсаў, зачараваная музыкаю, нават не зрэагавала. А калі б нават і зьвярнула ўвагу на запыт-стогн, наўрад ці змагла б нешта растлумачыць.

Сучасная турэцкая дыскатэка — пазначана на вокладцы назаўжды пазычанага ў кагосьці дыску.

«Малайцы туркі», — зазначыла Марына, весяляцца дык весяляцца, а смуткуюць — аж мароз па скуры.

А ў нас? На вясельлі пяюць: «Напрасна дзявіцу згубілі…» На хаўтурах гавораць пра памідорную расаду, калярадзкіх жукоў і куды чый сын паступаць будзе.

— Марынка, Марынка! — перарваў роздум бацька. Зноў высунулася з ваннай. Так і ёсьць — адвечная песьня: напіўся, выцягнуў фотаальбом. Мазгі кампасьціраваць будзе. Чорт яго бяры, джынсы ўжо памыла, адно прапаласнуць засталося. Можна трохі адпачыць.

— Марынка! Ідзі паглядзі, — не пакідаў у спакоі бацька.

— Гэта твая баба Маруся, а гэта я і сястра Кацяў маладосьці…

Давядзецца падысьці, не адчэпіцца. Хаця й бачыла тую Кацю ўжо разоў сто, усё ж зірнула на пажоўклае фота дзеля прыліку.

— Першая дзеўка на ўсе Міханавічы, — працягваў бацька, — пашпарт у яе быў — на вецінара ўчылася, а прыгажуня якая!

Дачка ў аблічча цёткі Каці ў юнацтве не заўважала нічога прыгожага. З фатаздымку вытарашчанымі вачыма паглядала мардатая дзеўка ў цеснай сукенцы зь белым каўнерыкам.

— Колькі хлопцаў за ёй увіхалася! І чаго пайшла за гэтага Юрку-дыябэтыка? Квёлы, хворы, усё жыцьцё, як недапечаны які, па бальніцах, санаторыях езьдзіў. А Каця рабіла бы чорны вол, за дваіх. Чорт яго ня ўзяў нягеглага гэтага! Жыве і паміраць не зьбіраецца.

— А тут я ў камсамол уступаю, — нечакана перайшоў бацька да наступнага фота, — дужа карцела ў камсамол уступіць, каб паехаць у горад ды пасьля зайсьці ў чайную на станцыі. Паспытаць крэм-соды, салодкай белай булкі.

— А вось тут я ўжо пасьля арміі, — адгарнуў яшчэ адну старонку альбому, — як на завод уладзіўся, на першамайскай дэманстрацыі, зь сябрамі Пецькам Кушнерам з Клінаўскага раёну і Віцькам Зайцавым — вэрбаваным з Расеі. Бачыш, дачка, які я быў фраер, як быў малады і жыў у вобшчажыцproperties! Плашч балёневы, штаны ў стрэлках! Ніводзін шыбздзік на танцах не чапляўся! Ведалі — у лыч дам!

Варта адзначыць, на тым фатаздымку бацька сапраўды выглядаў фраерам, асабліва на фоне Пецькі і Віцькі, недамеркаў у аднолькавых брылях.

— Штукаваты хлопец быў гэты Пецька! Аднаго разу на танцпляцоўку прыйшоў у дзедавых лапцях. Але колькі не даказваў на ўваходзе, што лапці — ягоныя чаравікі, на танцы не пусьцілі. Я Пецьку ўзяў за шафера, калі жаніўся. А вось і наша з тваёй мамай вясельле... — пасьля гэтых слоў Сьцяпан глынуў віна, спустошыўшы «Купалінку» дашчэнту.

Здавалася, знаёмая да болю хроніка бацькавай маладосьці будзе бясконцай. Пашанцавала, што гэтым разам хаця войска не зачапіў, хутчэй бы ўжо дайшоў ва ўспамінах да свайго зорнага часу.

— У 89 годзе мяне абралі старшынём цэхкому. Дэфіцыты дзялілі. Матэрыял з лаўсану, касьцюмы спартыўныя. А колькі штучных елак зялёных і бліскучых я прывалок дадому і прадаў налева! — з захапленьнем узгадваў Сьцяпан самы найлепшы момант у сваім жыцьці.

«Ну нарэшце, зараз ужо нядоўга», — з палёгкаю ўздыхнула Марынка.

Праз колькі хвілін прыўзьняты бацькаў настрой зьмяніўся.

— І каму цяпер трэба гэтыя елкі і касьцюмы? — тужліва прагаварыў ён.

«Ну ўсё, далей можна ня слухаць», — вырашыла дачка і патэпала назад у ванную, не дачакаўшыся прадказальнага фіналу хронікі.

— Маё возера-а! Мае Міханавічы-ы! Мая бацькаўшчына! Спалілі хату, падлы! — наўздагон ёй заенчыў бацька. Родная хата згарэла два гады таму разам з суседавай пуняй пры нявысьветленых абставінах, а яшчэ гадоў дзесяць — з таго часу, як памерла баба Маруся, стаяла пустая і трухлявела бяз догляду.

Па праўдзе кажучы, ні пры жыцьці бабы Марусі, ні пасьля яе сьмерці наведваць родныя мясьціны, парадчыць сядзібу бацька асабліва не імкнуўся. Сумаваць па бацькаўшчыне тым болей не прыходзіла ў галаву. А цяпер хаты ня стала — плача як бабёр. Ня ён плача — градусы плачуць, то ненадоўга.

Марынка перакананая, што зараз ужо ніхто не перашкодзіць ёй, перапаласкала джынсы, кінула іх на трубу ў ваннай, падышла да акна.

Ля пад'езду стаяла шыкоўнае аўто, а побач зь ім Людка Гарэлікава з трэцяга паверху. Доўгія чорныя валасы, белая куртачка, чырвоныя боты. Студэнтка, актывістка, прыгажуня і дачка галоўнага тэхнолага мясакамбінату. «Во шанцуе чалавеку! І зьнешнасьць, і грошы, і жаніх з машынаю», — зазначыла Марынка.

Краем вока зачапіла ўласны адбітак у люстэрку: бляклыя рэдкія валасы, паўнаватая постаць, скулёмчаны сынтэтычны швэдар. Ня зорка, адным словам. Мільён такіх. Нічога добрага ад жыцьця не прычакаеш. Шчасьлівы бацька!

Раней купіў балёневае паліто — і ты ўжо «першы хлопец у вобшчажыцьці». Хай не зарабіў нічога за жыцьцё. Хай штодня п'яны і ў пакамечаных нагавіцах. Але мае права ганарыцца, маўляў, у маладосьці быў фраер.

А мне нават дзецям і ўнукам ня будзе чаго паказаць і чым пахваліцца.

Урэшце, хто са знаёмых, апроч Людкі, насамрэч зорка, хаця б у сваім асяродку, у нас на раёне?

Можа, Леначка Мяцельская? Вочкамі лып-лып, заўжды саладжавенькая ўсьмешка на твары. Пракоціцца на дарагой машыне зь якім кавалерам — тыдзень аж пішчыць ад шчасьця! Заробак свой жабрачы ў дзіцячым садку атрымае — увесь да апошняга рубля на шмоткі спусьціць.

Казала, нібы яе найлепшая сяброўка — дачка міністра. Зь міністрамі сябруе, а грошы пазычаць бяжыць да маёй маці. Нешта не сьпяшаецца залатая моладзь браць да сябе ў кампанію музработніка Леначку з маласямейкі.

Можа, Сашка Падабед? Разам у тэхнікуме вучыліся. Стараста групы, прыгажун, артыст, кавээншчык! Надзея тэхнікуму! «Вось камусьці шчасьце патрапіць», — думалі выкладчыкі і аднакурсьніцы. Аказалася — ніякая не надзея, так — на ўсе бочкі затычка. Усюды і нідзе. Са скуры вылузваецца — а карысьці? Ажаніўся. Жонка адна дзіця даглядае і працуе на паўтары стаўкі. А ён ні дошку прыбіць, ні грошай зарабіць! То ў паходзе, то на прыродзе, то ў КВЗ гуляе. Ці ўзяць, да прыкладу, тоўстую Сьветку. Гонар сям'і, разумніца. Дваццаць пяць гадоў, а шчэ ні




№4'2008. Эўрапейскі нумар:
Пётра Рудкоўскі, Віталь Сіліцкі, Алесь Пашкевіч, Эндру Ўілсан, Любко Дэрэш

## Новы нумар часопісу ARCHE

Падпісацца на ARCHE можна ў любым паштовым аддзяленьні. Падпісны індэкс 00345

дня не працавала. Вучыцца на платным аддзяленьні за бацькоўскія грошы. Другую спэцыяльнасьць атрымлівае. Такую ж нікому нахрэн не патрэбную, як і першую.

А суседка Вера? Каралева раёну! Першы раз выйшла замуж у шаснаццаць гадоў за нейкага чурбана. Хвалілася — апрануў з ног да галавы! Ага, майку і тапці купіў. Пажыў зь ёю трохі той джыгіт і назад у сонечныя краі паехаў… Да жонкі і чатырох дзяцей.

Цяпер Веры васямнаццаць. Надзеі на лепшае не губляе. Жыве ў іх нейкі ўжо два месяцы — удвая старэйшы за яе, увесь у татуіроўках, кажа — ад цягніка адстаў. Верка лічыць сябе рэдкай красуняй, нягледзячы на адсутнасьць двух пярэдніх зубоў і часты пах перагару.

— Ну, а калі ўжо ты замуж выйдзеш? — заўжды падколвае пры сустрэчы.

Не, няма на нашым раёне зорак апроч Людкі. Так, лямпачкі энэргазьберагальныя, калядная ілюмінацыя, ліхтары — у алькаша пад вокам. Тэлевізару наглядзеліся і захварэлі на зорную хваробу. Праўду казала нябожчыца баба Маруся — чым большае гаўно — тым вышэй сябе ставіць.

Ну, што транты свае памыла. Трэба ў калгасную краму зьбірацца. Там якраз а палове на дванаццатую завоз. Фаршу і парэбрын на суп ужо няма ў лядоўні вельмі даўно. А ў краме калгасу «Авангард» усё таньнейшае і сьвяжэйшае. Трохі ў чарзе пастаяць варта, хаця б дзеля таго, каб пабачыць усьмешку на матчыным змораным твары.

Яе апошнім часам калі і радуе што ў жыцьці, дык гэта наведваньне калгаснай крамы.

Пакуль Марынка зьбіралася, шукала па кватэры спачатку чысьцейшыя штаны, пасьля свае чаравікі і цэлую торбу, ля пад'езду пад абдрыпаным кустом бэзу расьселася заўсёдная кампанія. Ліда Мурзіха і Валя зь дзясятай кватэры — сяброўкі-пляткаркі не разьлей вада. Побач, на гэтай жа лаўцы, бы певень на жэрдачцы, прымасьціўся Коля Грыб. Бітыя паўтары гадзіны ён бавіў час у чаканьні дармавой выпіўкі, але жлукцiць чарвіўку ў двары сёньня ніхто не сьпяшаўся, таму Колька змушаны быў слухаць абгаворы і раз-пораз нешта бубнець.

Усе трое мелі за пяцьдзясят гадоў і, як большыня жыхароў мікрараёну, у маладосьці былі насельнікамі моладзевага інтэрнату і разам скакалі на танцах. Пасьля сталі суседзямі па кватэрах і разам сядзелі на лаўцы.

Пажыцьцёвыя калегі па працы на адным прадпрыемстве, адначасова то землякі, то сваякі. Вялікая вёска. Не схаваесься.

З пад'езду выбегла Марынка.

**Ліда Мурзіха ўслых, даволі гучна:** «Дзеўка харошая, а грошай няма».

**Марына моўчкі:** «Можна падумаць, у цябе яны ёсьць, каза старая! Каб былі, дык вы б усемярох не душыліся б у двухпакаёўцы! Шкада, няма часу сварыцца, я б табе рот заткнула».

Дзяўчына пайшла да крамы, размова ішла сваім ходам.

**Валя:** «Бацька яе — Сьцёпка Маліноўскі, каторы дзень не прасыхае. Памятаю, у маладосьці на танцы прыйдзець, плашч свой балёневы напрэць, нос угору. Што ты! Ніхто яму ня роўня. А боты да пятак зьдзёртыя ды нячышчаныя».

**Ліда Мурзіха:** «Усё да мяне заляцаўся. У нашым пакоі кожны вечар сядзеў. Свае грошы прагуляець, тады глядзіць пад'есьці на дармаўшчыну. Добра што не пайшла за яго. Так п'ець!»

**Валя:** «А твой ня п'ець? Учора з аўтобусу ледзь вылез» (зьедліва).

**Ліда Мурзіха:** «П'ець ды ня так».

**Колька Грыб:** «Сьцяпан — мужык неблагі. З маёю кумой Наташай з адной дзярэўні. Толькі за чаркаю слова нікому ня дасьць прагаварыць, асабліва калі перабярэ, тады чуеш ад яго адно — усё я ды я, але не прапойца, не. Чалавек парадачны, мне дрэль прывалок. А хто цяпер ня п'е, акрамя кадзіраваных?»

**Ліда Мурзіха захоплена:** «Вася зь дзясятага пад'езду! Паглядзіш — і дома ўсё дзелаець, і палавічкі трасець. Во яго жонцы Соні падвязло. У суботы на стадыёне бегаець Васька!»

**Колька са сьмехам:** «Ага, трэзьвеньнік. Разам з Сонькаю нацягнуць спарціўкі на свае тоўстыя сракі, пратрасуцца трохі і назад. Жонка стане каля лаўкі і бабам хваліцца, якія яны фізкультурнікі. А Васька тым часам коўзь за вугал і чарніла з гарла глыкае».

**Валя ўзрадаваная:** «І ён такі самы! А мы думалі трэзьвеньнік. Ну, я ўжо пайду, абед мужыку варыць трэба, гуляй, падруга».

**Ліда Мурзіха шэптам наўздагон:** «Каб цябе зямля не насіла, такую падругу! Пра майго мужыка ўсё знаець: ці ён п'яны ці яшчэ які, а пра свайго маўчыць. Ня хваліцца, як вока падбіў ёй, тры дні ў двор не выходзіла. Мала ўваліў. Можна было больш, каб язык свой паганы не распускала».

Мурзіха пасядзела яшчэ з паўгадзінкі, але размова не клеілася. Не прывык Коля Грыб размаўляць не пахмяліўшыся. Нарэшце сышла і яна — сэрыял глядзець.

Марынка Маліноўская вярталася дадому з двума кіляграмамі якаснага фаршу і кіляграмам парэбры.

Слуп аб'яваў, задрыпаны куст, самотны Коля — цьвярозы й няшчасны, абшаляваныя дзьверы, лесьвіца ўверх. Суседка зьнізу варыць катам рыбу. Смурод сьцелецца па ўсім доме. Суседка зьлева правіць юбілей. Прыйшлі жанчыны з працы, ад усяго калектыву мікрахвалёўку ў падарунак прынесьлі. Цяпер з-за кватэрных дзьвярэй даносілася тужлівае:

— Спамянь мяне, мама,
Спамянь у аўторак…
А я цябе мама,
На дні разоў сорак…

Пакуль дзяўчына калупалася ключом у замку, анэмічная песьня зьмянілася на больш аптымістычную, наколькі гэта магчыма ў нашых краёх:

— Умейце жыць, умейце піць,
І ўсё ад жызьні браць.
Усё раўно когда-небудзь
Прыдзёцца паміраць!
Ай-яй у глазах туман,
Кружыцца галава…

За парогам кватэры — бацькоўскі храп ды разьлітае віно на зэдліку ля канапы.

Чамусьці нават у лепшыя часы па вяртаньні дадому ніколі не было адчуваньня родных сьценаў, што дапамагаюць, бацькаўшчыны, як казалі ў Міханавічах.

— Па якой бацькаўшчыне я пад старасьць заплачу? — зноўку пазайздросьціла бацьку дачка.

І не запнуўшы нават фарш у лядоўню, хутчэй націснула выратавальную кнопку магнітафону.

Дзіўна, ад чужынскага сьпеву пакрысе вярталася пачуцьцё раўнавагі. Той самы прыемны мужчынскі голас ужо не весяліў, не заклікаў танчыць, а проста спакойна плыў па пакоі, супакойваў, угаворваў, і, здавалася, абяцаў марскі круіз і шматшмат халяўных кавуноў, дыняў, пэрсікаў. А можа, і не абяцаў ні халеры, проста настойліва прапаноўваў наведаць турэцкую дыскатэку, самую разнастайную ў сьвеце.

# Якуб Лапатка: «Я пераклаў «Калевалу»

Зь перакладчыкам фінскага эпасу на беларускую мову **Якубам Лапаткам** гутарыць **Наталка Бабіна**.

**Якуб Лапатка — ваш літаратурны псэўданім ці сапраўднае імя? Адкуль Вы, чым займаецеся? Якім ветрам вас занесла ў Хэльсынкі?**

**Якуб Лапатка:** Родам я зь вёскі Аўсюкова на Расоншчыне. У свой час там быў шматлікі род Лапатак. На Аўсюкове і ў Паддуб'і. Рос без бацькоў з трэцяй клясы, толькі з бабуляй, увесь час працаваў дома па гаспадарцы і ў калгасе. Домік у вёсцы — гэта толькі на рэкляме прывабна, а на праўдзе — гэта цяжкая беспрасьветная праца, асабліва паўстагодзьдзя таму. Марыў вывучыць гішпанскую мову — гэта ўжо асобная даўгая гаворка. Працаваў на будоўлі, вучыўся на сьлесара, потым — у Менскім інстытуце замежных моваў. 20 гадоў адпрацаваў у наваполацкай школе настаўнікам гішпанскай. Самастойна вучыў мовы. У.Арлоў і С.Сокалаў (тады яшчэ не зусім Воюш) з дапамогай Л.Баршчэўскага завабілі мяне ў літаратуру, у прыватнасьці, прысудзілі займацца перакладамі зь фінскай. А фіны вельмі ўважлівая і з павагай ставяцца да сваёй мовы і літаратуры. Запрасілі мяне сюды на моўную стажыроўку, потым прапанавалі працу ва ўнівэрсытэце. Там я выкладаў беларускую. Вось такім лёгкім ветрам мяне і занесла ў Хэльсынкі. А чым можа займацца пэнсіянэр? Кажуць, што гуляць у даміно ды шахматы або вудзіць рыбу. Мая рыба — гэта пераклады і фінская мова.

**Наталка Бабіна: Чым адрозьніваюцца фіны і беларусы?**

**ЯЛ:** Пачнем з агульнага. Беларусы, як і фіны, — нацыя вясковая. Вялікае перасяленьне ў гарады пачалося, як і ў нас, — на пачатку 1960-х. Беларусы, як і фіны, на працягу стагодзьдзяў знаходзіліся на стратэгічным скрыжаваньні інтарэсаў вялікіх дзяржаваў, ад чаго нацярпеліся напоўніцу. Беларусы, як і фіны, атрымалі бедную на прыродныя багацьці зямлю.

Але фіны ўчэпіста трымаюцца за мову, за незалежнасьць, за самабытнасьць. Беларусы ж ня лічаць гэта галоўнымі каштоўнасьцямі. Фіны спадзяюцца толькі на сябе. Фіны САМІ пабудавалі сацыяльную дзяржаву, дзе няма галодных, бяздомных, пак-



інутых інвалідаў і дзяцей. Беларусы гэтага ня зробяць, пакуль не ўсьвядомяць, што галоўныя каштоўнасьці — гэта мова, незалежнасьць, самабытнасьць, што толькі мы самі зможам пабудаваць сваю дзяржаву.

**НБ: Чаму вырашылі ўзяцца менавіта за «Калевалу»?**

**ЯЛ:** Вымусіла ўзяцца крыўда. Часта нават разумныя людзі як довад недаразьвітасьці беларускай мовы прыводзяць адсутнасьць шэдэўраў сусьветнай літаратуры ў беларускіх перакладах. Па змаўчаньні, а то і адкрыта даецца зразумець, што іх і ня можа быць па-беларуску, не разьвілася мова для таго. Вось я і вырашыў давесьці, што падыходзіць нашая мова для ўсяго. І для шэдэўраў, і для тэрміналёгіі. Дарэчы, цікава, куды яна падзелася, тая тэрміналёгія. Людзі майго веку вучылі ў школах альгебру па падручніку Кісялёва, фізіку — Пёрышкіна, Фалеева, Краўкліса на беларускай мове, ды іншыя прадметы.

А чым можа зацікавіць «Калевала»? Гледзячы каго. Адны чытаюць толькі мардабойныя баявікі, а другія — што-небудзь болей сур'ёзнае. «Калевала» ўдала спалучае ўсё. Гэта і бытапісаньне, і баявік, і фэнтэзі з магіяй, а галоўнае — зь людзьмі. Людзьмі блізкімі нам і зразумелымі, бо іх адольваюць тыя самыя жарсьці, што і нас, яны зайздросьцяць, кахаюць, бядуюць не тэатральна ўзвышана, а проста, па-чалавечы.

Апрача таго, гэта просты пераклад «Калевалы» ў беларускую, у той час як пераклад Бельскага на расейскую і пераклад Цімчанкі на ўкраінскую рабіліся праз мовы-пасярэднікі. Фінскай мовы перакладчыкі ня ведалі.

**НБ: Напярэдадні інтэрвію прачытала Ваш артыкул, прысьвечаны расейскаму мату. Ці можаце Вы як спэцыяліст адказаць, ці існуе беларускі мат? У нас жа часьцяком менавіта за нецэнзурную лаянку саджаюць людзей, якія карыстаюцца выключна беларускай моваю...**

**ЯЛ:** Вось у гэтым пляне беларуская мова не дасягнула мацюкальнага ўзроўню. Думаецца, можна пасьпяхова абысьціся безь беларускіх мацюкоў. Расейскіх і так па самую завязку.

**НБ: Вы цікавіцеся і прысутнічаеце як у расейскай, гэтак і ў беларускай літаратуры. Параўнайце іх, калі гэта магчыма. Якая Вам падабаецца больш?**

**ЯЛ:** Маленькі народ фінаў лічыць сваю літаратуру лепшай за іншыя. Я лічу, што «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» Караткевіча ня горш, чым шматлікія раманы пра Сьценьку Разіна. Ваенныя творы Быкава ні ў чым не саступаюць Хэмінгуэю, Бондараву, Астаф'еву. А «Новая зямля» Якуба Коласа — унікальны твор мэмуарнай літаратуры. Такой паэмы няма нідзе на сьвеце. Ну, вось табе! Міжволі ўсё ж узяўся параўноўваць. Прабачце, болей ня буду.

**НБ: Вы аўтар расейска-фінскага размоўніка. Ці не хацелі б падрыхтаваць беларуска-фінскі?**

**ЯЛ:** Размоўнікі яшчэ ніколі і нікому не дапамагалі. Галоўнае ж не задаць пытаньне, а зразумець адказ на яго. Замест размоўніка я пішу дапаможнік па граматыцы фінскай мовы. Можа, хто зь беларусаў спакусіцца і пачне вывучаць фінскую мову. Вось і будзе мне напарнік і зьмена.

**Гутарыла Наталка Бабіна**

# Камэдыя Выраджэньня



PHOTO.BYMEDIA.NET

# «Дзьве роўна шанаваныя сям'і...»

15 чэрвеня, калі сьцішылася сьпёка, усе ахвотнікі зьехалі ў адпачынак, а ўсе, хто адстаяў належны тэрмін на фазэндзе, як той казаў, жураўліным клінам пацягнуліся з палёў, самы быў час для старой добрай камэдыі. У Купалаўскім трэці раз давалі «Пінскую шляхту». Піша **Аляксандар Фядута**.

Калі да таленту ўвогуле можна прывыкнуць, то Пінігін, якога мы ўбачылі ў «Пінскай шляхце», проста нагнаў аскомы. У гэтай пастаноўцы ён выкарыстаў ці ня ўсе штампы, якія здолеў выпрацаваць за сваё творчае жыцьцё: і ўстаўныя вакальныя нумары, за тэксты якіх клясыкі ня маюць адказнасьці, і яскрава тэатральную пластыку, якая выгадна адрозьнівае ягоныя працы ад статыкі маэстра Раеўскага ці рознаўзроўневых кампазыцый Аляксандра Гарцуева. Нарэшце, усе мы ведаем, што фінал у Пінігіна абавязкова мусіць мець дадатковы сымбалічны сэнс — так было і ў «Тутэйшых», і ў «Ідыліі», так ёсьць і ў «Пінскай шляхце». Але ўрэшце, што такое штамп, калі не складовая частка фірмовага стылю?

Пінігін працуе ўдала таму, што купаецца ў беларускіх клясычных тэкстах, як майстар, які добра падрыхтаваўся да спаборніцтваў і ў вольны час вырашыў прадэманстраваць сваім заўзятарам, што і ў ваньне знойдзецца магчымасьць выявіць фантазію і свой майстэрскі ўзровень. Ён ловіць кайф, і акторы ловяць кайф, і гледачы ловяць кайф, і нават злосныя рэцэнзэнты, няхай Пінігін іх і ня любіць, таксама ловяць кайф, прычым абсалютна шчыра.

На гэты раз кайф сыходзіць зусім не ад тэксту Дуніна-Марцінкевіча (хто-небудзь, забярыце гэты нумар «НН» у Янушкевіча, а то ён мяне заб'е!), а ад дадатковых асацыяцыяў, якія ўзьнікаюць у розуме культурных людзей, якімі «купалаўцы» ўвогуле ёсьць. Нікчэмнасьцю было б ператварыць «Пінскую шляхту» ў беларускую варыяцыю «Аповесьці пра тое, як пасварыліся Іван Іванавіч з Іванам Нічыпаравічам». Таму Пінігін ставіць свой спэктакль як варыяцыю на тэму «Рамэа і Джульеты», якія з волі лёсу нарадзіліся ня ў сонечнай Вэроне, а ў глухмені палескіх балот.

Пачынаючы ад лёгкі актораў (моцная і валявая Марыля значна больш ініцыятыўная і настойлівая ў сваім змаганьні за каханьне, чым субтыльны Грышка) і заканчваючы мізансцэнамі (сцэна суду ў архітэктуры нагадвае вэронскую вуліцу, дзе на бальконах стаяць кіраўнікі варагуючых сем'яў, а ўнізе таўкуцца і б'юцца служкі — ну, і герцагсудзьдзя ім у дадатак) — усё нагадвае шэксьпіраўскую трагедыю.

Але раз гэта не трагедыя, а пародыя на трагедыю (вадэвіль усё ж), то кожны актор атрымлівае кайф, пхнуўшы стэрэатыпы трагічнага тэатру. Марыля (цудоўная ігра Ганны Хітрык) парадыюе традыцыйнае ўяўленьне пра паводзіны закаханай дзяўчыны. Пародыяй на ўвесь польскі рамантызм выглядае напышлівы аратар Грышка, сыграны Міхайлам Зуем (яго адмыслова прычасалі пад маладога Шапэна, ці гэта я здурнеў?). Харытон Куторга (дзе ўзяць словы камплімэнтаў Мікалаю Кучыцу? няма іх у мяне, проста нестае!) — фарсавая варыяцыя на тэму шылераўскага гофмаршала фон Кальба ў «Каварстве й каханьні». І зоркай пінігінскага параду пародый становіцца Іван Цюхай-Ліпскі, граючы якога Аляксандар Падабед парадыюе ім жа самім створаныя вобразы: гэты дзіўны суб'ект, які пасьвістае пры дыханьні і парывае пры хадзе, апрануты адначасова ў лапаць і дамскую пантофлю, — што ён, як не пародыя на арыстакрата-музыку Пана з «Сымона-музыкі» і арыстакрата-праўніка Юленшэрну з «Эрыка XIV»?

Вядома, сапраўдным бэнэфіцыянтам стаў Віктар Манаеў, які грае прадстаўніка дзяржавы, станавога прыстава Кручкова. Гэта таксама пародыя, пра аб'ект якой мы... не зможам. На наш погляд, гэта проста зборны вобраз чыноўніка, ад пракурора да шараговага рэгістратара ў адпаведным аддзеле выканкаму. Калі чытачы не сустракалі такога, значыцца, яны не займаліся бізнэсам, ня ўдзельнічалі ў грамадзкім жыцьці, нарэшце, проста нічога не рабілі, а мірна існавалі ў беспаветранай прасторы.

Але калі вы не марсіяне, а жывіцё на беларускай зямлі трохі болей за трыццаць гадоў (сама меней!), то Кручкова-Манаева вы і бачылі, і чулі, а можа, і хабар яму давалі.

Але Кручкоў — ня проста карупцыянэр. Ён атрымлівае асалоду ад магчымасьці вырашаць лёсы людзей. Ён нават гатовы рабіць дабро з той самай юрлівай усьмешкай, што і выносіць прыніжальны вырак (толькі заплаціце! нічога асабістага!). Ён прывык быць у цэнтры ўвагі — на вясельлі абавязкова сватам, на пахаваньні такога, як ён, злаўдзюгі зь дзяржаўным мандатам, узарванага ці зарэзанага ашуканымі «кліентамі», ён пэўна сказаў бы нешта накшталт: «Гэта яны на мяне замахваліся...» (ну, пазайздросьціў нябожчыку — ён жа ж тут галоўны). І пры гэтым падкрэсьлівае: я ж, як і вы ўсе, — просты чалавек, так што дайце мне веры, ідзеце за мной, а ўжо я абдзя... даруйце, «абую» вас ну проста як ліпку! Усё гэта пазнавальнае, наколькі пазнавальная і трасянка, шчодра напісаная для Манаева беларускім клясыкам XIX стагодзьдзя Дуніным-Марцінкевічам.

Кайф пазнаваньня прыводзіць гледача ў захапленьне. Ён рэагуе ня толькі на закладзеныя пастаноўшчыкам у тканіну спэктаклю культурныя асацыяцыі, але і на звычайную «бытавуху». Ну, назаве, дапусьцім, Куліна (Вольга Няфёдава) Ціхана (непазнавальна пераўвасоблены Ігар Дзянісаў), які схаваў ад яе заначку, са злосьці «падлай» — і ўсе чыенебудзь жонкі ці мужыкі, якія сабраліся ў залі, шчыра рагочуць, пазнаючы сябе ў гэтай сцэне. Пачулі ў куплетах шляхецкай масоўкі праглынутае, але са смачнай рыфмай слова «срака» — і клюнуць на яго, бо маркуецца, магчыма, што менавіта гэтую частку свайго дасканалага цела дэманструюць беларусы і на захад, і на ўсход... «Адгадалі!» — рагоча глядач, захлiпаючыся.

І менавіта ад гэтага робіцца страшнавата пры канцы, калі Пінігін расстаўляе кропкі.

Перарасло вясельле ў бойку, разадралі мужыкі адзін на адным вопратку да портак. Паднялі палкі да неба — а на палках старажытныя гербы беларускіх родаў — ці нешта там падобнае.

Некалі «Тутэйшыя» заканчваліся ў Пінігіна пад'ёмам бел-чырвона-белага сьцяга — які выбух эмоцый гэта выклікала! Авацыі! Крык — «Жыве Беларусь!»!

У «Пінскай шляхце» Пінігін паставіў дыягназ. Моцны дыягназ усяму таму грамадзтву, усяму таму народу, які некалі радаснымі воклічамі вітаў ягоную легендарную пастаноўку. Вось, дакрычаліся. Мікіта Зносак ня толькі ацалеў, але і атрымаў безумоўную ўладу над народам, які сам жа ён і баламуціць, сам жа і ўтаймоўвае, сам жа і абдзірае як усё тую ж ліпку... Высакародныя рыцары пазвадзіліся да паўп'яных мужыкоў, якія бяруцца за грудкі пры найменшым падазрэньні ў непавазе да сваёй пэрсоны. Вера зьвялася: гандляры ня толькі аселі ў храмах, але і пачалі дыктаваць сьвятарам зьмест казаняў. Нават паэзія зьвялася: на зьмену геніяльнаму «Пану Тадэвушу» прыйшло ўбогае «Вялікае Княства», якое загадана прызнаваць за паэтычны шэдэўр пад страхам быць абвінавачаным у супрацоўніцтве з расейскімі і нацыянальнымі спэцслужбамі. Трагедыя Адраджэньня пераўтварылася ў Камэдыю Выраджэньня з усімі наступствамі, якія выцякаюць для выраджанага народу. Трагічнымі наступствамі.

Жыве Беларусь? Якая — Беларусь? Гэтая?!

Вось чаму заканамерным выглядае фінал для моладзі — якая стварае і думае. Тое, што было намечана ў «Ідыліі», у «Пінскай шляхце» сказана проста і жорстка. Грышка і Марыся папросту зьбіраюць валізы і бягуць з гэтай праклятай Богам і спаскуджанай сукупнымі высілкамі старэйшага пакаленьня краіны. Найбольш імаверна, што яны сюды ўжо ня вернуцца. А старэйшае пакаленьне застанецца на абрабаванай голай зямлі і доўга яшчэ будзе спрачацца пра гербы, сьцягі, мяккія знакі і іншыя калякультурныя прыбамбасы, якія, на ягоны погляд, могуць замяніць мазгі, працу і свабоду.

Спрачацца больш няма пра што. «Тутэйшых» ставіць больш няма для чаго. Паглядзіце на дыску «белсатаўскую» пастаноўку Мазынскага, і вы зразумееце, што час грамадзкага энтузіязму скончыўся: там нават акторы ня вераць у тое, дзеля чаго яны нібыта ахвяруюць сабой, здымаючыся ў гэтым фільме. Зрэшты, не — не глядзіце яго! Схадзіце лепш у Купалаўскі. Пінігін адказаў за ўсё.

**Аляксандар Фядута, глядач**

# Сьвятыя патроны і вечныя дзевяностыя

Марыя Мартысевіч піша пра новую кнігу **Сяргея Прылуцкага**.

Паэт, які пачынае свой самы лірычны тэкст радком: «Дзяўчына падобная на экскаватар», — і прымушае рэдактараў расстаўляць кропачкі ў безьлічы словаў, ад чаго ў выніку робіцца няясным, «засЦаны» ён, гэты сьвет паэта, ці «засРаны»... Ён прыйшоў у літаратуру, каб эпатаваць і весяліць, каб адцяніць Велічнае і Вечнае трэшавым калярытам пралетарска-памежнага Берасьця і ўласным наркатычна-алькагольным досьведам. Гэтую ісьціну даняссе да вас любы кваліфікаваны выкладчык белліту. Я крыху паразважала і ўсё-такі вырашыла папярэдзіць, што з кнігай вершаў Сяргея Прылуцкага «Дзевяностыя forever» усё нашмат сур'ёзьней, чым здаецца на першы погляд.

Калісьці, у тых самых вечных дзевяностых, у паветры вісела пытаньне: «Што пасьля постмадэрнізму?» Эпоха постмадэрну здавалася канцом усяго, а постмадэрнізм — адзіным, што наканавана актуальнай літаратуры. Заўважна, што як паэт Сяргей Прылуцкі пачаўся яшчэ тады. Іронія, слоўныя гульні, адсылкі да шанаваных ім клясыкаў усясьветнай літаратуры — гэтаму ўсяму Прылуцкі-пачатковец напоўніцу аддаецца сьледам за раньнім жа Андрэем Хадановічам, які, мяркуючы па добрай траціне вершаў зборніка, поруч з украінцамі Юрыем Андруховічам і Сяргіем Жаданом — яго старэйшы брат-растафарыян у постмадэрністычным манастыры паэзіі (а можа, і сам ігумен). Хоць вэрсыфікуе і калямбурыць Прылуцкі менш рафінавана, чым папярэднікі. Фармаліст Хадановіч памрэ за дакладную рыфму; Прылуцкі наўмысна робіць свае тэксты шурпатымі, як наждак. Ці ня ў кожным яго рыфмаваным вершы спатыкнесься аб кансанантную рыфму: «дворыкі крамаў сны маналетніх лярваў сьляпое РБ дзевяностых амнэзія нэрваў». Асабліва часта ўжываны і ад таго занудны прыём Прылуцкага — пералік. Часам здаецца, што некаторыя вершы можна скарыстоўваць як дапаможнік па складаньні крыжаванак — столькі экзатызмаў з супадаючымі складамі і літарамі ў іх напхана: «піць грапу, ня ведаць грыпу, грэць дупу ва ўласным джыпе».

Самая выразная рыса паэтыкі Прылуцкага — алюзійнасьць. Яго каронны жанр — рэмэйк. Але, перарабляючы сваіх «сьвятых патронаў» (свае «сьвятыя патроны»?) — Рыльке, Одэна, Фроста, Бродзкага, Гербэрта ды іншых, — Прылуцкі не іранізуе. У стаўленьні да куміраў ён сур'ёзны і ўрачысты. Тут мы пачынаем заўважаць першыя сымптомы пераадоленьня постмадэрнізму.

Некалькі гадоў пасьля заканчэньня гістфаку Прылуцкі працаваў рабочым на берасьцейскім заводзе «Гефэст». Ці не адсюль — цяга да антычных матываў? Дакладней, да іх зьмяшаньня з брутальнай беларускай рэчаіснасьцю?



I чамусьці згадваеш рымскія пляцы,
афінскі форум,
але тут не сустрэнеш філёзафа ў тозе,
атлета ў позе.
Як відаць з апытаньняў й статыстыкі, у
гэтым годзе
разрастуцца калгасы, нэкропалі і
падаткавыя канторы.

Можна абагульніць: лірычны герой кнігі «Дзевяностыя forever» — Арфэй, якому навакольная рэчаіснасьць здаецца Аідам, і ад таго яму карціць перакваліфікавацца ў Адысэя. Але, як мы памятаем, Адысэю наканавана вярнуцца на Ітаку. І Арфэй-Прылуцкі вяртаецца — з Кракава, Львова, Рыгі, — «у цёмныя сутоньні часу, ў неасьветленыя далячыні». Правінцыя — яшчэ адзін выразна антычны элемэнт кнігі Прылуцкага, няхай фарбы для яе жывапісаньня паэту дае сучаснасьць:

Людзі з маленькіх правінцыйных мястэчак
засынаюць па дозе вячэрніх навінак.
На вячэру ў іх каша, гарбата, булка,
варэньне з парэчак.
Некаторыя зь іх пераможцы мясцовых
дажынак.

На прэзэнтацыі кнігі ў Менску Прылуцкі назваў свае вершы «генэрацыйнымі». Маўляў, яго мэтаю было адлюстраваць сваё пакаленьне і яго час. Час, які спыніўся ў Беларусі тады, у дзевяностых, у яго (нашым) постсавецкім дзяцінстве. Але дзевяностыя — далёка не назаўсёды. Інакш чытаць дэбютную кнігу Прылуцкага было б проста нецікава. Вершы ўпарадкаваныя па цыклях, але ўсё адно заўважна, што «Дзевяностыя forever» выразна распадаюцца на дзьве першыя кнігі паэта: першую першую і другую першую. Другая вабіць мяне значна болей.

Чым далей ад дзевяностых, тым адказ на пытаньне: «Што пасьля постмадэрнізму?» — відавочнейшы. Прылуцкі таксама дае гэты адказ. У прыватнасьці, адным з праграмных вершаў пад назвай «11-е прыказаньне». Адказ — ня ў зьмесьце вершу (лірычны герой назірае, як пралетарыят, што насяляе яго стары панэльны дом, займаецца звыклымі вечаровымі справамі) і нават не ў яго фармальных асаблівасьцях (вэрлібр) а ў яго патасе: «...што б ні казалі апосталы бацькі альбо твой участковы, забудзь усе запаведзі і пастарайся палюбіць гэты кашмар».

Літаратура стамілася перажоўваць саму сябе. Яна разарвала заганнае кола самацытацыі, пазбылася іроніі дзеля іроніі, вырашыўшы: пляваць, што ўсе новыя ісьціны — гэта добра забытыя старыя. Яны патрэбныя чалавецтву тут і цяпер, у абноўленым выглядзе, — і таму трэба прадукаваць іх. І літаратары прадукуюць, уступаючы, разам з усім чалавецтвам, у культурную сытуацыю «навачасься» — «нью эйджу».

Яе прыкметы — эмацыйнасьць, шчырасьць і пэрманэнтны стан прадчуваньня другога прышэсьця. У дэструктыўных сэктаў пакралі іх рыторыку. Сучасныя паэты зракліся паэтыкі папярэднікаў, але запазычылі ў іх сёе-тое іншае: яны зноў сталіся прарокамі. Верш Прылуцкага «Vigilia» — ня простая інтэрпрэтацыя «каляднага» топасу. Гэта — новае візіянэрства:

кожны сьнежань перад калядамі
жыцьцё нібыта робіцца сьвятлейшым
быццам сьвяты Пётр прыадчыняе сваю
браму
і райскія промні кранаюцца нашых твараў
і тады верталёты падаюцца ўкормленымі
анёламі

што патрулююць паветраныя калідоры
а неба — бясконцым сюррэалістычным
фільмам

Эмацыйнасьць — тэарэтычная база ня толькі распаўсюджанай цяпер моладзевай субкультуры; шчырасьць — творчы мэтад не аднаго зьвышпапулярнага расейскага пісьменьніка Яўгена Грышкаўца. На вокладцы кнігі Прылуцкага — звычайная, здавалася б, рэч: аўтограф вершу. Але — звычайная яшчэ тады, у дзевяностых. Цяпер, калі вершы ўсё часьцей пішуцца адразу ў файл кампутара і трапляюць да чытача ў электронным выглядзе (у выпадку Прылуцкага — праз блог аўтара), пісаньне ад рукі ўспрымаецца як нешта неймаверна інтымнае, кранальнае і шчырае. Акурат адпаведнае радкам, якія ад рукі запісаў Прылуцкі:

дзяўчына не падобная на швайцарскі
гадзіньнік
у яе наагул пашкоджаны мэханізм
але ты безь яе ня можаш, хаця і цынік
але ты кахаеш яе хоць гэта і атавізм
і ў гэтыя хвілі вы пляшка гарэлкі і колы
вып'еш адну — і зьнікае патрэба ў другой
калі ты стаіш перад ёй абсалютна голы
яна мусіць таксама быць чыстаю перад
табой

Бадай, самы любімы мой кірунак у мастацтве — маньерызм. У падручніках яго характарызуюць як нешта пераходнае, — барока, якое пакутліва прарастае з рэнэсансу. Вонкава гэта выглядае... незразумела. Сапраўды патасна ды манерна. Але самыя моцныя эстэтычныя перажываньні са мной здараліся, калі я трапляла ў маньерыстычныя інтэр'еры. Мэтад Прылуцкага па сваёй сутнасьці блізкі да маньерызму. Штосьці старое (постмадэрн?) скончылася, штосьці новае (нью-эйдж?) яшчэ не нарадзілася, але вось-вось народзіцца. Калі радзіма расколваецца напалову, шчыліна праходзіць праз сэрца паэта — сказаў калісьці Гётэ (яшчэ адзін «сьвяты патрон» Прылуцкага). «Дзевяностыя forever» натхняюць на рэмэйк клясыка: калі краіна не застывае ў бясчасьсі, сэрцу паэта не застаецца нічога іншага, як узяць на сябе функцыю мэтранома.

**Марыя Мартысевіч, радыё «Свабода»**




**Сяргей Прылуцкі. Дзевяностыя forever** (бібліятэчка часопісу «Дзеяслоў»). Менск: Медысонт, 2008.

# Магніфікат–2008

У Глыбокім ідзе Міжнародны фэстываль хрысьціянскіх фільмаў. Сярод іншых, там пакажуць стужку пра Курапаты.

17 чэрвеня ў Глыбоцкім раёне Віцебскай вобласьці пачаўся III Міжнародны фэстываль каталіцкіх фільмаў і тэлепраграм «Магніфікат-2008». На фэсьце прадстаўленыя 35 твораў зь Беларусі, Польшчы, ЗША, Літвы, Харватыі, Грузіі, Швайцарыі, Італіі, Лівану.

Фэстываль, які праходзіць пад патранажам Канфэрэнцыі каталіцкіх біскупаў, ладзяць каталіцкая арганізацыя для камунікацыі «SIGNIS-Беларусь», незалежная студыя «Стоп-кадр», рэдакцыя рэлігійна-асьветніцкага часопіса «Дыялог» і Віцебская дыяцэзія Касьцёлу пры ўдзеле Глыбоцкага райвыканкаму.

Сярод фільмаў, адабраных з 60 стужак, унікальны грузінскі фільм «Шлях Хрыста», дзе эвангельскія падзеі расказваюцца праз народную чаканку, харвацкая карціна «Эвангельле паводле Кловіа» пра рэнэсанснага мастака, які празь мініятуры спазнаваў Бога, пранізьліва-рэпартажная амэрыканская стужка «Нязломныя» пра людзкую салідарнасьць, любоў і веру падчас урагану Катрына, мэдытатыўны швайцарскі фільм «Гісторыя рук».

Беларускі рэжысэр Віктар Асьлюк прадставіў на фэсьце новую стужку «Вальс» пра вясковага лекара, які дапамагае старым. А Міхаіл Жданоўскі працягнуў тэму, якую распачаў у 90-я карцінай «Дарога на Курапаты». Герой фільму «Ва ўсе дні» — мастак, які малюе абразы на камянях у народным мэмарыяле.

Асноўныя паказы пройдуць у Глыбокім. Завершыцца фэстываль 21 чэрвеня.

**Андрэй Расінскі**

## СЬЦІСЛА

### Кніга ліставаньня Быкава й Барадуліна

«Дажыць да зялёнай травы» — кнігу пад такой назвай Васіль Быкаў і Рыгор Барадулін пісалі 43 гады. Складаецца яна зь сяброўскага ліставаньня, якое пачалося ў 1960-м і закончылася ў 2003-м. Эпісталярны зборнік днямі выйдзе ў адным зь менскіх выдавецтваў.

### Minsk Mixt у Варшаве

11—15 чэрвеня ў Варшаве прайшоў фэстываль беларускай культуры Minsk Mixt. Было там усяго: музыкі («Фляўс і Кляйн», «Сьцяна», «Далі», «Джамбібум», «Сьвет Бугі Бэнд»), паэты й барды (Беланогая, Валошын, Лабадзенка), мастакі (Артур Клінаў) і нават кіно («34»). Выставы прайшлі ў традыцыйным цэнтры беларускай дзейнасьці, галерэі Zoja, што на вул.Каперніка. Канцэрты — у клюбах Diuna і Tygmont. На сустрэчы зьбіралася па пары дзясяткаў наведнікаў, на канцэрты — шмат больш.

### Аўдыёкніга Гарэцкага

12 чэрвеня ў Менску ў Музэі гісторыі беларускай літаратуры адбылася прэзэнтацыя аўдыёкнігі «Максім Гарэцкі. Запіскі на імпэрыялістычнай вайне». Як паведаміў актор і рэжысёр радыё Алег Вінярскі, які запісаў дыск, гэтая аўдыёкніга — першая інтэрпрэтаваная праз радыёмастацтва праца Гарэцкага. Паводле Вінярскага, «гэты чалавек увасабляе сабой якраз той тып беларуса, якога мы ўсе прагнем». Дакумэнтальна-мастацкі дзёньнік М.Гарэцкага «На імпэрыялістычнай вайне» стаіць у адным шэрагу з творамі сучасьнікаў — Анры Барбюса, Эрыха Марыя Рэмарка, якія таксама пакаштавалі акопнага ліха. Ён кладзе пачатак шэрагу твораў беларускай прозы антываеннага кірунку, які працягнуў Васіль Быкаў.

**МБ**



# Не «Аббай» адзінай

Стакгольм вачыма Віталя Тараса.

### «Касір ня мае ключоў ад сэйфу»

Апісваць Стакгольм і яго архітэктуру няма ніякага сэнсу, паколькі сувэнірныя паштоўкі з выявамі шматлікіх кірхаў з высачэзнымі шпілямі, замкаў, каралеўскага палацу і Рыксдагу (швэдзкага парлямэнту), прыстанямі з сотнямі караблёў рознага водазьмяшчэньня й клясы, стракатымі сьцягамі пад сінім небам адлюстроўваюць горад менавіта такім, які ён ёсьць. І веснавое неба ў гэтым паўночным і, можна сказаць, суворым гранітным горадзе сапраўды можа быць сінім і бясхмарным. І ўсе рэстарацыі, кавярні, пабы і забягалаўкі абавязкова вынесуць свае столікі з крэсламі на вуліцы, дзе людзі ўсіх узростаў у куртках, швэдрах ці кашулях і нават у майках будуць радавацца вясноваму сонейку і любавацца відамі на гавань і расквітнелыя японскія вішні.

Праўда, адзіны напой, які могуць дазволіць сабе за тымі столікамі хоць бедныя, хоць багатыя швэды, — гэта слабаалькагольнае піва. Удзень і ў рабочай сталоўцы, і ў рэстарацыі вам пададуць піва не мацней за 2%. Адмысловыя алькагольныя крамы (іх тут усяго некалькі на 800-тысячны горад) працуюць у будні з 14-й гадзіны да 17-й, а ў выходныя ўвогуле не працуюць.

Каб дабрацца да алькаголю, трэба ўвайсьці ў краму, паглядзець на зачыненыя вітрыны з бутэлькамі, дзе ўказаныя нумар таго або іншага напою і ягоны кошт, адарваць у адмысловым апараце цэтлік з нумарам (як у банку), дачакацца, пакуль гэты нумар зьявіцца на электронным табло разам з нумарам касы, і потым падысьці да касіра. Які спрытна цябе абслужыць. Абмежаваньняў на колькасьць алькаголю няма. Касавая заля заўсёды амаль пустая і зьзяе шпітальнай чысьцінёй.

На ўваходзе ў прадуктовую краму давялося прачытаць надпіс на некалькіх мовах, у тым ліку на расейскай: «Касір ня мае ключоў ад сэйфу!» Гэта значыць, што рабаваць касу няма сэнсу — ускрыць яе ўсё адно ня ўдасца. Дарэчы, пра касавыя апараты: нідзе і ніколі прадавец ня дасьць вам дробныя грошы з рук у рукі. Манэты высыпаюцца ў адмысловы латок, адкуль ты іх мусіш сам забраць, да чаго цяжка прызвычаіцца. Тлумачыцца гэта ня толькі гігіенічнымі мэтамі, але, найперш, меркаваньнямі бясьпекі.

Акрамя акуратнасьці і трапяткога стаўленьня да аховы здароўя ды экалёгіі, у швэдаў апошнім часам разьвіўся яшчэ адзін культ — бясьпекі. Ні ў якую ўстанову тут ня трапіш, не прайшоўшы кантроль у рэцэпцыі. І ня толькі ў свой нумар у гатэлі не падымешся ў ліфце на свой паверх без электроннай карткі. Гэта каб выпадковыя людзі не бадзяліся туды-сюды. Апасеньне тэрактаў у краіне, дзе былі забітыя прэм'ер-міністар Улаф Пальмэ і зусім нядаўна — міністар замежных справаў Анэ Лінд, зразумець можна. Але пэўную нязручнасьць пры гэтым адчуваеш.

Падчас сустрэчы, якая праходзіла ў будынку ABF (гэта, можна сказаць, швэдзкі Палац прафсаюзаў), мы з калегам узьняліся на пяты паверх на ліфце, а ў часе перапынку вырашылі сысьці ўніз па запасной лесьвіцы. Зь лёгкасьцю адчынілі замок, але толькі потым зразумелі, што трапілі ў пастку. Усе дзьверы замкнёныя звонку, знутры ў іх няма нават ручак! Добра, што дзьверы шкляныя, і праз іх нас можна было бачыць, як малпаў у заапарку. Мы стукаліся ў дзьверы на ўсіх паверхах, спрабуючы зьвярнуць на сябе ўвагу і паступова ўпадаючы ў ціхую паніку. Толькі ў самым нізе, дзякаваць Богу, нейкая жанчына літасьціва вызваліла нас з «палону». Пажылыя швэды, якія ў той момант сабраліся на нейкую сваю канфэрэнцыю, пазіралі на нас, людзей, што зьнянацку выскачылі чамусьці з пажарнай лесьвіцы, са шчырай цікаўнасьцю.

### Намётавы лягер на Свэавагэн

З новага, што давялося бачыць у Стакгольме, але што ў той жа час нагадала і добра забытае старое — афраэўрапеец на ровары (ровар па-ранейшаму адзін з найбольш папулярных відаў транспарту ў Швэцыі). Ён, эўрапеец, зьбіраў… пустыя бляшанкі з-пад колы. Занятак не такі пусты, як падаецца, бо тут іх можна здаць у краме ў аўтамат і атрымаць грошы. (Закладная цана адразу ўлучаная ў кошт бляшанкі з напоем, якую ты купляеш.) Мяркуючы па памерах агромністых сетак з бляшанкамі, улоў таго афраэўрапейца быў багаты.

І яшчэ пра знаёмыя дэталі. Каля алькагольнай крамы бачыў пэрсанажа, больш звыклага для родных мясьцінаў. Гэта быў чалавек няпэўных гадоў з раскудлачанай фрызурай, распухлым і падрапаным у многіх месцах тварам, фінгалам пад вокам і чырвоным носам, у нейкіх заношаных швэдры і штанах. Ён, праўда, паводзіўся прыстойна. Купіў сабе ня скрынку піва з нармальным утрыманьнем алькаголю і моўчкі пайшоў.

Убачыць на вуліцы чалавека з распачатай бутэлькай сьпіртовага напою, у тым ліку піва, немагчыма — такое тут караецца страшэннымі штрафамі. Людзей з цыгарэтамі, праўда, яшчэ можна сустрэць. І менавіта толькі на вуліцы. Бо ва ўсіх без выключэньня ўстановах, у тым ліку ў рэстарацыях, курэньне катэгарычна забароненае. А вось паліцыянтаў на вуліцах бачыць не давялося. Затое шмат ахоўнікаў аўтамабільных паркоўак у форме хакі, якія штрафуюць парушальнікаў. Пешаходы, якія крочаць на чырвонае сьвятло сьвятлафораў, нікога асабліва не цікавяць. Калі ты патрапіў пад машыну, і ў цябе няма страхоўкі — гэта выключна твая праблема.

Швэды, дарэчы, любяць пагуляць. Асабліва ў пятніцы, калі выдаюць зарплату. У гэты дзень вуліцы і прыстані Стакгольму, і без таго зусім не бязьлюдныя, проста перапоўненыя людзьмі, якія выпраўляюцца на адпачынак. Немалая частка ідзе ў рэстарацыі. У іранскім рэстаране «Малая Пэрсія», куды нас запрасілі, проста адбою не было ўвечары ад ахвотных патрапіць туды… швэдаў. Хаця ўладальнік рэстарацыі, ён жа кухар, ён жа афіцыянт — іранец. Ды і многія заўсёднікі таксама. Такіх рэстарацыяў у Стакгольме нямала, бо толькі паводле афіцыйных зьвестак у васьмісоттысячным горадзе жывуць 70 тысяч іранцаў. (А ўсяго іміграны складаюць 17% насельніцтва 8-мільённай Швэцыі). У «Малой Пэрсіі» многіх прыцягвае, відаць, ня толькі экзатычная і пры гэтым адносна танная кухня, але прыемная атмасфэра — даволі інтымная і расслабленая. Калі б іранскія аятолы пабачылі, у якіх строях прыходзяць сюды юныя паненкі, каб разам з кавалерамі папіць піва, у іх здарыўся б, напэўна, інфаркт. Вось адзін з модных строяў, які давялося бачыць на маладой жанчыне. Кароткая кашуля мужчынскага крою, яшчэ больш кароткая куртачка і калготкі. І ўсё.

А вось яшчэ карцінка, якая не магла ня ўразіць беларускіх журналістаў: намёты на самай папулярнай, бадай, вуліцы ў цэнтры Стакгольму Свэавагэн. Першая думка — пратэст! Але супраць чаго? Выявілася, што гэта юныя фанаты папулярнай камputарнай гульні (назву сьвядома апускаю) дзяжураць у намётах, каб трымаць чаргу і першымі стаць уладальнікамі новай вэрсіі, як толькі яна паступіць у продаж…

### Жоўта-сіняя сюіта

Швэдзкая акадэмія навук зблізку выглядае ня надта імпазантна і нават, мож-



Карова ў скафандры — адзін з самых дзіўных манумэнтаў гораду.



на сказаць, сьціпла. Побач зь ёй — кавярня зь лібэртарыянскім сьцяжком (колеру вясёлкі) над уваходам. Гэта значыць, сюды могуць заходзіць геі і лесьбіянкі. Крыху далей стаіць каляровая будка, падараваная некалі ў XVIII стагодзьдзі каралём Прусіі каралю Швэцыі. Гэта мелася быць будка для вартаўніка. Але мясцовыя жыхары пачалі выкарыстоўваць яе ў якасьці прыбіральні. Для гэтых мэтаў яна служыць і ў нашыя дні.

У дворыку побач з акадэміяй — яшчэ адна «малая архітэктурная форма». Гэтая скульптура, якую празвалі «Лысым чалавечкам», карыстаецца папулярнасьцю, бо ёсьць павер'е — калі дакрануцца да ягонай галавы і загадаць жаданьне, яно абавязкова спраўдзіцца. Расейскія турысты, як звычайна, дадумаліся кідаць да чалавечка манэты…

Усё гэта стварае нейкую несур'ёзную атмасфэру ў ваколіцах Акадэміі навук. Але ж няма, бадай, установы — дакладней, рашэньня чальцоў якой з такім хваляваньнем чакаюць тысячы, ды што там тысячы, часам і мільёны людзей ва ўсім сьвеце. Прынамсі, раз на год — перад тым, як прысуджаюцца чарговыя нобэлеўскія прэміі.

У філярманічным тэатры, дзе іх уручае ляўрэатам кароль Швэцыі, патрапіла слухаць сымфанічную музыку ў выкананьні каралеўскага сымфанічнага аркестру. Сам будынак, а таксама інтэр'ер выглядаюць сьціпла і строга. Стыль мадэрн у Швэцыі адрозьніваўся ад мадэрну ў іншых эўрапейскіх краінах куды большай стрыманасьцю. Характар нардычны, так бы мовіць. Але гэта азначае, насамрэч, прысутнасьць і высокай долі рамантызму.

Не гуртом «Абба» адзіным ганарыцца Швэцыя. Жыве ў ёй такі кампазытар — Андэрс Нільсан, піша клясычную музыку для сымфанічнага аркестру. І карыстаецца вялікай папулярнасьцю. Не сказаць, каб заля тэатру, дзе адбывалася прэм'ера новай сюіты кампазытара, была перапоўненая. Яна была запоўненая на тры чвэрці. Але ж авацыі, якімі віталі і Андэрса Нільсана, і дырыжора, і аркестар, былі сапраўдныя. Было шмат букетаў, і ўсе — выключна з жоўтых і




СЯМЁН ПЕЧАНКО

**Бар KGB з будзёнаўкамі і балалайкамі — для аматараў савецкага трэшу.**



**Гістрыя Сары Леандэр — дагэтуль тэма спрэчак.**

сініх кветак, пад колер нацыянальнага сьцяга.

Сюіта «Сара Леандэр» прысьвечаная швэдзкай акторцы й сьпявачцы, вельмі папулярнай у 20—30-я мінулага стагодзьдзя. Дагэтуль яе асобу неадназначна ўспрымаюць суайчыньнікі. Сара Леандэр некаторы час жыла і выступала ў кабарэ ў Рызе (на пачатку 1920-х), а потым у Нямеччыне. У 1930-я яна здымалася ў фільмах Бэрлінскай кінастудыі, якой апекаваўся Гёбэльс. Таксама некаторыя песенькі ў выкананьні Леандэр выкарыстоўваліся нацысцкай прапагандай. Пры канцы вайны, калі саюзьнікі разбамбілі яе вілу ў прымесьці Бэрліну, Сара вярнулася ў Швэцыю разам з двума дзецьмі ад мужа, зь якім яна разьвялася. Швэды, многія зь якіх падчас вайны адкрыта сымпатызавалі Гітлеру, на той момант перамянілі меркаваньне. Яны пачалі ганіць «нацысцкую паслугачку». Да канца жыцьця і пасьля сьмерці (акторка памёрла ў 1981-м годзе) швэдзкае грамадзтва не аднойчы вярталася да дыскусіі — кім лічыць Сару Леандэр: калябаранткай ці проста акторкай, якая не разьбіралася ў палітыцы?

Мяркуючы па цудоўнай сюіце Нільсана, яна была, найперш, надзвычай прыгожай жанчынай.

### Відавочцы альбо сьведкі?

Дзіўным чынам гэтую сюіту давялося пачуць наступным днём пасьля наведваньня самага незвычайнага музэю, які дагэтуль даводзілася наведваць мне і маім калегам — музэю жывой гісторыі. («Форум жывой гісторыі»). І самае дзіўнае палягае на тым, што гісторыя Сары Леандэр магла б стаць часткаю яго экспазыцыі альбо прадметам дыскусіі на форуме www.levandehistoria.se

Праект узьнік пад эгідай швэдзкага ўраду некалькі гадоў таму. У краіне тады было праведзенае апытаньне на тэму: што школьнікі ведаюць пра Галакост? Выявілася, што 70% ніколі ня чулі пра яго. А траціна выказала сумнеў у існаваньні канцлягераў. Між тым, у Швэцыі нашых дзён зьявіліся злачынствы на тле ідэалёгіі — забойствы імігрантаў, гомасэксуалістаў, прадстаўнікоў іншых мяншыняў. Швэцыя займае першае месца ў сьвеце ў экспарце запісаў фашысцскай музыкі (ад гітлераўскіх маршаў да сучасных твораў).

Таму ў арганізатараў праекту зьявілася жаданьне ня проста дасьледаваць нядаўняе мінулае, у тым ліку зьвязанае з супярэчлівай роляй Швэцыі ў другой сусьветнай вайне, а зрабіць яго прадметам жывой дыскусіі ў грамадзтве. Мала хто ведае, напрыклад, што менавіта Швэцыя стварыла першы ў сьвеце інстытут расавай ідэалёгіі ў 1922-м, што ўлучна да 1953-га тут ужывалася прымусовая стэрылізацыя, у тым ліку, з расавых меркаваньняў.

Першай працай «Форуму жывой гісторыі» стала кніга «Галакост у Эўропе. 1933—1945». Другая кніга, якая выйшла зусім нядаўна, прысьвечаная камуністычным рэпрэсіям у СССР, Кітаі і Кампучыі ў пэрыяд з 1917-га па 1989-ы. Але найбольшае ўражаньне пакідае сам музэй, заснаваны на жывым кантакце з гледачамі. Ён зусім сьціплы паводле памеру, але справа тут ня ў колькасьці экспанатаў, якіх таксама мінімум. Як сказаў адзін з арганізатараў праекту, «сучаснасьць без гісторыі мёртвая».

Вось частка экспазыцыі, якую стваральнікі назвалі: «Відавочцы альбо сьведкі?» Перад намі макет нацысцкага лягеру сьмерці ў Маўтгаўзэне. Побач стэнд зь вялікім, у натуральную велічыню, здымкам людзей з фотаапаратамі — відавочна, турыстаў. У фатастэндзе выразаная ніша, у якую можа стаць кожны з наведнікаў. Такі атракцыён ёсьць у любым месцы адпачынку. А над макетам канцлягеру — цытата зь ліста пажылой немкі тагачасным уладам Райху. У сваім лісьце, напісаным ў вельмі асьцярожных выразах, кабета скардзіцца на тое, што, паколькі яна жыве побач зь месцам зьняволеньня ў Маўтгаўзэне, да яе вушэй часта даносяцца крыкі людзей, якіх расстрэльваюць. Часам, піша яна, гэтых людзей не забіваюць зь першага разу, тады іх дабіваюць, і яны паміраюць у пакутах. У лісьце няма яўных ацэнак дзеяньняў эсэсаўцаў, якія расстрэльвалі. І таму незразумела — ці жанчына скардзіцца на тое, што крыкі ахвяраў не даюць ёй спаць, ці яна спрабуе ў такой форме заступіцца за пакутнікаў.

Арганізатары праекту ва ўсіх выпадках імкнуцца, каб гледачы (а гэта, у першую чаргу, школьнікі) задумваліся і над роляй «нэўтральных сьведкаў», якія ня ўдзельнічалі ў злачынствах, але не спрабавалі іх спыніць. Колькі такіх нэўтральных сьведкаў жыве вакол нас? Хіба самі мы не належым да іх? Але ў кожным выпадку, хочам мы таго або не, нашыя дзеяньні будуць ацэньваць нашыя нашчадкі.

Швэды гэта зразумелі раней за іншых.

**Стакгольм—Менск**

**Фота аўтара**

# Паміж верай і фактам

У Польшчы найлепш прадаюцца не дэтэктывы, а мэмуары, інтэлектуальная літаратура і Капусьціньскі. Рэйтынг польскіх бэстсэлераў за 2007 год.



Станіслаў Дзівіш.

Мінулы год быў для польскага рынку кнігі цікавы. Выразна бачна, што на ім павольна паўстае адносна вялікая група спажыўцоў, якія добра ведаюць свае эмацыйныя й інтэлектуальныя чытацкія патрэбы і здольныя іх адпаведна рэалізаваць, часам нават насуперак прапановам крытыкаў. Што ж, выбар чытва — права свабоднага грамадзяніна, і ягоны выбар трэба паважаць.

Абсалютным лідэрам продажаў у Польшчы была вельмі польская кніга — успаміны кардынала Станіслава Дзівіша «Сьведчаньне». Два дзесяцігодзьдзі Дзівіш быў асабістым сакратаром папы Яна Паўла II.

За год прадалося 850 тыс. асобнікаў яе. Для палякаў Ян Павал II застаецца самым вялікім суайчыньнікам.

Увогуле, каталіцкі чытач застаецца ў Польшчы самым масавым. Вельмі цёпла на польскім рынку была прынятая кніга Бэнэдыкта XVI «Ісус з Назарэту». У першым паўгодзьдзі яна трапіла да 110 тыс. спажыўцоў, а за ўвесь 2007 г. — ажно да 150 тыс.

Пра цікавасьць польскай аўдыторыі да рэлігійных рэфлексій сьведчыць вялікая зацікаўленасьць кнігай брытанскага біёляга-эвалюцыяніста Рычарда Даўкінса — «Бог як аблуда» (42 500 асобнікаў). У сваёй кнізе навукоўца папулярна даводзіць, што сусьвет амаль напэўна ня мае творцы і што рэлігійная вера зьяўляецца аблуднай — трывалай памылкай. Кніга перакладзеная на 31 мову, але яе посьпех у Польшчы добра сьведчыць пра інтэлектуальны ўзровень польскага чытача.

Сьмерць Рышарда Капусьціньскага стала невярагоднай стратай для многіх чытачоў. Капусьціньскі, дарэчы, — наш зямляк, які нарадзіўся ў Пінску, і толькі ў часе вайны выехаў у сталіцу Польшчы, дзе здабыў славу як рэпартажыст і публіцыст. Легенда рэпартажу («Падарожжы з Герадотам») і дакумэнтальнай прозы («Імпэратар»), ён не пасьпеў атрымаць Нобэлеўскую прэмію, на якую яго працяглы час вылучалі. Але засталіся кнігі: за 2007 г. іх было прададзена больш за 370 тыс. Чытачы найбольш зацікавіліся запісамі размоваў зь пісьменьнікам — «Капусьціньскі: не спасьцігну сьвету...» (85 000 асобнікаў). У гэтых размовах аўтар «Імпэрыі», якую неўзабаве мае выдаць па-беларуску «Кнігарня «Наша Ніва», выказаў бальшасьць уласных невясёлых рэфлексіяў на тэму стану нашага сьвету.

Самай значнай тэндэнцыяй польскага кніжнага рынку летась быў рост цікавасьці да літаратуры факту. На першы погляд, гэта нелягічны і беспадстаўны працэс. Аднак менавіта гэткую літаратуру абіраюць інтэлектуальна неспакойныя людзі, якія знаходзяцца ў пошуку, якія шукаюць пэўнасьць у існаваньні.

Некаторых зь іх цікавіць сіла веры (кардынал Дзівіш, Бэнэдыкт XVI), іншых — разумовая аргумэнтацыя Капусьціньскага й Даўкінса. Ёсьць і тыя, хто ў гісторыі й традыцыі шукаюць спакой і адпачынак, чытаючы ангельскага гісторыка Нормана Дэйвіса ці польскага аматара гісторыі, журналіста й пісьменьніка Паўла Ясеніцу.

Іншая група найбольш любіць бясконцыя спрэчкі пра лёс краіны. Ім падабаюцца палітычная аповесьць «Найгоршы» (прадалося 57 000 асобнікаў) польскага публіцыста й гісторыка Вальдэмара Лысяка, крытыка ўплывовых людзей ПНР і Рэчы Паспалітай, а таксама «PIS-нэйлэнд» (42 000 асобнікаў) вядомага тэлежурналіста Томаша Ліса, які, на думку Лысяка, зьяўляецца «жывым сымбалем дэгенэрацыі журналісцкай прафэсіі».

Вось рэйтынгі найлепш прадаваных у Польшчы кніг 2007 г. — вялізныя наклады! Палякі застаюцца чытаючай нацыяй. Які кантраст з сучаснай Беларусьсю!

**Паводле Rzeczpospolita rp.pl**

**Рэйтынг бэстсэлераў 2007 г. у Польшчы**

*Польская літаратура*

1. Хмялеўская Ягана. «Запальнічка». 63 000
2. Лысяк Вальдэмар. «Найгоршы». 56 770
3. Каліціньска Маргарыта. «Дом над затокай». 52 029
4. Каліціньска Маргарыта. «Вяртаньні над затокай». 50 349
5. Грэткоўска Мануэла. «Кабета й мужчыны». 49 951
6. Краеўскі Марэк. «Мор ва Ўроцлаве». 44 419
7. Сапкоўскі Андрэй. «Lux perpetua». 44 230
8. Швая Моніка. «Клюб мала ўжываных паненак». 43 000
9. Мысьліўскі Веслаў. «Трактат пра лушчэньне фасолі». 37 748
10. Капусьціньскі Рышард. «Імпэратар». 36 923
11. Такарчук Вольга. «Bieguni». 33 770
12. Капусьціньскі Рышард. «Цень сонца». 32 067

...

Капусьціньскі Рышард. «Імпэрыя». 27 391

Капусьціньскі Рышард. «Lapidarium VI». 22 546

Шымборска Віслава. «Шчасьлівае каханьне й іншыя вершы». 20 000

Пільх Ежы. «Цягнік у вечнае жыцьцё». 19 297

Хюле Павал. «Апошняя вячэра». 15 380

*Літаратура факту*

1. Кардынал Станіслаў Дзівіш. «Сьведчаньне». 850 000
2. Бэнэдыкт XVI. «Ісус з Назарэту. Частка 1». 150 000
3. Ксёндз Тадэвуш Ісаковіч-Залескі. «Касьцёл і Служба бясьпекі ПНР на прыкладзе Кракаўскай архідыяцэзіі». 148 172
4. «Уладыслаў Барташэўскі. Хто Вы? Гутарка». 87 444
5. «Гутаркі з Капусьціньскім: не спасьцігну сьвету». 84 445
6. Лысяк Вальдэмар. «Талейран. Дарога Мэфістофэля». 74 250

...

Каэльё Паўла. «Жыцьцё. Думкі й уражаньні». 63 726

Даўкінс Рычард. «Бог як аблуда». 42 500

Ліцьвіненка Аляксандар, Фельштынскі Юры. «Выбухі ў Расеі». 41 975

Ліс Томаш. «PiS–нэйлэнд». 41 884

Дэйвіс Норман. «Эўропа — паміж Усходам і Захадам». 41 354

Ксёндз Ян Твардоўскі. «Аўтабіяграфія. Т 1/2». 37 570

Капусьціньскі Рышард. «Ірваны бег гісторыі. Запіскі пра XX і XXI стагодзьдзі». 35 264

Ясеніца Павал. «Польшча Пястаў». 32 703

Вісьнеўскі Януш Л. «Ці патрэбныя сьвету мужчыны?». 30 580.


## Зьбяры «Кнігарню «Наша Ніва»



**Бабілёнская бібліятэка:** Замежная літаратура ў перакладах «Нашай Нівы».



**Алесь Кудрыцкі. Суд на Каляды.** Зборнік публіцыстыкі.



**Наталка Бабіна. Крыві не павідна быць відна**



**Наталка Бабіна. Рыбін горад.** Раман



**Паветраны шар:** беларускае мужчынскае апавяданьне



**Жанчыны выходзяць з-пад кантролю:** Беларускае жаночае апавяданьне

# Паміж крыміналам і фантастыкай

Рэйтынг расейскіх бэстсэлераў 2007 году.

Расея ў 2007 годзе рыхтавалася да зьмены прэзыдэнта. Безумоўна, чытачы не маглі не палітызавацца ў гэты пэрыяд. У маскоўскіх кнігарнях ніводная паліца бэстсэлераў не абыходзілася бяз твораў «Духless» і «Media Sapiens» Сяргея Мінаева, а таксама без «Гастарбайтэра» Эдуарда Багірава. На рэкляму гэтых раманаў былі затрачаныя немалыя грошы.

«Media Sapiens» выйшаў у 2007 г. і набыў папулярнасьць на хвалі цікавасьці да папярэдняй кнігі Мінаева: яго «Духless» трапіў у рэйтынг 2006 г. адразу па зьяўленьні ў продажы й быў пачаткам супрацоўніцтва пісьменьніка-пачаткоўца з крамлёўскімі рэклямістамі. У 2007 г. першы радок заняў больш палітызаваны «Media Sapiens. Аповесьць пра трэці тэрмін».

Нягледзячы на тое, што Сяргей Мінаеў атрымаў літаратурную антыпрэмію «Поўны абзац», гэта толькі падагрэла чытацкую цікавасьць да яго кніг. Працяг «Media Sapiens-2. Дзёньнік інфармацыйнага тэрарыста» таксама трапіў у сьпіс. Сукупнасьць продажаў гэтых дзьвюх кніг дазволіла спадару Мінаеву стаць самым прадаваным пісьменьнікам у Расеі ў 2007 годзе.

Кніга Багірава — зьява з таго ж шэрагу. З разьлікам на гарантаваны посьпех яна выйшла адразу стотысячным накладам. У ёй таксама не абышлося без палітыкі — прысутнічаюць нават антысэміцкія закіды. У рэйтынгу — на 20-м месцы.

На гэтым фоне своеасаблівай процівагай двум аўтарам зьяўляецца Віктар Пялевін са сваёй «Empire V». У змрочным рамане-памфлеце кіраўніцтва Расеі выяўляецца ў вобразе вампіраў, якія сілкуюцца ня столькі крывёй, колькі сьвятарным «баблосам». Кніга выйшла ў 2006 г., але дагэтуль прысутнічае ў рэйтынгу на 19-й пазыцыі. Тым ня менш, папулярнасьць палітычных намёкаў у літаратуры выглядае даволі сумнеўнай.

Пачынаючы з другой пазыцыі, мы бачым традыцыйна папулярную для рэгіёну літаратуру.

Тут разьмясьціліся «Нэфрытавыя пацеркі» знакамітага пісьменьніка Барыса Акуніна (Рыгора Шалвавіча Чхартышвілі), вядомага сэрыяй пра прыгоды Эраста Фандорына. А восьмую заняла адносна нядаўняя кніга аўтара «Сьмерць на брудэршафт», напісаная ў новым жанры Акуніна «раман-кіно». Нельга не заўважыць і прысутнасьці ў рэйтынгу гістарычнага дэтэктыву «Дзявятны Спас» Анатоля Брусьнікіна.

Апошнюю кнігу мог напісаць сам Барыс Акунін. Як піша Анатоль Брусьнікін, «маё сапраўднае прозьвішча гучыць крыху інакш. Выдавецтва папрасіла мяне трошкі яго зьмяніць».

Пры гэтым «А. О. Брусникин» — анаграма «Борис Акунин». Спадар Акунін адмаўляе, што мае нейкае дачыненьне да твора, але некаторыя літаратурныя прыёмы й мова кнігі наводзяць на іншую думку. У тым разе, калі сапраўднае аўтарства належыць спадару Акуніну, то паводле сукупнасьці продажу трох кніг яго можна лічыць самым прадаваным пісьменьнікам у Расеі, насупраць разрэклямаванага Сяргея Мінаева.

Навуковая фантастыка карысталася ў рэгіёне шырокім попытам яшчэ ў савецкія часы. А вось папулярнасьць казачнае фантастыкі — адметнасьць новай эпохі. Паўла Кальё, адзіны замежнік у рэйтынгу, займае высокае трэцяе месца.

Трапіла ў рэйтынг і фэнтэзі расейскага аўтара Ніка Перумава. У дзясятцы — «Чыставік» некалі культавага Сяргея Лук'яненкі і кніга прадстаўніка новае генэрацыі фантастаў Зьмітра Глухоўскага. Між іншага, ягонае «Мэтро 2033» мае нешта агульнае з памянёным «Духless», а менавіта: абодва творы прайшлі ў сваім стварэньні праз інтэрнэт. Спадар Глухоўскі выкладаў раман па разьдзелах на ўласным сайце, а спадар Мінаеў аб'ядноўваў розныя свае электронныя публікацыі адным сюжэтам. Такім чынам, паўстае літаратура інтэрнэт-карыстальнікаў.

Аднак гледачоў тэлебачаньня ў краіне ўсё ж болей. Згодна са статыстыкай, у мінулым годзе прагляд тэлевізійных праграмаў быў асноўным спосабам бавіць вольны час для расейцаў. Невядома, ці зьвязана гэта з засільлем крыміналу ў тэлеэтэры, ці з самой расейскай рэчаіснасьцю, але дэтэктывы й трылеры карыстаюцца трывалай папулярнасьцю.

У Маскоўскім Доме кнігі самымі прадаванымі пісьменьніцамі былі Тацяна Ўсьцінава й Аляксандра Марыніна — аўтаркі дэтэктываў. Увогуле, літаратура, напісаная жанчынамі, — жаночая альбо не — зьяўляецца ці не самай прыбытковай нішай на выдавецкім рынку. А яе асноўнымі спажывальнікамі таксама зьяўляюцца жанчыны. І ўсё ж раманы Робскі, Дашкавай і Ўсьцінавай саступаюць жорсткаму хорару лідэра гэтага «жаночага» рынку Дар'і Данцовай, якая, паводле дадзеных ВЦИОМ, другі год запар зьяўляецца самай папулярнай аўтаркай у Расеі.

Калі вярнуцца яшчэ раз да крымінальнай літаратуры, цікава, што вялікая яе частка напісаная паводле рэальных фактаў. Узяць той жа «Рэйдэр» — раман адваката Паўла Астахава пра «чыста рускі» бізнэс», які знаходзіцца на дзявятым месцы. У 2007 г. ГУУС Масквы пачаў праверку ў сувязі з тым, што ў рамане ўтрымліваліся «непраўдзівыя зьвесткі, якія зьневажаюць... рэпутацыю ўсёй праваахоўнай сыстэмы РФ». У рамане, пад зьмененымі імёнамі, фігуравалі рэальныя асобы.

У гэтай кругаверці папулярнай фантастыкі, рамантыкі, крыміналу й палітыкі асобнае месца займае жаўнер Іван Чонкін, герой сьмешнай дысыдэнцкай сатыры савецкага часу. Трылёгія пра прыгоды Чонкіна была задуманая напрыканцы 1950-х, а вось апошняя кніга выйшла толькі ў 2007 г., заняўшы ў рэйтынгу 14-е месца. Патрыятычнага выхаваньня аўтар не прапануе — хутчэй вучыць быць чалавекам. Зьяўленьне ў рэйтынгу «старой гвардыі» — бадай, выпадковасьць, але яна можа сьведчыць пра тое, што чытачы аддаюць перавагу новай, не заўсёды якаснай літаратуры таму, што менавіта яе прапануюць ім выдаўцы.

**Паводле gazeta.ru**



Сяргей Мінаеў.

**Рэйтынг бэстсэлераў 2007 г. у Расеі**

1. Мінаеў Сяргей. «Media Sapiens. Аповесьць пра трэці тэрмін». 8,98% продажаў.
2. Барыс Акунін. «Нэфрытавыя пацеркі». 7,27%.
3. Каэльё Паўла. «Вядзьмарка з Партабэла». 6,17%.
4. Мінаеў Сяргей. «Media Sapiens–2. Дзёньнік інфармацыйнага тэрарыста». 4,87%.
5. Аляксандра Марыніна. «Усё ня так». 4,75%.
6. Глухоўскі Дзьмітры. «Мэтро 2033». 4,65%.
7. Лук'яненка Сяргей. «Чыставік». 4,34%.
8. Барыс Акунін. «Сьмерць на брудэршафт». 3,92%.
9. Астахаў Павал. «Рэйдэр». 3,73%.
10. Усьцінава Тацяна. «Ад першага да апошняга слова». 3,38%.
11. Аксёнаў Васіль. «Рэдкія землі». 3,35%.
12. Усьцінава Тацяна. «Калодзеж забытых жаданьняў». 3,34%.
13. Анатоль Брусьнікін. «Дзявятны Спас». 3,19%.
14. Вайновіч Уладзімір. «Жыцьцё й незвычайныя прыгоды жаўнера Івана Чонкіна». 3,09%.
15. Робскі Аксана. «Вустрыцы пад дажджом». 3,07%.
16. Санаеў Павал. «Пахавайце мяне за плінтусам». 2,83%.
17. Перумаў Нік. «Сем Зьвяроў Райлега». 2,69%.
18. Паліна Дашкова. «Крыніца шчасьця». 2.67%.
19. Віктар Пялевін. «Empire V». 2,54%.
20. Эдуард Багіраў. «Гастарбайтэр». 2,30%.


# Шукайце ў кнігарнях і ў незалежных распаўсюднікаў



**Ева Вежнавец. Шлях дробнай сволачы.**



**Андрэй Дынько, Андрэй Скурко. Беларусь за 10 падарожжаў.**



**Павал Севярынец. Лісты зь лесу.**



**Артур Клінаў. Малая падарожная кніжка па Горадзе Сонца**



**Валянцін Тарас. На высьпе ўспамінаў.**



**Васіль Быкаў. Пахаджане.** Прыпавесьці.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Выходнымі ў Горадні прайшоў Фэстываль нацыянальных культур. У ім узялі ўдзел прадстаўнікі 25 нацыянальнасьцяў. Сёлета да фэстывальнага руху далучыліся беларускія баўгары, індусы, палестынцы, кабардзіны, балкары. На фота: азэрбайджанцы.**

### У Будславе перад фасадам

Галоўны алтар у часе Будслаўскага фэсту сёлета паўстане ня з боку былога аэрадрому, як у мінулыя гады, а перад галоўным уваходам у храм.

Мяркуецца, што пілігрымам будзе зручней стаяць на Краснай плошчы. Сквэр на ёй быў акурат упарадкаваны.

На ўшанаваньне абраза Маці Божай Будслаўскай у мястэчка Будслаў, што на рэчцы Сэрвач, у Мядзельскім раёне, штогод 1 і 2 ліпеня зьбіраюцца дзясяткі тысяч паломнікаў з усяе Беларусі.

### У Рагачове грузавік зьбіў жанчыну зь дзіцём

Трагедыя здарылася 11 чэрвеня. Кіроўца «МАЗу» не саступіў дарогу жанчыне, якая пераходзіла па нерэгуляваным пераходзе і везла перад сабою каляску зь сямімесячным дзіцём. Малое загінула на месцы, маці шпіталізаваная з сур'ёзнымі траўмамі. Кіроўца «МАЗу» мае 30-гадовы стаж працы. Цяпер ён затрыманы, вядзецца разбор.

### У Драздах няможна купацца

А ўсяго ў Беларусі забаронена купаньне ў 12-ці вадаёмах. Прычынай зьяўляецца наяўнасьць лактозазастаноўчай кішэчнай палачкі ў вадзе. Таксама нельга купацца ў тэхнічных вадаёмах, як, напр., Чыжоўскае вадасховішча і Сьцяпянскі ручай.

### У Магілёве асьвечаная пляцоўка пад другі касьцёл

Ксёндз біскуп Антоні Дзям'янка асьвяціў у Магілёве пляцоўку, дзе ўзводзіцца касьцёл сьвятога Антонія, а таксама звон будучай сьвятыні. Асьвячэньне адбылося 13 чэрвеня ў Дзень нябеснага заступніка Магілёва — сьвятога Антонія. На ўрачыстасьць прыйшлі каля сотні вернікаў. Касьцёл у Магілёўскім Задняпроўі стане другой каталіцкай сьвятыняй у горадзе. Сьвяты Антоні стаў апекуном Магілёва пры канцы XVI ст. Яго цудатворны абраз прынесьлі ў Магілёў францішканцы. Абраз зьнік у часы вайны.

### У Вязынцы — выстава ў сьвірне

60-годзьдзе філіялу Літаратурнага музэю Янкі Купалы на радзіме паэта плянуецца адзначыць на Купальле разам з Днём нараджэньня клясыка. Вязынка ўключаная ў міжнародны маршрут турызму ЮНЭСКА. У фондах запаведніку больш за 1000 экспанатаў. Ад хаты, у якую ў 1881 г. пераехалі бацькі паэта, засталіся толькі шэсьць бярвеньняў. Сёньня яны зьяўляюцца часткай экспазыцыі музэю.

Акрамя мэмарыяльнага дому, на тэрыторыі запаведніку знаходзяцца помнік Купалу работы Заіра Азгура, камяні-валуны з выбітымі на іх купалаўскімі радкамі, 200-гадовыя дубы, старыя ліпы й вербы, сажалка, крынічка й сьвіран.

У сьвірне адбываецца выстава флярыстыкі віцебскага клюбу «Анюта» й работаў народных майстроў паводле матываў твораў Купалы. Выстава прымеркаваная да 60-годзьдзя філіялу.

### У Гомелі злавілі папа з парнаграфіяй

Праваслаўнага сьвятара з Расеі затрымаў у Гомелі супрацоўнік ДАІ. Настаяцель храму, а ў мінулым настаўнік гісторыі, у адной з грамадзкіх прыбіральняў займаўся распаўсюдам фатаздымкаў аголеных мужчынаў. Адзін зь іх ён неабачліва прапанаваў міліцыянту. Агулам у сьвятара знайшлі трыццаць здымкаў. Вядзецца сьледзтва.

### У Менску хлопец скочыў зь дзявятага паверху і выжыў

Пасьля выпускнога сябры, выпіўшы, палезьлі на дах дзевяціпавярховіка. Там дабавілі ящчэ. Раптам адзін зь іх з крыкам «Будзем жыць!» кінуўся ўніз. Шчасьце, што патрапіў на бярозу. На зямлі апынуўся з пабітым бокам і параненай галавой. Да прыезду «хуткай» быў у прытомнасьці, а потым... заснуў пад узьдзеяньнем алькаголю. Пасьля тлумачыў свой учынак тым, што «захацелася палётаць».

### Пад Берасьцем мак знаходзяць гектарамі

«Нічыйныя» пасевы маку, што займалі паўтара гектара, былі знойдзеныя і зьнішчаныя супрацоўнікамі міліцыі на полі блізу вёскі Клейнікі. Гэта ўжо другое выяўленьне пасеваў маку на тэрыторыі раёну за апошнія дні. 9 чэрвеня гектар маку знайшлі каля вёскі Тамашоўка.

### У Аргентыне адкрылі помнік Чэ Гевару

Помнік Эрнэста Чэ Гевару адкрыты ў гонар ягонага 80-годзьдзя ў аргентынскім горадзе Расарыё, дзе ён нарадзіўся. На стварэньне чатырохмэтровага манумэнту пайшло тры тоны бронзы. У гонар Чэ таксама перайменаваная адна з цэнтральных плошчаў Расарыё.

### У Індыі немаўлятам мацуюць радыёмаякі

Індыйская паліцыя на поўдні краіны прапанавала прымацоўваць немаўлятам у радзільнях радыёмаякі, каб пазьбегнуць выкраданьня і падмены дзяўчатак на хлопчыкаў. Датчыкі на дзьвярах будуць падаваць сыгнал, як толькі дзіця паспрабуюць вынесьці з палаты. Бо новanароджаных дзяўчатак у Індыі часта кідаюць альбо падмяняюць на хлопчыкаў, каб у будучым не даваць за імі вялізарнага пасагу. У індыйцаў прынята дарыць бацькам маладога аўтамабілі і матацыклы, залатыя ўпрыгожаньні і грошы. А ня ўсе такія багатыя.

### Гульні праваслаўных патрыётаў

На базе Смаргонскага памежнага атраду праходзіць вайскова-патрыятычны спартовы зьлёт праваслаўнай моладзі, прысьвечаны 90-годзьдзю памежных войскаў Беларусі і 400-годзьдзю Канстанціна Астроскага. У зьлёце бяруць удзел 11 каманд ад усіх япархій Беларусі, сьвятары, адказныя за ўзаемадзеяньне з узброенымі сіламі епархіяльных упраў БПЦ, і вайскоўцы.

Удзельнікі наведваюць месцы баёў першай сусьветнай, сучасныя вайсковыя часткі. Афіцэры праводзяць заняткі па агнявой і страявой падрыхтоўцы, знаёмяць моладзь з асаблівасьцямі аховы мяжы і гісторыяй органаў памежнай службы. Завершыцца зьлёт 22 чэрвеня.

### Мірны вылецеў у чацьвёртую сотню

У агульным рэйтынгу Асацыяцыі тэнісістаў-прафэсіяналаў Максім Мірны адкаціўся на 301 радок. Яму ў сьпіну дыхае Уладзімер Ваўчкоў, які займае 380 радок. Уладзімер Ігнацік — 503-ці, Андрэй Каратчэня — 787-ы, у першай тысячы таксама — Сяргей Бетаў і Павал Катляроў, у іх адпаведна 880-е і 883-е месцы. Лідзіруе швайцарац Роджэр Фэдэрэр.

Мірны падае і ў рэйтынгу найлепшых парных тэністаў. Ён цяпер займае 28-ы радок. Лідзірнуюць па-ранейшаму браты Боб і Майк Браяны.

Што тычыцца жаночых рэйтынгаў, то Вікторыя Азаранка захавала 16-ю пазыцыю ў рэйтынгу індывідуальнага разраду. Вольга Гаварцова і Настасься Якімава таксама засталіся на сваіх месцах: 36-е і 131-е. А лідэрства захапілі дзьве сэрбскія тэнісісткі: Ана Івановіч і Алена Янкавіч.

**Паводле ул. інф., БелаПАН, радыё «Свабода», tut.by, «Літаратура і мастацтва», novonews.lv**

# Чэмпіянат Плястыляндыі па футболе

**Жыхары Краіны Плястыляндыі вырашылі зладзіць чэмпіянат па футболе.**

**Паглядзі на карцінку і скажы, хто што наблытаў.**




## ПЛЕНЭР

### Легенда зь пяску

«Легенда зь пяску» трывае! Гэтым летам яна будзе з гліны. Пленэр пройдзе ў Менску. Ад станцыі мэтро «Каменная Горка» дабярэцеся да **вул.Матусевіча**. Там, **насупраць унівэрсаму «Кунцаўшчына»**, за мостам стаіць гара, парослая асінавым гаем. На ёй неўзабаве будзе ўзьведзены касьцёл Сьвятога Яна Эвангеліста. Дык жа пачнем будаўніцтва касьцёла пад гарой скульптурай «Малітва сьвятога Яна Эвангеліста»! Калі адбудзецца акцыя? Ды на дні сьвятога Яна Хрысьціцеля, гэта значыць, на Купалу. **У суботу рана 21 чэрвеня** пачынаем таптаць гліну з вадою. Пад вечар, хто захоча — паедзе на Купалу. **А ў нядзельку далепім.** Прыходзьце з фота- і відэакамэрамі, вёдрамі, гумовымі ботамі, у жоўтай вопратцы, але самае галоўнае — вазьміце з сабой родную мову. Кантакты: (029) 955–92–04 (Гэнік), 312–54–71 (Валя).

## ВЫСТАВЫ

### Наіўная алімпіяда

**З 20 да 30 чэрвеня ў арт-галерэі «Падземка» (пр.Незалежнасьці, 43)** працуе выстава беларускай мастачкі Ані Коўшар, якая прапанавала сваю вэрсію алімпіяды без спаборніцтваў, перамог і паразаў.

### COLORFEST

**Да 1 жніўня ў трох галерэях Нацыянальнай бібліятэкі** працуе Менская міжнародная біенале сучаснага жывапісу COLORFEST. Удзел бяруць мастакі з Італіі, Нямеччыны, Арменіі, Сэрбіі, Украіны, Беларусі, Польшчы, Латвіі і Літвы.

### Дзіцячы малюнак

**У Музэі гісторыі і культуры Беларусі (вул.Маркса, 12) да 13 ліпеня** працуе выстава дзіцячага малюнку «З надзеяй у будучыню», прымеркаваная да Дня бежанцаў.

### Generation To Go

**У кавярні City Bar (вул.Куйбышава, 48) да 4 ліпеня** працуе выстава маладых фатографаў зь Беларусі, Расеі і Нямеччыны Generation To Go. Удзельнікі выставы прапануюць зірнуць на сьвет вачыма пакаленьня, на долю якога прыпаў распад Савецкага Саюзу альбо аб'яднаньне Нямеччыны. Уваход вольны

### Швэдзкія фотавыставы

**Да 29 чэрвеня ў галерэі «Сьвет фота» (вул.Прытыцкага, 10)** працуе выстава знакамітага швэдзкага фатографа Енца Ластхейна «Белае мора — чорнае мора», а **ў Музэі сучаснага мастацтва (пр.Незалежнасьці, 46) з 14 чэрвеня да 5 ліпеня** працуе выстава «Балянсуючы паміж Стакгольмам і Менскам».

### Юбілейныя выставы ў Палацы мастацтва

**У менскім Палацы мастацтваў (Казлова, 3) да 20 чэрвеня** працуе выстава «Родныя прасторы» беларускага графіка Мікалая Арасланава, прымеркаваная да 60-годзьдзя аўтара. **Тамсама да 29 чэрвеня** працуе пэрсанальная выстава Пятра Прохарава «Маякоўскага, 154».

## КАНЦЭРТЫ

### ZigZag у «Добрых мысьлях»

**22 чэрвеня а 19-й гадзіне ў кавярні «Добрыя мысьлі» (вул. Магілёўская, 12)** — вялікі канцэрт і прэзэнтацыя кліпаў **ZigZag**. Адмысловы госьць — **Volk**. Квіткі: 10 000 — 12 000. Т.: (029) 601–07–69

### R'n'B на «Дынама»

**27 чэрвеня на менскім стадыёне «Дынама»** — фэстываль «RED — Красныя ў удары». Возьмуць удзел **Mattafix** (Ангельшчына), R'n'B-лэдзі **Б'янка**, **Дэльфін** (Расея) і **«Бумбокс»** (Украіна).

### Global Gathering

**3 ліпеня** — фэстываль электроннай музыкі GLOBAL GATHERING **на аэрадроме «Баравая».** Чакаюцца выступы ды-джэяў з Швэцыі, Вялікай Брытаніі, Нямеччыны, Расеі. **Пачатак а 18-й.** Сайт фэсту: global-gathering.com. Квіткі: 35 000 —75 000. Т.: (029) 640-61-06, (029) 340–51–06

### Джаз: Байба Скурстэне

**25 чэрвеня а 19-й у ДК Прафсаюзаў «Джаз-клюб Яўгена Ўладзімірава»** пры падтрымцы пасольства Літоўскай Рэспублікі прадстаўляе першую лэдзі балтыйскага джазу Байбу Скурстэне. Т.: 293–79–77, (029) 616–30–60, (029) 755–10–50.

## ІМПРЭЗЫ

### Сьвята паэзіі

**21 чэрвеня менскі парк Dreamland (вул. Арлоўская, 80) з 14-й да 18-й** ладзіць «Сьвята паэзіі» з удзелам паэтаў: Анатоля Вярцінскага, Васіля Жуковіча, Сяргея Законьнікава, Міхася Скоблы, Галіны Дубянецкай, Алеся Пашкевіча, Аксаны Спрынчан, Сержука Сыса, Вікі Трэнас, Зьміцера Вішнёва, Арцёма Кавалеўскага, Валерыі Куставай. З удзелам бардаў: Сержука Мінскевіча, Юрыя Несьцярэнкі, Яраша Малішэўскага, Паўла Кузіча. Квіткі — 2 тыс. руб. длядарослых, 1 100 для падлеткаў да 1,4 метра, дзецям да 1 м — вольны ўваход.

## ТЭАТРЫ

### Купалаўскі тэатар

**20 (пт)** — «Дзіўная місіс Сэвідж»
**21 (сб), 22 (ндз), 25 (ср), 4 (пт), 5 (сб)** — «Чорная панна Нясьвіжу»
**23 (пн)** — «Таполевая завея»
**26 (чц), 11 (пт)** — «КІМ»
**27 (пт)** — «Я не пакіну цябе»
**28 (сб)** — «Памінальная малітва»
**29 (ндз)** — «Маэстра»
**30 (пн), 2 (ср)** — «Сны аб Беларусі»
**6 (ндз)** — «Сымон-музыка»
**7 (пн)** — «Паўлінка»
**9 (ср), 10 (чц)** — «Пінская шляхта»
**13 (ндз)** — «Ідылія»

*ранішія спэктаклі*

**21 (сб)** — «Баляда пра каханьне»
**22 (ндз)** — «Востраў Сахалін»
**23 (пн)** — «Дзікае паляваньне караля Стаха»

*малая сцэна*

**6 (ндз)** — «Беларусь у фантастычных апавяданьнях»
**7 (пн)** — «Баляда пра каханьне»

### Тэатар беларускай драматургіі

**23 (пн)** — «Ігвіта, альбо Як гэта рабілі ў Францыі»
**24 (аўт)** — «Ах, гэтыя свабодныя бабачкі!»
**25 (ср)** — «Кабала сьвятош (Мальер)»
**26 (чц), 1 (аўт)** — «Містэр розыгрыш»
**30 (пн)** — «Неба ў дыямэнтах»
**7 (пн)** — «Сталіца Эраўнд»
**8 (аўт)** — «Іванаў»
**9 (ср)** — «Белы анёл з чорнымі крыламі»
**10 (чц)** — «Жан і Бэатрыса»
**11 (пт)** — «Адэль»

## «4х4»

# Цікавосткі кінафармату «4х4»

Найбольш вартай увагі падаецца карціна Кенэта Браны **«Сьледчы»** (Sleuth).

Аўтар дэтэктыўных раманаў запрашае ў госьці палюбоўніка сваёй жонкі. Калі малады госьць зьяўляецца, гаспадар прапануе яму рызыкоўную гульню…

Фільм Кенэта Браны — паўтор карціны 1972 г. «Гульня ўсьляпую». У колішняй стужцы сыгралі Лоўрэнс Аліўе і Майкл Кейн. Цяпер Майкл Кейн таксама ўдзельнічае ў праекце, але гэтым разам у ролі старога пісьменьніка. Ягоны партнёр — Джуд Лоў. Рэжысёрскі талент Браны й годны акторскі дуэт абяцаюць добрае відовішча.

Другая прынада кінафармату — карціна Кім Кі Дука **«Ўздых» (Soom).**

Хатняя гаспадыня, якой здраджвае муж, заводзіць раман зь вязьнем-суіцыднікам…

Кім Кі Дук — сучасны карэйскі кінаклясык, але ня кожны яго фільм можна лічыць шэдэўрам; да таго ж азіяцкая кінаэстэтыка дапускае жорсткасьць і шок.

Зь вялікаю доляй пэўнасьці можна сказаць, што гэты шок будзе ў стужцы Шыны Цукамоты **«Кашмарны дэтэктыў» (Akumu Tantei).** Фільм абыгрывае папулярную тэму злавесных тэлефонных званкоў — і абапіраецца на традыцыі сучасных японскіх жудасьцікаў. Творчасьць гэтага «японскага Дэвіда Лінча» вартая ўвагі, хаця й разьлічаная на сваю адданую аўдыторыю.

Нарэшце, брытанская карціна **«Кантроль»** Антона Карбэйна распавядае пра апошнія гады жыцьця Яна Кёрціса, лідэра ангельскага постпанкаўскага гурту Joy Division.

Усе стужкі дэманструюцца з 19 па 22 чэрвеня ў кінатэатрах «Мір», «Аўрора», «Перамога», «Цэнтральны».

**Андрэй Расінскі**




### Паездка ў Бычкі

Арганізуецца паездка зь Менску ў родную вёску Васіля Быкава Бычкі (Вушацкі раён). Выезд апоўдні 19 чэрвеня (чацьвер), вяртаньне ўвечары. Запіс на паездку праз т.: (029) 709–76–06 (Саша).

**КАЛІ Б...**

**...у супрацоўнікаў КДБ праца была сапраўды «пякельная».**



**Сталін:** Ніколі ня думаў, таварыш Адольф, што пакуты грэшнікаў у пекле заключаюцца ў тым, каб з ранку да вечара засоўваць і вымаць зь вядра дохлага пацука.

МАЛЮНАК І ТЭКСТ ЛЁЛІКА УШКІНА

ЛЕВЫМ ВОКАМ

# На апошнім дыханьні



Пасаж Юр'я Азаронка, якога выперлі з БТ, пра тое, што ён а) усё адно застанецца чалавекам прэзыдэнта і б) усё адно працягне здымаць фільмы, ня можа ня радаваць. У краіне зьявіўся новы кірунак незалежнага кіно. Фэльетон **Лёліка Ушкіна**.

**Вядоўца:** Вітаем Вас у студыі француcкага каналу Arte. Сёньня ў нас у гасьцях мэтры авангарднага кіно — Ларс фон Трыер і Жан-Люк Гадар. Тэма нашай размовы — фэномэн некамэрцыйнага малабюджэтнага кіно ў Беларусі, прадстаўленага творчасьцю вялікага рэжысёра Азаронка. Аднак спачатку — зашыбенная навіна. Толькі што выйшаў дэкрэт прэзыдэнта РБ аб паглыбленьні барацьбы за эканомію бюджэтных сродкаў. Адзін з пунктаў пастановы абавязвае ўсе беларускія каналы перайсьці на фармат незалежнага кіно. Так што застаецца толькі пазайздросьціць беларускаму гледачу. На жаль, мы, эўрапейцы, і надалей прырэчаныя глядзець усякую глямурную папсу — піратаў Карыбскага мора і індыянаў джонзаў. Пазьней мы паглядзім выпуск інфармацыйна-аналітычнай праграмы «Контуры» ў новым фармаце, а зараз спытаем гасьцей, што яны думаюць пра беларускі кінаавангард?

**Ларс фон Трыер:** Што сказаць? У некаторай ступені Азаронак працягвае маю школу «Догмы» (*у гэты момант на твары Гадара зьяўляецца грымаса зьдзіўленьня*): гэта, напрыклад, максымальны мінімалізм рэквізытаў і дэкарацый. Узгадайце хоць бы кадры фільму «Таемныя спружыны духоўнай вайны» пра лягеры тэрарыстаў з апазыцыі ва Ўкраіне. У фінале ў статычным кадры паўгадзіны тупа стаіць зэдлік. Прагледзеўшы карціну, я быў так уражаны, што хацеў проста ў кіназалі прагаласаваць за кандыдатаў Бацькі на парлямэнцкіх выбарах. Толькі мая школа валодае такімі прыёмамі!

**Жан-Люк Гадар:** Цю! Калі Азаронак — «Догма», то я Сьпілбэрг. Усякаму незалежнаму кіно ўласьцівы прымітывізм. Вы што, хацелі каб Азаронак рабіў ролікі пра сэмінары апазыцыі, як «Панарама»: на экране палітыкі душацца пайкай на банкеце? Азаронак жа апавядае пра сэмінары геніяльна проста: здымае сваю левую нагу. Які сымбалізм! Якая глыбіня! Відавочна, стужкі Азаронка — абсалютна лягічны працяг маёй «Новай хвалі». Эратызм — складнік нашай школы — так і прэ з карцінаў Азаронка.

**ЛфТ:** Дзе Вы там бачылі эратызм? У Азаронка ўсё адпавядае маёй схеме: ніякіх нерэальных забабонаў.

**ЖЛГ:** А сага пра чарговую элегантную перамогу? У фінале герой газэтай «Савецкая Беларусія» забівае на кухні таракана. Вы не зьвярнулі ўвагу, што «СБ» пры гэтым скручаная. Усё паводле Фройда: сэкс, любоў перамагаюць зло! Фактычна, Азаронак па-новаму прачытаў майго калегу Франсуа Труфо.

**ЛфТ:** Якая лухта! Можа, Вы яшчэ знайшлі ў працах Азаронка рэлятывізм, характэрны для вашых халтурак? Скажэце яшчэ, што гэта Вы натхнілі яго на геніяльны фільм пра амэрыканскі фонд, дзе паказваецца прыбыцьцё электрычкі Баранавічы—Менск. Гэта тыповая «Догма»!

**ЖЛГ:** «Хваля»!

**ЛфТ:** «Догма»! «Догма»! «Догма»! (*Б'е Гадара левай нагой*).

**Вядоўца:** Ну, досыць ужо. У нас на сувязі Менск, дзе зараз пачынаецца трансьляцыя праграмы «Контуры» ў фармаце незалежнага кіно. Глядзім на экран.

*На экране вядоўца праграмы «Контуры»*

**Вядоўца:** Такім чынам, як вы зразумелі зь пяціхвілінНай карцінкі пра цюбік з зубной пастай, краіна проста квітнее. А зараз пагаворым пра апазыцыйны канал «Белсат». Глядзіце матэрыял нашага карэспандэнта.

*На экране чалавек выразае сваё вока*

**ЛфТ**, **ЖЛГ**, **вядоўца** (*разам*): Геніяльна!



# А ты падпішыся!

**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,** проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Дэталі — **старонка 13.**

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Пецярбург.** Нядаўна аўтамабіль (воз, на каторым едуць бяз коней, як на машыне), выяжджаючы з аднэй вуліцы на другую, наехаў на звошчыка і абярнуў яго; на звошчыку ехалі два афіцэры-браты Каваленскія, сыны сэнатара, былшага галоўнага начальніка паліцыі. Тады афіцэр Каваленскі хацеў уздаць шофэру (фурману на аўтамабілі), але ён пусьціў у ход сваю машыну і ўцёк. Каваленскі выстраліў у яго ўдагонку. Работнік з фабрыкі сернікаў Міронаў зрабіў яму ўвагу. Кавленскаму гэта не спадабалася і ён выстраліў у Міронава, але трапіў у галаву звошчыку Іванову. Тады падышоў да Каваленскага студэнт Санін, кажучы, што ён ня мае права страляць. — «А табе што?!» — крыкнуў яму афіцэр, выстраліў у студэнта. Гарадавы Хімічоў падкраўся да Каваленскага ззаду, думаючы схапіць яго і адабраць рэвальвэр. Але той абярнуўся і прастрэліў Хімічову горла. Невядома, чым бы ўсё гэта скончылася, каб не падышоў старшы афіцэр і не прыказаў аддаць яму рэвальвэры. Каваленскіх арыштавалі. Іх будуць судзіць па такім законе, каторы не карае сьмерцю. А заўсягды асуджаюць другіх за гэта самае на сьмерць.

**«Наша Ніва». №23. 1908**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ЖЫТЛО

**Прадам** аднапакаёвую кватэру (цагляная хрушчоўка) па вул. Якуба Коласа ў Менску: 2-і паверх, тарцавая, да столі 2.68, вокны ў двор, балькону няма. Патрэбны рамонт. Т.: (029) 910–21–86, да 23.00

**Дзьве дзяўчыны** (доктар і перакладчыца з ангельскай і нямецкай) жадаюць здымаць жытло (адна- ці двухпакаёвую кватэру) на доўгі час у Менску. Разгледзім усе варыянты і прапановы. Тэлефануйце, калі ласка, (029) 733–25–30 (Кася), (029) 625–82–96 (Надзея)

### ПРАЦА

**Капітальны рамонт** энцыкляпэдый, слоўнікаў і падобных выданьняў. З рэстаўрацыяй або поўнай заменай пераплёту і залатым цісьненьнем. Т.: (029) 396–17–20

**Шукаю падпрацоўкі**, зьвязаныя зь беларускай мовай (кампутарны набор, пераклад, рэдагаваньне). Т.: (029) 198–32–51

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры, мове. Зьвяртацца загадзя. Т.: (029) 101–03–24. Юрась

**Якасны набор**, рэдагаваньне тэкстаў на беларускай мове. Зьвяртацца загадзя. Т.: (029) 101–03–24. Юрась

### КНІГІ

**Прапануем** «Незалежная прэса»: Быкаў, Барадулін, Бураўкін, Арлоў, Кіпель, Конан, Гарэцкі, Разанаў, Брыль, інш. «Гоман»: розныя выпускі, сотні аўтараў, у т.л. тэксты на тарашкевіцы, літаратурная вучоба. Дапаможам падрыхтаваць тэксты розных жанраў, пераклад, віншавальныя вершы, рэдактура, выданьні. Т.: (029) 753–91–96, alesknigi@mail.ru

**Шукаем кнігі**, матэрыялы па гісторыі: Сярэднявечча, ВАВ, Напалеонаўскі пэрыяд, Урбан «Старажытныя ліцьвіны». Т.: (029) 753–91–96

**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 18.06.2008.
Замова № 3251.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102–71.